Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СУБОТА

№ 119 (28735)

Энергія маладосці

Дарагія юнакі і дзяўчаты!

Сардэчна віншую вас з Днём моладзі.

Вы — новае пакаленне суверэннай дзяржавы, наследнікі гераічнага мінулага беларускага народа, які пераадолеў шматвяковы шлях да набыцця сваёй незалежнасці.

Права жыць на роднай зямлі, вучыцца, працаваць, марыць і будаваць планы на заўтрашні дзень — гэта велізарнае шчасце і вялікая адказнасць. Удасканальваючыся, імкнучыся да асабістага поспеху, помніце, што вашы лёсы звязаны разам і будуць упісаны ў новую гісторыю Беларусі.

Будзьце актыўныя, мэтанакіраваныя, ініцыятыўныя. Няхай энергія маладосці паслужыць крыніцай натхнення для вашых добрых пачынанняў, зробіць вас самадастатковымі, паспяховымі і шчаслівымі людзьмі.

Жадаю вам моцнага здароўя, добрага настрою і бадзёрасці духу.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ВЁСКА, ЧЫМ БУДЗЕШ ЖЫЦЬ?

Стратныя сельгаспрадпрыемствы — балючая тэма для эканомікі краіны. І добра, што цяпер яны не правіла, а ўсё часцей — выключэнне. У Беларусі дастаткова прыкладаў таго, як на малацэ і мясе, іх перапрацоўцы, можна стварыць прыбытковае прадпрыемства. Але, зноў жа такі, не ва ўсіх гэта атрымліваецца. Учора падчас рабочай паездкі Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Магілёўскую вобласць ішла размова акурат пра будучыню вёскі, жыццё селяніна ў ёй і... прыход інвестара ў сельскую гаспадарку.

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы прыгадаў час распаду СССР, калі перад краінай паўстала пытанне: што далей рабіць з вёскай, як яе развіваць? «Тады было прынята рашэнне: трэба брацца за вёску. Вёска — гэта аснова нашай славянскай дзяржаўнасці. Расіі, Украіны, Беларусі... Зараз я пераканаўся ў тым, што вёска — гэта аснова жыцця любой дзяржавы. І нам пашчасціла, што мы ў свой час узяліся за вёску. Тады прынялі рашэнне: па пяцігодках мадэрнізаваць сельскую гаспадарку, а фактычна — ратаваць, аднаўляць. Першыя пяць гадоў мы аднаўлялі, ратавалі. А далей трэба было рухацца наперад», — расказаў беларускі лідар.

У Беларускай ССР было каля 60 найбольш буйных сельгаспрадпрыемстваў, своеасаблівых «маякоў». Адным з іх быў у той час калгас імя Кірава, які знаходзіўся ў вёсках Малыя і Вялікія Славені, дзе зараз працуе аграхолдынг «Купалаўскае». Тады было вырашана тэрмінова ратаваць гэтыя шэсцьдзясят гаспадарак, і менавіта іх вывесці на новую аснову. У перспектыве яны павінны былі стаць прыкладам таго, як трэба развівацца і жыць вёсцы. За першую і другую пяцігодку ў сельскую гаспадарку было ўкладзена каля $40 млрд. Так, былі структурна перабудаваны гаспадаркі, і тады вырашана было ствараць і новыя вытворчасці, і аграгарадкі.

«У сацыялку аграгарадкоў мы ўклаліся. Мною былі зацверджаны сацыяльныя стандарты — пачынаючы ад вулічнага асвятлення і заканчваючы банкаўскімі паслугамі, гандлем, культурай. Не скажу, што паўсюль выдатна: дзе горш, дзе лепш. Але гэтыя стандарты — па медабслугоўванні, адукацыі, дзіцячых садках — выкананы. Мы стварылі аграгарадкі, але адсталі ў вытворчасці. Спачатку — малако і мяса, а пасля ўжо — сацыялка. Але паколькі гэтым дзяржава займалася, мы перш стварылі больш ці менш нармальныя ўмовы для людзей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па выніках першых пяцігодак сталі забяспечваць краіну прадуктамі харчавання. Да таго ж атрымалася не толькі задаволіць патрэбы ўнутранага рынку, але і пастаўляць прадукты на экспарт. Сума паставак даходзіла да $5 млрд. Паступова ствараліся аграгарадкі, хоць не кожнаму хапала грошай. Тады дапамога ішла і ад аблвыканкамаў, і з рэспубліканскага бюджэту, і ад прыватнікаў, якія бралі асобныя гаспадаркі на свае плечы — і ставілі на ногі. Сельгаспрадпрыемстваў, якія перайшлі ў паслясавецкі час да бізнесменаў, — каля 20 %.

Прайшло каля 15 гадоў, як была прынята праграма мадэрнізацыі вёскі, аграпрамысловага комплексу. І паўстала пытанне: а што далей? «Я не прыхільнік таго, каб прыватызаваць калгасы і саўгасы, але думаю, што на мяне сяляне не пакрыўдзяцца, калі я буду прымаць рашэнне аб прыватызацыі. Гэта значыць, прадаваць: пускаць прыватніка ў сельскую гаспадарку. Не пакрыўдзяцца таму, што дваццаць гадоў я вам даў час: вызначайцеся», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — І тут хто жадае працаваць на зямлі «без пана», скажам так, той мог паспрабаваць гэта зрабіць. А хто не — таго дзяржава на сваіх плячах не можа несці і не павінна», — падкрэсліваў кіраўнік дзяржавы.

«Таму мы не супраць таго, каб сюды прыйшоў прыватны капітал. Але пад жалезныя ўмовы. І мая жалезная ўмова, як чалавека вясковага, — каб тут не быў пакрыўджаны чалавек. Ён павінен прыходзіць на працу, тэхналагічна забяспечваць працэс, атрымліваць дастойную зарплату. Бачыце, я схіляю ўсю краіну, каб сярэдняя зарплата была ў тысячу рублёў. Я думаю, што ў будучым годзе перад губернатарамі будзе стаяць, бо яны перш за ўсё адказваюць за сяло, задача не 600, а 800 рублёў (сярэдняя зарплата ў сельскай гаспадарцы. — **Зв.**). А праз некалькі гадоў павінны да тысячы рублёў падысці і ў сельскай гаспадарцы», — сарыентаваў беларускі лідар. Пры гэтым ён падкрэсліў, што дастойную зарплату варта плаціць сапраўды эфектыўным і адказным супрацоўнікам. А ў найлепшых гаспадарках краіны такі сярэдні заробак ужо ёсць. А значыць, гэта дасяжная лічба.

СТАР. 2

МАЛАДЫЯ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аднакласнікі, сёлетнія выпускнікі 38-й мінскай школы.

ЦЫТАТА ДНЯ

Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі:

«Адна з галоўных задач устойлівага развіцця любой дзяржавы — павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва. Мы павінны стварыць умовы для развіцця грамадства, рэалізацыі патэнцыялу кожнага чалавека, пры гэтым мы павінны думаць не толькі пра сённяшні дзень, але і пра будучыя пакаленні.

У гэтым працэсе важна дзейнічаць разам, і ўнёсак кожнага грамадзяніна на сваім рабочым месцы вельмі важны, калі яго праца эфектыўная і ўносіць дастойны ўклад у развіццё працоўнага калектыву, канкрэтнага прадпрыемства альбо цэлай тэрыторыі».

■ Спажывец

НЕ ДАВЯРАЙЦЕ РАННІМ КАБАЧКАМ

Як правяраюць агародніну і садавіну, якая прадаецца на рынку

Дыетолагі раяць ужываць у дзень не менш як 500 грамаў агародніны, фруктаў і ягад. Але, набываючы сезонную прадукцыю, ці можна быць упэўненым, што вітамінаў і карысных элементаў у ёй больш, чым шкодных? Каб паглядзець, як правяраюцца чарніцы і памідоры, што трапляюць на прылавак, ідзём на Камароўскі рынак — у лабараторыю ветэрынарна-санітарнай экспертызы.

Без нітратаў — толькі з прабіркі

Лабараторыя працуе з сямі раніцы. Многія пастаўшчыкі прыязджаюць менавіта ў гэты час, каб да адкрыцця рынку паспець праверыць прадукцыю і прыгожа выкласці яе на прылаўкі.

За дзень на Камароўцы праводзіцца каля 300 экспертыз. З кожнай партыі ў залежнасці ад яе аб'ёму на пробу ідзе ад кілаграма агародніны, фруктаў, ягад.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Ветурач Таццяна ВАСЬКОЎЦАВА праводзіць дазіметрычны кантроль.

— Чаму столькі? Ёсць нормы адбору проб, устаноўленыя Дзяржстандартам, — тлумачыць **кіраўнік лабараторыі Кацярына ДУБІКОЎСКАЯ.**

СТАР. 3

■ Ідзіце ў навуку!

Цэнтр прыцягнення для таленавітай моладзі

Як пад патранажам славутых вучоных выхоўваецца інтэлектуальная эліта

Апошнім часам колькасць навуковых работнікаў у свеце павялічылася на 20 працэнтаў. Іх цяпер прыкладна восем мільёнаў — між іншым, гэта насельніцтва еўрапейскай дзяржавы сярэдніх памераў. Значная частка навуковых работнікаў сканцэнтравана ў краінах, якія перажываюць бурнае эканамічнае развіццё: напрыклад, кожны пяты навуковец — жыхар Паднябеснай... Пытанні падрыхтоўкі інтэлектуальнай эліты застаюцца актуальнымі для ўсіх краін. Пра тое, як выхоўваюць навуковую эліту ў Беларусі, нам расказаў рэктар Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Ігар ГАНЧАРОНАК.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

КАТАР ПЕРАТВОРАЦЬ У ВОСТРАЎ



З мэтай яшчэ больш узмацніць блакаду ў Саудаўскай Аравіі распрацавалі план па ператварэнні Катара ў востраў. Для гэтага, піша саудаўская прэса, плануецца пракапаць уздоўж 60-кіламетровай мяжы паміж дзвюма краінамі канал 200-метровай шырыні. Выданне Makkah, напрыклад, піша, што скончыўся конкурс на выкананне праекта, у якім удзельнічалі пяць буйных замежных кампаній, якія спецыялізуюцца на капанні каналаў. Пераможца будзе названы на працягу 90 дзён, пасля чаго і пачнуцца земляныя работы. Уласна ператварэнне Катара з паўвострава ў востраў плануецца ажыццявіць за год. Дарэчы, частку канальнай зоны, паведамляе выданне Al Riyadh, мяркуецца адвесці пад захоўванне ядзерных адходаў. Інтэрнэт-выданне Sabq таксама паведамляе, што кошт праекта ацэньваецца ў 2,8 млрд рыялаў (750 млн долараў).

АСТАНКІ ФРАНКА ВЫНЕСУЦЬ З МЕМАРЫЯЛА ЯГО АХВЯРАМ

Іспанскі ўрад сацыялістаў вырашыў эксгумаваць астанкі Франсіска Франка і вынесці іх з маўзалея ў Даліне Загінулых. Пра гэта паведамляе The Local. На думку сацыялістаў, мемарыял павінен стаць «месцам прымірэння» для краіны, якая ўсё яшчэ апраўляецца ад свайго фашысцкага мінулага. «Канкрэтнай даты пакуль няма, але мы зробім гэта вельмі хутка», — растлумачыў прэм'ер-міністр краіны Педра Санчэс. — Іспанія не можа дапусціць існавання сімвалаў, якія падзяляюць грамадзян краіны. Такія помнікі немагчымыя ў Германіі ці Італіі, у нашай краіне іх таксама быць не павінна». Перанос астанкаў Франка — даўні прадмет спрэчак у іспанскім грамадстве. Сацыялісты выступалі за перанос яшчэ ў 2013 годзе. Тады, паводле сацапытанняў, «за» выступіла больш за палову грамадзян краіны, аднак ініцыятыва так і не была рэалізаваная.

ІТАЛІЯ НА СУСТРЭЧЫ Ў БРУСЕЛІ ПРАДСТАВІЦЬ СВОЙ ПЛАН ПА МІГРАЦЫІ

Італія ў нядзелю выступіць з уласнай прапановай на сустрэчы па пытаннях міграцыі ў Бруселі, заявіў віцэ-прэм'ер і кіраўнік МУС краіны Матэа Сальвіні. «Праблема заключаецца ў тым, каб не сварыцца дзяржавам ЕС паміж сабой, а выкарыстоўваць грошы і людзей для абароны еўрапейскіх межаў. Гэтак жа, як робіцца на мяжы на Балканах, гэта трэба рабіць на міжземнаморскай мяжы», — заявіў Сальвіні журналістам пасля сустрэчы з членамі яго партыі «Ліга» ў верхняй палаце італьянскага парламента. Ён растлумачыў, што чатырма асноўнымі пунктамі прапановы стануць умацаванне Еўрапейскага агенцтва па кантролі межаў Frontex, стварэнне «дарожнай карты» для заключэння пагадненняў з паўночнаафрыканскімі краінамі для зніжэння «міграцыйнага ціску», стварэнне сістэмы па прыёме мігрантаў і паскарэнне працэдур выправаджэння нелегалаў у краіны іх паходжання. Як вядома, раней кіраўнік Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер заявіў, што склікае неафіцыйную рабочую сустрэчу па міграцыі ў Бруселі з удзелам некалькіх краін для пошуку рашэнняў напярэдадні саміту ЕС. Паводле інфармацыі італьянскіх СМІ, у ёй прымуць удзел Францыя, Германія, Італія, Іспанія, Грэцыя, Балгарыя і Аўстрыя.

КОРАТКА

- Пастановай Савета Міністраў ад 20 чэрвеня 2018 года № 465 павялічаны аб'ёмы крэдытавання жыллёвага будаўніцтва.
- **Рассельгаснагляд адмяніў забарону на пастаўкі беларускай малочнай прадукцыі ў тары больш за 2,5 л і зацвердзіў пералік пастаўшчыкоў.**

- Беларускія навукоўцы распрацавалі тэхналогію лячэння парадантозу ствалавымі клеткамі.
- **Дзяржаўтаінспекцыя краіны ў наступныя выхадныя дні будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме.**
- Мінск прыме чэмпіянат Еўропы па фехтаванні ў 2020 годзе.

■ Анталогія ашуканства

Мы працягваем знаёміць чытачоў з прыкладамі махлярства і дзелімся парадамі, як не стаць яго ахвярай. На гэты раз звяртаемся да далікатнай тэмы — мастацтва. Нашы суразмоўнікі — музейныя супрацоўнікі, мастакі, гісторыкі. Спадзяёмся, што іх падказкі засцерагуць аматараў рэдкасцяў ад непрадуманых дзеянняў.

АСЦЯРОЖНА: ПАДРОБКА!

Магілёў — горад з даўнімі традыцыямі, дзе ведаюць кошт сапраўдным рэчам. Менавіта тут пэўны час захоўваліся найвялікшыя багацці зямлі беларускай — крыж Ефрасінні Полацкай, троннае крэсла Кацярыны II і шмат чаго іншага не менш каштоўнага. На жаль, усё гэта знікла ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны пры спробе эвакуацыі з Магілёва. Перыядычна прасторы бударажаць чуткі, што зніклыя скарбы дзесьці з'явіліся. Але хутка высвятляецца, што тое было проста падробкай. Фальшыўкі — наогул частка нашага жыцця. Ад іх не застрахаваны ні дасведчаныя калекцыянеры, ні нават музеі. Што тут казаць пра тых, хто толькі пачынае збіраць сваю калекцыю.

Загадкавы Ван Гог

Аднойчы ў інтэрнэце на вочы трапілі ўспаміны вядомага рускага жывапісца і мастацтвазнаўца Ігара Грабара наконт выстаўкі Ван Гога ў Берліне: «Перад арганізацыяй выстаўкі Юсці папрасіў мяне зайсці да яго ў кабінет, дзе паказаў каля 15 карцін Ван Гога, просячы выказаць пра іх маё меркаванне. Я знайшоў іх усе да адной падробленымі».

У музеі гісторыі Магілёва расказалі яшчэ пра адзін выпадак з творамі Ван Гога. Музею прапанавалі набыць карціну гэтага аўтара. У тым, што гэта не падробка, павінна было пераканаць заключэнне экспертаў з Нацыянальнага мастацкага музея. Але там ніхто не сцвярджаў са стапрацэнтнай упэўненасцю, што гэта арыгінал. Бо ў калекцыі музея арыгінальных карцін Ван Гога не мелася наогул. У Магілёве не сталі рызыкаваць, бо сёння арт-рынак, па ацэнках некаторых спецыялістаў, на 60 % запоўнены падробкамі.

З найбольш распаўсюджаных фальшывых артэфактаў дырэктару музея Аляксею Бацюкову прыходзілася сустракацца з прадметамі зброі і ваеннай атрыбутыкай. Зараз шмат хто займаецца рэканструкцыяй часоў Сярэднявечча і Вялікай Айчыннай вайны, таму на рынак антыкварыяту рэчаў пад выглядам арыгінала трапляе частка якасна зробленых дублікатаў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ВЁСКА, ЧЫМ БУДЗЕШ ЖЫЦЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падчас рабочай паездкі кіраўнік дзяржавы наведаў арганізацыі, якія ўваходзяць у аграхолдынг «Купалаўскае», а затым правёў нараду ў Шклоўскім раёне, на тэрыторыі якога размешчана сельгаспрадпрыемства. Аляксандра Лукашэнку перш за ўсё цікавілі праблемы, з якімі сутыкаецца аграхолдынг і раён у прыватнасці, а таксама вобласць у цэлым. На думку **памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці Генадзя ЛАЎРАНКОВА,** адна з ключавых праблем — несуаднясенне рэальных эканамічных вынікаў сельгаспрадпрыемстваў і выплачаных зарплат. Калі б заробак напрамую залежаў ад эфектыўнасці работы, то не было б такіх праблем, як нізкі ўзровень адказнасці, дэфіцыт кадраў і спецыялістаў. «Трэба не толькі атрымаць, але і прадаць высакаякасную прадукцыю. Гэта патрабуе змены свядомасці спецыялістаў. Трэба паказаць, што можна і трэба зарабляць грошы. Тады вымалюецца і тэхналогія, і ўсё астатняе. Над кожным не паставіш наглядчыка, каб усе рабілі па тэхналогіі», — не паспрачаешся з памочнікам Прэзідэнта. Але для таго каб выбудаваць сістэму эканамічных узаемаадносін у гаспадарцы, як гэта не дзіўна, патрэбны менавіта псіхалагічныя змены.

У адказ Прэзідэнт падкрэсліў, што тэхналогія — гэта дыктатура. За выкананне тэхналогіі ў выніку і плацяць зарплату, а не даюць яе наперад. «За парушэнне тэхналогіі ў асобных краінах у турму садзяць. Я ўжо не кажу пра тое, што ўласнік прадпрыемства не будзе трымаць гэтага чалавека ні аднаго дня. Мы не ў савецкія часы жывём, калі збіраліся на пленуме і адзін аднаго ўгаворвалі... Цяпер па-іншаму ва ўсім свеце. Але ўсё павінна быць справядліва. Чалавека нельга прыніжаць і караць ні за што. Праўда, у нас кіраўнікі не ўсе гэта разумеюць. Караць трэба за справу — дрэнную працу, невыкананне тэхналогій, не дай бог, супрацьпраўныя дзеянні. Павінна быць жалезная дысцыпліна», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Падчас нарады таксама абмяркоўваліся стан і будучыня аграхолдынга «Купалаўскае», эканамічная сітуацыя ў Шклоўскім раёне і асобна — у Магілёўскай вобласці. Таксама гаворка ішла і пра кадравую палітыку ў гаспадарках, якасць выпрабляемага малака, жыллё для супрацоўнікаў сельгаспрадпрыемстваў, стварэнне замкнёных цыклаў вытворчасці мяса-малочнай прадукцыі.

Вераніка ПУСТАВІТ,
а/г Малыя Славені, Шклоўскі раён, Магілёўская вобласць.

НОВЫ «АЗОТ», НАСТУПСТВЫ СПЁКІ І ІНФРАСТРУКТУРА

Фота БелТА.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ адказаў на пытанні журналістаў падчас прэс-канферэнцыі для рэгіянальных і рэспубліканскіх СМІ.

Куды ідзе прадукцыя?

Уладзімір Краўцоў адзначыў, што эканоміка рэгіёна развіваецца з паскарэннем. Сёлета атрымалася значна дадаць па многіх накірунках — ад інвестыцый да экспарту. Ужо цяпер можна казаць аб тым, што за першае паўгоддзе чакаецца павелічэнне экспарту на 17,6 % (пры заданні 4,1 %), у 2,5 раза ўзрасце экспарт паслуг.

— Гэта сведчыць аб тым, што ўсё, што вырабляецца ў рэгіёне, прадаецца, — падкрэсліў губернатар, — пры гэтым ідзе асваенне новых рынкаў.

Калі раней да 97 % малочнай і мясной прадукцыі адпраўлялі ў Расійскую Федэрацыю, зараз гэты паказчык складае 85 %. Беларускія вытворцы асвойваюць новыя рынкі ўсходніх краін і Еўрасаюза.

Ці будзем з кармамі?

Сапраўды, гэта важнае пытанне ў сувязі са складаным надвор'ем. Пры тым, што жывёлагадоўчы статак даволі значны — больш за 600 тысяч свіней, столькі ж буйной рагатай жывёлы, значная колькасць птушкі. Прадукцыя запатрабавана, і скарачаць статак не плануецца ні пры якіх абставінах. Разам з тым дэфіцыт вільгаці ўнёс пэўныя карэктывы ў работу АПК.

— Сітуацыя складаная, але не катастрафічная. Усе пасевы, якія скосім на зернесянаж, будуць аператыўна заараны і засеяны кармавымі культурамі, такімі як проса, рэдзька і іншыя, — адзначыў Уладзімір Краўцоў.

Ёсць верагоднасць, што не падвядзе кукуруза. Гэта культура добра расце, паўсюдна зроблена падкормка.

У вобласці плануецца пачаць уборку на два тыдні раней, чым звычайна. На ўборку рапсу выйдуць у пачатку ліпеня, на чарзе і азімы ячмень.

Калі пабудуюць новы «Азот»?

Заданне пабудаваць новы комплекс ААТ «Грода Азот» пастаўлена даўно, — паведаміў кіраўнік аблвыканкама. Завод — свайго роду брэнд вобласці, валаўтваральнае прадпрыемства, якое дае 6 % валавога рэгіянальнага прадукту. А гэта 20 % прамысловага аб'ёму вобласці і 35 % — абласнога цэнтра. Завод забяспечвае працай больш за 9 тысяч чалавек.

Вядома, тут вядзецца ўкараненне новых тэхналогій і новай прадукцыі, напрыклад, сёлета ўводзіцца цэх азотнай кіслаты. Але значны рывок зрабіць складана, як-ніяк прадпрыемству 50 гадоў, і асноўныя магутнасці таксама выкарыстоўваюцца яшчэ з тых часоў. Разам з тым, відавочна, што вытворчасць адстае ад сучасных патрабаванняў, неабходна сур'ёзная мадэрнізацыя.

— Пляцоўка пад новую вытворчасць падабрана, — расказаў Уладзімір Краўцоў, — яна прымыкае да існуючага комплексу, яе плошча 58 га, што напалову менш, чым пляцоўка, дзе месціцца цяперашні Азот. А вось аб'ем вытворчасці ўдвоіцца.

Новая вытворчасць будзе сучаснага сусветнага ўзроўню. Згодна з прагнозам, экспарт вырасце на 14 %, будзе створана 660 рабочых месцаў. Пры гэтым «стары» завод таксама будзе працаваць і працягваць мадэрнізацыю.

Што дасць бязвізавы рэжым з Кітаем?

Кітайскі вектар апошнім часам актывізаваўся. Гродзенцы найбольш актыўна супрацоўнічаюць з правінцыяй Ганьсу, якая стала партнёрам рэгіёна ў шэрагу праектаў. Напрыклад, каля 600 тысяч долараў інвеставана ў стварэнне цэнтра кітайскай медыцыны. На сродкі ўсходніх інвестараў вядзецца рэканструкцыя гасцініцы «Гродна» ў абласным цэнтры.

— Наш рэгіён цікавы кітайскім бізнесменам у якасці транзітнага калідора на поўнач, у краіны Балтыкі і Еўропы, — адзначыў Уладзімір Краўцоў. Складзена папярэдняя дамова аб стварэнні лагістычнага цэнтра ў пункце пропуску «Брузгі». У Дзятлаўскім раёне імі куплены магутнасці па перапрацоўцы драўніны. Таксама мы бачым цікавасць кітайскіх дзелавых колаў да аграпрамысловага комплексу.

Сярод сумесных праектаў — стварэнне гандлёва-выставачых цэнтраў. Гродзенцы змогуць адкрыць такі цэнтр у сталіцы правінцыі Ганьсу, а кітайцы — у Гродне. Адпаведныя плошчы ўжо падабраны.

Уладзімір Краўцоў падкрэсліў, што стаіць задача выйсці на кітайскі рынак з гродзенскай «малочкай». Для гэтага прайшлі адпаведную сертыфікацыю чатыры малочныя прадпрыемствы. Запатрабаваны ў Кітаі аптычная прадукцыя, ільняныя вырабы, прадукцыя дрэваапрацоўкі. Што датычыцца кітайскіх турыстаў, гродзенцы гэтаму будуць толькі спрыяць, зазначыў губернатар.

Ці ўсе масты на Гродзеншчыне бяспечныя?

Сапраўды, тэма зараз на слыху, бо ў краіне ёсць выпадкі абрушэння гэтых важных аб'ектаў, нават пасля ўзвядзення. На Гродзеншыне будуецца нямала мастоў. Некалькі дзясяткаў узводзіцца толькі на будаўніцтве трасы М6. Вядзецца сур'ёзны рамонт ужо існуючых збудаванняў.

Дарэчы, галоўная дарожная магістраль будзе адкрыта да канца года. Работы вядуцца па графіку. Поўнасцю яны завершацца ў чэрвені будучага года. На гэты год запланавана адрамантаваць 220 кіламетраў мясцовых дарог, на якіх таксама ёсць масты.

— Усе масты ў вобласці праходзяць экспертызу, як на рэспубліканскіх дарогах, так і мясцовых, але нагоды для хваляванняў няма, — паведаміў Уладзімір Краўцоў.

Ці ёсць гістарычныя помнікі, якія патрабуюць неадкладнай увагі?

Як адзначыў старшыня аблвыканкама, Гродзенскі рэгіён славіцца сваімі замкамі і амаль усе аб'екты знаходзяцца ў стадыі рэстаўрацыі і кансервацыі па розных крыніцах фінансавання. Поўным ходам вядуцца работы ў Старым замку ў Гродне. Рэканструкцыя складаная, і ўвесь час ідуць спрэчкі гісторыкаў.

У Навагрудскім замку ёсць патрэба ва ўмацаванні схілаў. Працягваюцца работы ў Лідскім замку, палацава-паркавым комплексе «Свяцк», сядзібах у вёсках Падароск і Краскі Ваўкавыскага раёна. Сёлета з фонду Прэзідэнта выдзелена 1,1 млн рублёў на кансервацыю Гальшанскага і Крэўскага замкаў.

Ёсць нераўнадушныя людзі і сярод звычайных грамадзян, якія дапамагаюць захаваць гістарычную спадчыну. Напрыклад, за кошт дабрачыннага фонду ідзе аднаўленне замка ў Любчы Навагрудскага раёна. Ёсць ініцыятыва па рэканструкцыі былой сядзібы Храбтовічаў у вёсцы Шчорсы Навагрудскага раён. Уладзімір Краўцоў запэўніў, што ўлады будуць падтрымліваць нераўнадушных людзей, якія дбаюць пра сваю гісторыю і стараюцца захаваць такія аб'екты для будучых пакаленняў.

Маргарыта УШКЕВІЧ

■ Знешняя палітыка

ПРЫЯРЫТЭТЫ ПАРТНЁРСТВА

У сталіцы 21—22 чэрвеня прайшоў дзясяты раўнд неформальных міністэрскіх дыялогаў краін — удзельніц ініцыятывы Еўрапейскага саюза «Усходняе партнёрства». Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі шляхі рэалізацыі 20-ці задач да 2020 года і фінансаванне адпаведных праектаў і праграм.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі міністры замежных спраў Беларусі, Азербайджана, Арменіі, намеснік міністра Грузіі, дзяржаўны сакратар Міністэрства замежных спраў і еўрапейскай інтэграцыі Малдовы і пасол Украіны ў Беларусі. Бок Еўрасаюза прадстаўлялі еўракамісар па еўрапейскай палітыцы суседства і перагаворах аб пашырэнні ЕС і намеснік Генеральнага сакратара Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў. **Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства Уладзімір Макей** і **еўракамісар Ёханес Хан** правялі прэс-канферэнцыю па выніках перагавораў.

Уладзімір Макей адзначыў, што «Усходняму партнёрству» належыць развівацца ў неканфрантацыйным ключы: «Яно не павінна быць накіравана супраць інтарэсаў трэціх краін. Беларусь зацікаўлена ў выкарыстанні канструктыўнага патэнцыялу «Усходняга партнёрства» для пераадолення раздзяляльных ліній і аднаўлення даверу». Таксама міністр замежных спраў падкрэсліў, што беларускі бок выступае за прамы дыялог ЕС і ЕАЭС з перспектывай фарміравання стабільнай і квітнеючай агульнай эканамічнай прасторы

Міністр звярнуў увагу, што ўдзел нашай краіны ў гэтай ініцыятыве разглядаецца, як неад'емная частка агульнага супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам. У цэлым гандлёва-эканамічнае ўзаемадзеянне з Еўрапейскім саюзам змянілася ў станоўчы бок, і летась тавараабарот павялічыўся больш чым на 20 %. Па словах Уладзіміра Макея, значна палепшылася супрацоўніцтва з фінансавымі інстытутамі ЕС — Еўрапейскім інвестыцыйным банкам і Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця.

Ёханес Хан паведаміў, што да канца гэтага года плануецца падпісаць пагадненне аб прыярытэтах партнёрства Беларусі і Еўрасаюза. Яно, у прыватнасці, умацуе эканамічныя адносіны паміж партнёрамі.

Надзея АНІСОВІЧ

■ Тры пытанні да ўлады

У Стоўбцах з'явіцца помнік Якубу Коласу, а на дамах — тэматычныя кампазіцыі

Сёння Стоўбцы святкуюць сваё 425-годдзе. Чым жыве раён, якімі набыткамі сустракае свята? Пра гэта і іншае — гутарка са старшынёй райвыканкама Юрыем ГОРЛАВЫМ.

— Юрый Мікалаевіч, што адметнага адбылося ў раёне за апошнія гады?

— Стаўбцоўскі раён багаты прыроднымі рэсурсамі, зямлёй. Але самае галоўнае багацце — гэта людзі. Асабісты ўклад у развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі, сацыяльнай сферы, адукацыі, культуры, медыцыны літаральна кожнага працаўніка, кіраўніка, спецыяліста важкі, рэальна прыкметны.

У раёне працуюць 15 сельгасарганізацый, 25 сялянскіх фермерскіх гаспадарак і два прадпрыемствы па вытворчасці прадукцыі птушкагадоўлі. У 2017 годзе мы вырабілі каля сямі тысяч тон мяса, надаілі 91 тысячу тон малака. Гэта самы высокі паказчык за ўсю гісторыю раёна. І не будзем спыняцца на дасягнутым.

У раёне вырошчваюцца практычна ўсе віды сельскагаспадарчай прадукцыі, якая прадстаўлена ў нашай краіне.

Стаўбцоўскі філіял Мінскага маторнага завода рэалізуе праект па высокатрывалым, высокадакладным чыгунным ліцці блокаў цыліндраў. У 2018 годзе будзе здадзена першая чарга магутнасцю 18 тысяч тон ліцця.

Навасвержанскі лесазавод займаецца перапрацоўкай круглага лесу (піловачніка), 70 % якога рэалізуецца на экспарт — больш як у 10 краін свету. За апошнія гады завод істотна мадэрнізаваўся. Калі раней перапрацоўвалі каля 19 тысяч кубаметраў драўніны ў год, то цяпер набліжаюцца да 80 тысяч кубоў.

Фота Васіля ЗЯНЬКО.

Філіял Гарадзейскага цукровага камбіната вырабляе сокі, нектары. Інавацыйная прадукцыя тут — фруктова-ягадныя напаўняльнікі. Цяпер 64 % іх Беларусь завозіць з-за мяжы. На прадпрыемстве будуюцца новыя магутнасці для захоўвання сыравіны. З'яўляюцца і новыя прадпрыемствы. Сёлета ў СФГ «Сула» рэалізуецца маштабны праект па ўзвядзенні завода па перапрацоўцы бульбы. Плануем, што і нашы сельгасарганізацыі будуць вырошчваць і перапрацоўваць на гэтым абсталяванні «другі хлеб».

— Але, як кажуць, не хлебам адзіным жыве чалавек. Яму патрэбны і камфортныя ўмовы быту, і добрае медыцынскае абслугоўванне, і змястоўны адпачынак...

— У нас дынамічна развіваецца сацыяльная сфера. У прыватнасці, у горадзе ёсць паліклініка, бальніца, у сельскай мясцовасці — дзве ўчастковыя бальніцы, чатырнаццаць фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Па выніках работы за мінулы год раённая медыцынская ўстанова заняла першае месца ў вобласці і другое ў краіне.

Раней у Стоўбцах была сур'ёзная праблема з забеспячэннем месцамі ў дзіцячых садках. Але летась яна цалкам вырашана. І вось якім чынам. Справа ў тым, што тэмп росту валавой прадукцыі за 2015 год у раёне склаў 114,7 %. У выніку мы занялі другое месца сярод раёнаў Міншчыны. Паводле ўмоў спаборніцтва, з абласнога бюджэту нам выдзелілі на той час 150 млрд рублёў. У лідарах быў Лагойскі раён, які атрымаў 200 млрд рублёў. Разам са старшынёй Лагойскага райвыканкама Віктарам Міхайлавічам Калядой мы прапанавалі вярнуць па 50 млрд рублёў назад для таго, каб падтрымаць іншыя рэгіёны. Тую суму, што засталася, мы скарысталі на свае мэты. А менавіта, 50 млрд — на развіццё і мадэрнізацыю сельскай гаспадаркі і столькі ж — на будаўніцтва новай дзіцячай дашкольнай установы, якую ўвялі ў дзеянне ў 2017 годзе.

Якія яшчэ перамены чакаюць райцэнтр

Сёлета пры падтрымцы Мінаблвыканкама пачнём рэканструкцыю аднаго з будынкаў пад Цэнтр творчасці. Мяркую, гэта дазволіць выявіць і развіць больш талентаў.

Стаўбцоўшчына — радзіма Якуба Коласа. Таму справай гонару лічым да 2020 года ў цэнтры горада ўстанавіць помнік знакамітаму земляку, а на тарцах чатырох дзевяціпавярховых дамоў на вуліцы Цэнтральнай ужо малююцца тэматычныя кампазіцыі.

У наступным годзе пачнецца будаўніцтва гандлёва-забаўляльнага цэнтра з крамамі, боўлінгам, кіназалай. Гэта вельмі важна, паколькі ў райцэнтры няма кінатэатра.

— Сапраўды, Стоўбцы прыгажэюць з кожным годам, становяцца ўтульнымі, больш камфортнымі для жыцця. Юрый Мікалаевіч, а што з будаўніцтвам жылля?

— Кожны год мы здаём адзін-два пяціпавярховыя дамы для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Але галоўнае, што 85 % ад агульнага аб'ёму — індывідуальнае будаўніцтва. Гэта сведчыць пра тое, што ў людзей ёсць дастатак.

Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця нам даведзена заданне здаць 16 тысяч квадратных метраў, больш за палову ўжо выканалі. Сёлета плануем пачаць будаўніцтва яшчэ двух дамоў, рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Цэнтр прыцягнення...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Неабходнасць павышэння інвестыцыйнай прыцягальнасці і канкурэнтаздольнасці сёння відавочная для ўсіх. 50 працэнтаў усіх аспірантаў рыхтуюцца не ў Еўропе, а ў ЗША, Кітаі і Аўстраліі. У Старым Свеце адчулі, што трэба штосьці змяняць, каб скараціць адставанне ў інавацыйным развіцці ад сваіх асноўных канкурэнтаў і, нягледзячы на функцыянаванне на тэрыторыі Еўропы ўніверсітэтаў са шматвяковай гісторыяй і традыцыямі, у 2008 годзе стварылі новую ўстанову адукацыі ўніверсітэцкага тыпу — Еўрапейскі інстытут інавацый і тэхналогій. Яго галоўная задача — рыхтаваць вучоных для еўрапейскага рэгіёна. Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў створаны ў Кітайскай акадэміі грамадскіх навук. Цікавы досвед у Карэйскага інстытута навукі і тэхналогій...

У 2001 годзе Беларусь — адна з першых на прасторах СНД — адкрыла ў структуры Нацыянальнай акадэміі навук навучальную ўстанову новага тыпу — Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў (ІПНК).

— Ігар Іванавіч, а ў чым заключаецца ваша ўнікальнасць, бо інтэлектуальную эліту выхоўваюць і ў іншых установах вышэйшай адукацыі?

— Па-першае, у нас няма першай ступені. Бакалаўраў мы не рыхтуем. У Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў ёсць толькі магістратура, аспірантура і дактарантура. І мы адкрытыя абсалютна для ўсіх. Калі звычайна пры адборы ў магістратуру ўніверсітэты арыентуюцца галоўным чынам на сваіх выпускнікоў першай ступені і аддаюць перавагу ім, то паступіць у магістратуру да нас можа абсалютна кожны таленавіты і апантаны навукай малады чалавек з любога кутка краіны. Найбольшы прыток магістрантаў адбываецца з БДУ, дзе вельмі моцна прадстаўлена фундаментальная навука: матэматыка, фізіка, хімія, біялогія... Але ў нас ёсць таксама магістранты з Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта, Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта і іншых. Гэта значыць, што калі малады чалавек скончыў рэгіянальную ВНУ, яму не закрыты шлях у вялікую навуку. Ад яго патрабуюцца толькі веды і моцнае жаданне. А наша задача — прыцягнуць таленты з усёй краіны.

14 магістрантаў Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў першымі ў краіне атрымалі сертыфікаты адпаведнасці патрабаванням прафесійных стандартаў у нанаіндустрыі аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыі «Нанасертыфіка» (Масква).

Па-другое, мы сеткавы ўніверсітэт у поўным сэнсе гэтых слоў, таму што ў нас дзейнічае сеткавы механізм арганізацыі навучальнага працэсу. Мы ўпэўнены, што **вучонага можа выхаваць толькі вучоны. Таму да падрыхтоўкі магістрантаў прыцягваюцца масцітыя навукоўцы з Нацыянальнай акадэміі навук,** якія сёння робяць навуку: акадэмікі, члены-карэспандэнты, вядучыя навуковыя супрацоўнікі арганізацый.

Магістранты адразу пагружаюцца ў акадэмічнае навуковае асяроддзе, дзе генерыруюцца і ствараюцца новыя веды і інавацыйныя прадукты. Нацыянальная акадэмія навук — не толькі галоўная навуковая арганізацыя ў краіне, а магутная навукова-вытворчая карпарацыя, дзе дзейнічае вельмі шмат навукова-практычных цэнтраў і інавацыйных вытворчасцяў. Фарміраванне будучых вучоных адбываецца не ў вучэбных аўдыторыях, а так бы мовіць, на перадавой акадэмічнай навукі — у лабараторыях акадэмічных інстытутаў і навукова-практычных цэнтраў, на эксперыментальных пляцоўках, археалагічных раскопках.

Па-трэцяе, нас вылучае і магчымасць хутка ствараць новыя адукацыйныя прадукты або новыя магістарскія праграмы. У 2019 годзе будзе аб'яўлены набор на новую спецыяльнасць «адытыўныя тэхналогіі» (3D-друк), яна ўжо ўключана ў Агульнадзяржаўны класіфікатар. Аўтарамі адукацыйнага стандарту з'яўляюцца акадэмікі і вучоныя БДУ. Плануем таксама адкрыць спецыяльнасці «электронная ахова здароўя» і «біяразнастайнасць і ўстойлівае развіццё». Ад разважанняў пра ўстойлівае развіццё трэба пераходзіць да канкрэтных крокаў: нам патрабуюцца спецыялісты, якія ведаюць, што трэба рабіць сёння, каб прыродных рэсурсаў хапіла і для наступных пакаленняў. Ну а як можна ўявіць сабе сучасную медыцыну, тэлемедыцыну без лічбавых тэхналогій? Мы запрасілі эксперта з Паўднёвай Карэі па электроннай ахове здароўя, усё рабілася па дамоўленасці з пасольствам гэтай краіны на самым высокім узроўні. Ён дапаможа нам у фарміраванні магістарскай адукацыйнай праграмы, і гэта будзе першая падобная праграма не толькі на тэрыторыі СНД, а, магчыма, і ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.

Яшчэ задумаліся над адкрыццём спецыяльнасці «лічбавая эканоміка і штучны інтэлект».

— Ключавой для ўстанаўлення міжнародных стасункаў у навуковай сферы з'яўляецца англійская мова. Наколькі сур'ёзная ўвага ўдзяляецца гэтай дысцыпліне вашымі магістрантамі?

— Англійская мова патрабуецца не толькі для чытання прафесійнай літаратуры, але і для таго, каб прадстаўляць свае ідэі на міжнародных канферэнцыях, публікаваць вынікі даследаванняў у міжнародных навуковых часопісах. Вельмі важна, калі ты можаш пераканаць свайго партнёра на яго мове, а не чакаеш, як паветра, дапамогі ад перакладчыка: стасункі з калегамі павінны быць сам-насам. Зараз мы ўсе спецыяльнасці магістратуры пераводзім на англійскую мову. І лекцыі з наступнага года будзем чытаць на англійскай мове. Пасля таго, як набяром магістрантаў на першы год навучання, правядзём тэсціраванне, каб вызначыць узровень валодання імі англійскай мовай, і, у залежнасці ад гэтага, сфарміруем групы. Старшыня Прэзідыума НАН акадэмік Уладзімір Гусакоў адобрыў арганізацыю спецыяльных курсаў для магістрантаў па англійскай мове, каб з другога года навучання яны маглі ўжо належным чынам успрымаць лекцыі на англійскай. Робім гэта, у першую чаргу, для сваіх, хоць у ВНУ англамоўнае навучанне арыентавана пераважна на прыцягненне іншаземцаў. Мы знайшлі маладых вучоных, якія стажыраваліся за мяжой, тыя распрацавалі спецкурсы, якія і будуць чытацца нашым магістрантам.

— Вы згадалі Уладзіміра Гусакова. Старшыня Прэзідыума Акадэміі навук лічыць, што «вучоны — гэта эксклюзіўны тавар» і масавасць у навуцы не патрэбная. Ці падзяляеце вы яго думку?

— Абсалютна з ёй згодны. Ускарскацца на вяршыню можа не кожны. Толькі адзінкі могуць быць генератарамі ідэй, і ў навуку павінны прыходзіць асобы. Рыхтаваць эліту масава немагчыма, таму і наборы ў нас невялікія. Сёлета, напрыклад, мы збіраемся прыняць 120 чалавек на 9 спецыяльнасцяў: гэта «фізіка», «хімія», «біялогія», «сацыялогія», «прыкладная матэматыка і інфарматыка», «машынабудаванне і машыназнаўства», «мастацтвазнаўства», «эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай». У першую чаргу рыхтуем папаўненне для Нацыянальнай акадэміі навук. У гэтым годзе больш як 80 працэнтаў нашых магістрантаў былі размеркаваны менавіта ў структурныя падраздзяленні акадэміі: інстытуты, навукова-практычныя цэнтры і гэтак далей.

— Кажуць, што навуку робяць маладыя. Як вы лічыце, а якія фактары вызначаюць поспех?

— Можна сказаць трывіяльна — патрабуецца талент. Але яго наяўнасць яшчэ не гарантуе стапрацэнтнага поспеху. У навуцы вельмі важнае значэнне мае наяўнасць сур'ёзнай навуковай школы. Абавязкова павінен прысутнічаць інтарэс, трэба заразіцца вірусам навукі, бо калі табе не цікава займацца даследаваннямі, то нават ніякія замежныя паездкі і іншыя даброты не прывядуць да поспеху. Навукай трэба жыць паўсюдна (і дома, і ў водпуску, і на дачы). Проста прасядзець ад званка да званка тут не атрымаецца. Гэта напружаная штодзённая інтэлектуальная праца, якая патрабуе максімальнай канцэнтрацыі ўвагі і аднімае шмат часу. Навука не церпіць мітусні. Тут нельга разлічваць на імгненны эфект.

Насамрэч шмат адкрыццяў у сусветнай навуцы зроблена менавіта маладымі людзьмі. Я думаю, што ў маладых шчырае жаданне даследаваць, стваряць і адкрываць яшчэ «не сапсаванае» асяроддзем. А адсутнасць як жыццёвага, так і прафесійнага досведу, можа нават пайсці на карысць. Маладыя вучоныя не баяцца праяўляць ініцыятыву і рызыкаваць, але паступова гэта жаданне, на жаль, знікае. Ты спрабуеш пралічыць наперад усе магчымыя наступствы...

— А што б вы параілі маладым людзям, якія яшчэ вагаюцца, куды ім падацца: у навуку, на вытворчасць ці ў бізнес?

— Толькі навука стварае неабмежаваныя магчымасці для раскрыцця здольнасцяў і рэалізацыі сваіх ідэй. Калі ты жадаеш пражыць сваё жыццё вельмі яркa і насычана, то ідзі ў навуку. З іншага боку, навука фарміруе такія важныя якасці, якія дапамагаюць быць вельмі гібкім у жыцці. Ты ў любы момант можаш перакваліфікавацца і заняцца, напрыклад, бізнесам, а можаш спалучыць навуку і бізнес. Навука — такая цікавая сфера, дзе нават адмоўны вынік не лічыцца памылкай — ён заўсёды можа стаць падмуркам для чагосьці зусім новага. У вучоных у свеце тры галоўныя каштоўнасці — ісціна, прагрэсіўныя адкрыцці і адказнасць. Вучоны павінен быць адказным за тое, што ён робіць. Калі вы гатовы радзяліць гэтыя каштоўнасці, то мы вас чакаем...

Надзея НІКАЛАЕВА.

❍ БУДЗЬ У КУРСЕ!

Тэрміны прыёму ў магістратуру — з 27 чэрвеня да 5 ліпеня. Уступныя іспыты па спецыяльнасці — з 6 ліпеня да 12 ліпеня. Тэрміны залічэння (на бюджэтнае і платнае навучанне) — да 17 ліпеня.

Ноч у крэпасці

Жалобныя мерапрыемствы і маштабная рэканструкцыя падзей першых дзён вайны прайшлі ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

Каля крэпасці людзі пачалі збірацца а трэцяй гадзіне ночы. Па сімвалічнай дарозе памяці прайшлі дзясяткі маладых людзей з запаленымі лампадкамі. На экранах трансліравалася ваенная хроніка, іграла музыка 40-х гадоў. А палове чацвёртай пачалася лазерная пастаноўка, цішыню ўзарвалі залпы артылерыйскага агню. У гэты час на плошчы Цырыманіялаў ужо сабраліся тысячы людзей. «Па добрай традыцыі мы сустракаемся на світанні 22 чэрвеня, каб выказаць сваю пашану тым, хто праявіў мужнасць і гераізм у першыя гадзіны вайны», — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.**

На мерапрыемства ў крэпасці сабраліся не толькі брастаўчане. Паўтара дзясятка ўдзельнікаў афіцыйных дэлегацый з розных краін, шматлікія госці горада, турысты прыйшлі, каб аддаць даніну памяці абаронцам крэпасці. Усіх прысутных прывітаў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

Пасля мітынгу адбыўся ўрачысты марш войскаў Брэсцкага гарнізона, а ў пяць раніцы на Кобрынскім умацаванні пачалася маштабная рэканструкцыя падзей першых дзён вайны. Гледачы ўбачылі атаку Самвела Мацевасяна, абарону 9-й пагранзаставы пад камандаваннем Андрэя Кіжаватава, фрагменты баёў, здачу ў палон дзяцей і жонак каманднага складу. Легендарны маёр Гаўрылаў, як вядома, прыняў апошні бой на 32-і дзень вайны. Удзельнікі пастаноўкі паказалі момант захопу ў палон цяжка параненага Гаўрылава. Дарэчы, ваенныя рэканструктары з Татарстана напярэдадні перадалі ў Музей абароны Брэсцкай крэпасці зямлю з малой радзімы Героя Савецкага Саюза Пятра Гаўрылава, які згодна з яго апошняй воляй, пахаваны ў Брэсце.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Падрабязнасці

ШТО РОБЯЦЬ НА ВАЙСКОВЫХ МОГІЛКАХ?

У Мінску прыступілі да добраўпарадкавання Вайсковых могілак. Якія работы і навошта праводзяць на адным з найстарэйшых некропаляў сталіцы, расказалі спецыялісты.

Па словах **галоўнага архітэктара праектаў УП «Мінскпраект» Мікалая ДЗЯТКО,** рыхтуюцца матэрыялы па рэканструкцыі могілак, яны будуць накіраваныя ў камітэт архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, Міністэрства культуры, у спецкамбінат КБА, УКБ Савецкага раёна, якое выступіць заказчыкам па праекце.

«Мяркуецца частковая мемарыялізацыя ўсяго комплексу, замена агароджы і ўваходных варот. Каваныя рашоткі, уваходная група будуць мець дэкаратыўныя элементы (скульптуры, барэльефы) ваеннай тэматыкі. Таксама гаворка ідзе пра ўладкаванне дадатковых пешаходных дарожак», — цытуе БелТА Мікалая Дзятко.

На могілках знаходзяцца пахаванні як перыяду Руска-турэцкай вайны XIX стагоддзя, так і часоў Першай сусветнай, Вялікай Айчыннай войнаў. Тут знайшлі супакой многія дзеячы навукі, літаратуры, мастацтва, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы краіны, у тым ліку класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас.

«Усе гэтыя перыяды знайшлі адлюстраванне ў канцэпцыі рэканструкцыі могілак. Разлічваем устанавіць малыя архітэктурныя формы з тлумачэннямі па розных групах пахаванняў. Дадаткова з'явяцца праходы да магіл з боку вуліцы Міхайлава, мяркуецца пашырэнне існуючай дарожкі ад вуліцы Казлова да храма Аляксандра Неўскага, замена брукаванкі на гранітныя пліты, установка лавак, новых ліхтароў. Таксама прадугледжана арганізацыя падсвятлення храма, помнікаў салдату, Якубу Коласу і Янку Купалу, арганізацыя дадатковага ўвахода з боку вуліцы Чырваназорнай», — расцлумачыў Мікалай Дзятко.

Вялікая ўвага ўдзелена вызваленню тэрыторыі ад насаджэнняў, якія ўяўляюць небяспеку, уздоўж дарожак будуць высаджаны кусты і кветкі. «Пакуль мы вызначылі толькі вобразнае рашэнне. Патрабуецца ўзгадненне перадпраектных прапаноў з зацікаўленымі ведамствамі, перш за ўсё з Міністэрствам культуры», — сказаў Мікалай Дзятко.

У цяперашні час прынята рашэнне аб добраўпарадкаванні тэрыторыі. **Прадстаўнік храма Аляксандра Неўскага протаіерэй Дзімітрый ХАРОШКА** адзначыў, што да гэтага каля трох гадоў вялася падрыхтоўчая работа. На магілах была размешчана інфармацыя з просьбай да сваякоў прывесці ў парадак пахаванні. «Могілкі, без усякага сумнення, з'яўляюцца часткай гісторыі горада. Мы ўдзячныя дзяржаве, Мінгарвыканкаму, што звернута ўвага на гэтыя пахаванні. У свой час яшчэ сын Якуба Коласа Даніла звяртаў увагу на недагледжанасць могілак, на адсутнасць агароджы. Яшчэ тады біў трывогу, каб гэткае ўнікальнае месца захаваць для будучых пакаленняў», — адзначыў ён.

Пры гэтым Дзмітрый Харошка дадаў, што па пытаннях выканання работ ідзе пастаянны дыялог з работнікамі спецкамбіната, на абслугоўванні якога знаходзяцца пахаванні. «Работы вядуцца ў адпаведнасці з дазволам Міністэрства культуры. Да 60-годдзя Вялікай Перамогі некаторая частка Ваенных могілак ужо рэканструявана і рэстаўравана. Важна, каб мы памяталі мінулае. Унікальныя надмагільныя збудаванні, вядома, будуць захаваны. Некаторыя занепакоены, што зразаюцца агароджы. На жаль, яны ў большасці выпадкаў аварыйныя і ўяўляюць пагрозу для людзей», — падкрэсліў Дзімітрый Харошка.

Як адзначыў **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце спецкамбіната КБА Сяргей ТУР,** добраўпарадкаванне заключаецца ў дэмантажы старых надмагільных збудаванняў, старых агароджаў, крыжоў. Тры гады таму спецкамбінат КБА праводзіў інвентарызацыю, каб удакладніць пахаванні, за якімі няма каму даглядаць. На іх месцы ўсталююць знакі-падгалоўнікі адзінага ўзору. Калі на старым надмагіллі былі прозвішча, імя і імя па бацьку, яны будуць выгравіраваны на ідэнтыфікацыйным знаку.

«Па новым законе аб пахаванні і пахавальнай справе, які ўступіў у сілу з ліпеня 2015 года, спецыялізаваная арганізацыя пры неабходнасці, але не радзей за адзін раз на два гады, камісійна праводзіць інвентарызацыю месцаў пахавання, якія знаходзяцца на абслугоўванні. На Вайсковых могілках з амаль 8 тысяч пахаванняў 3 тысячы 882 аказаліся закінутымі. Мы ў першую чаргу звярталі ўвагу на надмагіллі, ступень разбурэння якіх выключае рамонт або аднаўленне», — расцлумачыў Сяргей Тур.

Супрацоўнікі камбіната, калі знаходзілі кантакты, папярэджвалі сваякоў па тэлефоне або па пошце аб неабходнасці прывесці ў парадак магілы.

«Праз два гады пасля пачатку інвентарызацыі, як запісана ў законе, спецарганізацыя мае права ўтылізаваць і дэмантаваць надмагільныя збудаванні, добраўпарадкаваць месца пахавання. За гэты час мы ўзгаднілі праект ідэнтыфікацыйнага знака, які павінен усталёўвацца на месца пахавання. Ён узгоднены з міністэрствамі культуры, архітэктуры і будаўніцтва , Мінгарвыканкамам. Сёлета прынята рашэнне аб добраўпарадкаванні тэрыторыі, яе пачалі з 4 чэрвеня», — сказаў ён.

Работа будзе праводзіцца да канца года. Таксама камісія, у склад якой уключаны прадстаўнікі адміністрацыі Савецкага раёна, Мінгарвыканкама, праверыла стан зялёных насаджэнняў. Дрэвы, якія знаходзяцца ў аварыйным стане, выдаленыя ■

НЕ ДАВЯРАЙЦЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадукцыю, вырашчаную на ўчастку, абавязкова правяраюць на нітраты. Пры нас якраз вывучалі партыю агуркоў. Спачатку іх здрабняюць у блэндары: гэта неабходна, каб атрымаць больш дакладныя паказанні. З атрыманай «салаты» робяць адначасова дзве пробы. У празрыстыя шкляначкі накладаюць па 10 грамаў надзёртых агуркоў і заліваюць спецыяльным растворам. Потым у сумесь закідваюць магніт і ставяць ёмістасць на мяшалку на тры хвіліны. Пасля мераюць колькасць нітратаў. Прыбор паказвае 158 і 152 мг/кг. Гэта ў межах нормы: для агуркоў, вырашчаных у абароненым грунце, дапушчальным максімумам лічыцца 400 мг/кг. У бульбе нітратаў павінна быць не больш за 200 мг/кг, у цяплічных памідорах — да 300, у салаце, пятрушцы, сельдэрэі — да 2000. Больш за ўсіх солі азотнай кіслаты назапашвае салата латук.

Агуркі, узятыя на пробу, здрабняюць у блэндары.

— Мы працуем на праверанным абсталяванні. Што датычыцца дамашніх прыбораў, яны недакладныя і ў нашай рабоце не дапускаюцца, — заўважае Кацярына Дубікоўская на маё пытанне пра кампактныя нітратамеры, якія можна знайсці ў крамах.

За два дні зафіксавалі сем выпадкаў перавышэння колькасці нітратаў. Усе яны былі звязаны з кабачкамі.

— Шмат нітратаў часцей сустракаецца ў ранняй агародніне — бульбе, капусце, агурках, зеляніне, — засцерагае кіраўнік лабараторыі, але дадае, што цяперашнюю бульбу ўжо можна спакойна набываць. — Прадукцыя зусім без нітратаў да нас яшчэ не трапляла. Усё роўна ж падкормкі ўносяцца. Да таго ж солі азотнай кіслаты змяшчаюцца ў глебе. Таму хоць мінімум, але ў агародніне ён будзе. Абсалютна чыстыя агуркі можна атрымаць хіба што ў тым выпадку, калі вырасціць іх у прабірцы.

Калі грыбы «фаняць»

Усе дары лесу, якія прыносяць на рынак, правяраюць на радыёнукліды, а менавіта на цэзій-137. Як бы зборшчыку ні было шкада сваёй працы, але паўлітра ягад і грыбоў давядзецца аддаць у лабараторыю. Пасля даследавання гэтыя паўлітра не вяртаюць: па-першае, проба апрамяняецца, па-другое, прымятая прадукцыя ўсё роўна страчвае таварны выгляд.

Прадаўцы, якія нясуць ягады на пробу, кажуць, што пакуль у лясах ураджай небагаты. «Засуха, — уздыхае жанчына са Смаргонскага раёна. — У нас з пачатку лета не было нармальных дажджоў. Паглядзіце, якія чарніцы дробныя. А вось у Мінскай вобласці дажджы прайшлі і ягады куды лепшыя. Параўнайце (ківае на суседнія вёдры з чарніцамі, якія прывезлі з-пад Старых Дарог). Там суніцы збіраюць — памерам з мой пазногаць!»

Агародніна абавязкова правяраецца на нітраты.

Мужчына з Маладзечанскага раёна прыехаў на рынак з лісічкамі і ягадамі. Пяцілітровік чарніц ён збірае за дзве гадзіны. Прызнаецца, што пары дажджлівых дзён было мала для добрага ўраджаю: некаторыя паляны ў лесе ўжо павыгаралі ад сонца.

Праверка ў лабараторыі займае 10—20 хвілін. Сёння ўсе дары лесу атрымалі дабро.

— Глядзіце, ягады зусім чыстыя — 5,9 бэкерэля на кілаграм (дапушчальны ўзровень — 185 Бк/кг. — **Аўт.**), — звяртае ўвагу на паказанні радыёметра **ветурач Юлія АБРАМЧУК.**

Зборшчыкі грыбоў і ягад самі прыносяць тавар на экспертызу.

Чарніцы, загружаныя ў радыёметр.

Яна згадвае, што з пачатку сезона было толькі два перавышэнні па цэзіі — у лісічках. З грыбамі ўвогуле трэба быць асцярожнымі. У лабараторыі помняць, як аднойчы на продаж прынеслі грыбы, у якіх колькасць радыёнуклідаў дасягала амаль 9000 Бк/кг (пры норме ў 370)!

Калі агародніну, «начыненую» нітратамі, проста не дазваляюць прадаваць на рынку (адміністрацыя адсочвае, каб такі гандляр не стаў за прылавак), то партыю лясных ягад і грыбоў з завышаным цэзіем канфіскуюць і ўтылізуюць.

— Людзі на гэта рэагуюць па-рознаму, — не хавае Кацярына Дубікоўская. — Неяк у мужчыны канфіскавалі вельмі шмат чарніц, кілаграмаў 200, і ён дзякаваў, што мы не дапусцілі забруджаную ягаду да продажу. А бывае, даводзіцца абараняцца, міліцыю выклікаць. Незадаволеныя ў асноўным перакупшчыкі: яны ж ужо заплацілі за прадукцыю, узятую ў насельніцтва.

А вось назваць раён, адкуль часцей прывозяць забруджаныя грыбы і ягады, складана. Справа ў тым, што інфармацыя пра месца збору запісваецца са слоў прадаўцоў. Могуць сказаць, што «палявалі» ў Мінскім раёне, а ў суніцах шмат радыяцыі, што для прысталічча не характэрна.

Для прадаўцоў праверкі прадукцыі платныя. Кошт залежыць ад вагі. Напрыклад, за аналіз на радыёнукліды партыі да пяці кілаграмаў трэба заплаціць 2,80 рубля, а проба на нітраты партыі да 50 кілаграмаў абыдзецца ў 7,60 рубля. Калі ўсё ў парадку, на рукі выдаюць талон з «адзнакай якасці».

А вось імпартныя фрукты і ягады ў лабараторыі не правяраюць. Замежная прадукцыя паступае на Камароўку ўжо з дакументамі, таму яе дадатковую экспертызу на рынку праводзяць выбарачна.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Замерка нітратаў.

❍ У тэму

Дзяржаўны санітарны нагляд за рынкамі здзяйсняецца рэгулярна. Па яго выніках можна вылучыць наступныя недахопы: няправільныя ўмовы захоўвання прадукцыі — 35 % ад усіх парушэнняў, рэалізацыя харчовай сыравіны без дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку, — 17 %, продаж прадуктаў з няпоўнай маркіроўкай ці без яе — 12 %, рэалізацыя прадуктаў са скончаным тэрмінам прыдатнасці — 8 %, адсутнасць умоў для выканання правіл асабістай гігіены — 7 %.

Найбольш праблемным пытаннем з'яўляецца несвоечасовае правядзенне работ па паляпшэнні санітарна-гігіенічнага стану аб'ектаў — замена зношанага інвентару, халадзільнага абсталявання.

Загадчык аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вія ШУКЕВІЧ паведаміла, што пад наглядам знаходзіцца 261 рынак па краіне. Вылучыць самы лепшы ці самы горшы немагчыма. Але станоўчая дынаміка ў развіцці аб'ектаў ёсць. Праводзяцца рамонты, змяняецца гандлёвае абсталяванне на больш сучаснае.

БРАЗІЛІЯ ЎСПОМНІЛА, ЯК ЗАБІВАЦЬ

У Групе Е ўчора зборная Бразіліі сустракалася з камандай Коста-Рыкі і толькі ў дадатковы час змагла здабыць перамогу. Бразільцы не паказвалі характэрнай для сябе гульні, а іх зорка Неймар, хоць і змяніў «локшынную» прычоску, не быў асабліва заўважны на полі, хіба толькі сімуляцыяй у штрафной саперніка, якую суддзя выкрыў з дапамогай відэапаўтору і адмяніў раней прызначаны пенальці. Каманда Коста-Рыкі практычна акапалася каля сваёй штрафной, ну а зборнай Бразіліі відавочна не хапала хуткасці, ды і з крэатывам у атаках былі праблемы. Да жалю костарыканцаў, яны не дацярпелі да нулявой нічыёй зусім крыху — на 91-й хвіліне Філіпэ Каўціньё ўсё ж прабіў Наваса, а ўжо на 97-й нарэшце вызначыўся і сам Неймар.

Ну, а каманда Аргенціны пасля паражэння з лікам 0:3 ад Харватыі перажывае цяжкія часы. Асабліва дасталася галоўнаму трэнеру Хорхе Сампаолі. Разюшаныя заўзятары пасля матча ганьбілі яго, не выбіраючы слоў, і нават плявалі ў яго бок і кідалі бутэлькі. Далей — горш, футбалісты зборнай дружна папрасілі прызначыць новага трэнера на матч супраць каманды Нігерыі. Як бачым, у аргенцінскім каралеўстве поўны разлад, а чэмпіён свету 1978 года ў складзе Аргенціны Марыа Кемпес заявіў, што «зборная Аргенціны не з'яўляецца цяпер камандай. Я бачу шмат «сяброў Месі» і не бачу «партнёраў Месі».

Іван КУПАРВАС.

■ Здарэнне

НА «ФАНДАКУ» АДБЫЎСЯ ВЫБУХ

Такое паведамленне паступіла ў МНС каля сямі гадзін увечары 21 чэрвеня. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, убачылі, што з будынка завода драўнянастружкавых пліт валіць дым, таксама часткова разбураны сэндвіч-панэлі і выбіта шкло.

— Калі адбылося здарэнне, то ў цэху знаходзіліся 22 рабочыя, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Апёкі атрымаў аператар участка сушкі і сарціроўкі. Ён шпіталізаваны. Яшчэ дзвюм работніцам асколкі нязначна падрапалі скуру. Пажар быў аператыўна ліквідаваны. Прычына выбуху высвятляецца, але ў якасці адной з версій разглядаецца парушэнне тэхнічнага рэгламенту.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

АСЦЯРОЖНА: ПАДРОБКА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)


Вольга МАЛАШЭНКА дэманструе тыя самыя лыжкі з партрэтамі цароў.

— Той жа пярсцёнак «Мёртвая галава», персанальны ўзнагародны знак, які выдаваўся асабіста Генрыхам Гімлерам, членам СС, — прыводзіць прыклад Аляксей Бацюкоў. — Прадаўцы з інтэрнэту выдаюць яго за арыгінал, хоць гэта дастаткова рэдкі знак. Але падробкамі запалонены ўвесь рынак.

Музейныя работнікі могуць па выглядзе даць ацэнку тым ці іншым прадметам даўніны. Суразмоўнік узгадвае, што прыходзілася ідэнтыфікаваць кнігі, зброю, некаторыя побытавыя рэчы. Але перад тым як набыць чарговы экспанат, музей кансультуецца з больш дасведчанымі спецыялістамі. Напрыклад, калі размова ідзе пра тыя ж кнігі — гэта Нацыянальны гістарычны архіў або аддзел рэдкіх кніг Нацыянальнай бібліятэкі. Кансультацыю па карцінах можна атрымаць у Нацыянальным мастацкім музеі.

— Калі мы набывалі ў сваю калекцыю літургічнае пакрывала з фрагментамі слуцкіх паясоў, мы кансультаваліся са спецыялістамі гэтага музея, — удакладняе Аляксей Бацюкоў. — І яны пацвердзілі, што гэта арыгінал.

Нярэдка ўладальнікі так званых рарытэтных рэчаў перабольшваюць значэнне сваіх скарбаў. Нядаўна ў музей звярнуўся мужчына, які сцвярджаў, што яго цясак, нешта накшталт невялічкай шаблі, адносіцца да часоў Паўночнай вайны — пачатку XVIII стагоддзя. Але ў музеі пільна агледзелі рэч і засумняваліся, што яна настолькі старадаўняя. У выніку высветлілася, што цясак сапраўды не падробка, але перыяду не Паўночнай вайны, а вайны з Напалеонам — 1812 года.

НЕ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА, ШТО БЛІШЧЫЦЬ

У магілёўскіх музеях асабліва падазрона ставяцца да тых прадметаў, якія іх уладальнікі выдаюць за рарытэты. **Галоўны захавальнік фондаў Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея Вольга МАЛАШЭНКА** згадала два «свежыя» выпадкі, калі прапаноўваліся відавочныя падробкі.

— Гэта былі дзве манеты Расійскай Імперыі і сярэбраная лыжка з царскіх рублёў, — расказвае яна. — Адна з манет вартасцю тры рублі 1840 года выпуску лічыцца рарытэтам. У каталозе напісана, што яна была выпушчана ў адным (!) экзэмпляры. Мы праверылі дыяметр і вагу манеты, якую нам прынеслі, і яны прыкметна адрозніваліся ад арыгінальных параметраў. Пры неабходных 10,36 грама падробка важыла ўсяго 6,38 грама. Наогул плацінавыя манеты Расійскай Імперыі рэгулярна выстаўляюцца на нумізматычных аўкцыёнах, але павінна насцярожваць тое, што гэта дастаткова рэдкія рэчы. Асабліва тыя, што былі адчаканены ў 1839—1840 гадах. Іх рабілі ўсяго па адной-дзве адзінкі.

Рубель 1911 года быў у Расійскай Імперыі больш распаўсюджанай манетай. Але грашовая адзінка, якую прынеслі на экспертызу знаўцам, пры адносна роўных вазе і дыяметры аказалася таўсцейшая. Таўшчыня рубля, як указана ў каталозе, павінна быць 1,2 міліметра, а ў гэтага яна дасягала двух міліметраў.

— Тыраж манеты быў дастаткова вялікі, і для недасведчаных людзей яна магла падацца арыгіналам, — канстатуе Вольга Малашэнка. — Падробка такая ж жоўтая, як і павінна быць, практычна такога ж дыяметра, вагі. Але, калі ўлічваць усе нюансы, амаль у два разы аказалася таўсцейшая.

Спецыяліст раіць: калі вы нешта шукаеце для сваёй калекцыі, трэба ўважліва азнаёміцца з прадметам. Калі размова ідзе пра нумізматыку, трэба спачатку вывучыць даныя каталогаў. Іх можна знайсці ў інтэрнэце без праблем. На тым жа блышыным рынку трэба быць асабліва ўважлівым. Калі сумняваецеся, лепш адмовіцца ад пакупкі. Тады не прыйдзецца кагосьці вінаваціць у тым, што купілі фальшыўку. Як той казаў, вочы бачылі, што рукі бралі.

Пра лыжкі-фальшыўкі з партрэтамі цароў таксама шмат чаго напісана ў інтэрнэце. Тым не менш знаходзяцца ахвотныя прапанаваць іх.

— Такія лыжкі сапраўды рабіліся з юбілейных рублёў у XVIII—XIX стагоддзях і выпускаліся да пэўных дат абмежаванай колькасцю, — расказвае галоўны захавальнік. — Але тыя, што запаланілі рынак сёння — відавочная падробка. Хоць выглядаюць яны вельмі пераканаўча, з пацінай, слядамі старэння, нават з клеймамі таго часу.

БІЗНЕС НА ПАДРОБКАХ

Памятаеце анекдот: «А гарантыя ёсць, што гэта Рэмбрант не падроблены? — Так, ёсць. Тры гады»? Насамрэч гарантаваць стапрацэнтную сапраўднасць нейкіх прадметаў мастацтва вам ніхто не зможа. Асабліва там, дзе працуюць майстры сваёй справы.

— Сёння вельмі шмат прапануецца савецкага фарфору 50—60-х гадоў, — прыводзіць прыклад Вольга Малашэнка. — Існуе шмат гжэлеўскіх падробак, нягледзячы на тое, што завод і зараз працуе. І аматарам фарфоравай скульптуры трэба ведаць, як прадметы іх інтарэсу выглядаюць у каталогах. Шмат існуе копій нямецкага фарфору, напрыклад пачатку XX стагоддзя. Але гэта не заўсёды агаворваецца. І людзі плацяць вялікія грошы за, мякка кажучы, шырспажыў. Калі такія рэчы трапляюць да нас, мы праглядаем усе каталогі, антыкварныя сайты, параўноўваем цэны ў Беларусі, Расіі, Украіне, раімся з калекцыянерамі і толькі тады прыходзім да нейкага кансэнсусу.

БАБУЛІНА СПАДЧЫНА

Знайсці скульптуру і шмат чаго іншага савецкага перыяду можна і на Магілёўскім рынку, які ў народзе па-ранейшаму называецца Быхаўскім. Тут наогул прадаецца вялікая колькасць прадметаў быту 50—60-х гадоў. Гэта рэчы нядаўняй эпохі, і асаблівых ведаў, каб у іх разабрацца, не патрэбна. Магчыма, праз некалькі дзесяцігоддзяў нешта з гэтага і стане каштоўнасцю. Для музейшчыкаў зараз цікавасць уяўляюць іконы, прадметы мяккай этнаграфіі, некаторыя іншыя рэчы.

— Часам людзі прыносяць да нас іконы, каб проста нешта даведацца пра іх, — расказвае **загадчыца філіяла Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея — Музея этнаграфіі Святлана РЫБАКОВА.** — Абразы веткаўскай школы, напрыклад, з ніякімі іншымі нельга пераблытаць. Але, калі ўзнікаюць цяжкасці, раіліся з Нацыянальным мастацкім музеем. Некаторыя ўладальнікі бабуліных строяў або ручнікоў блытаюць час стварэння гэтых прадметаў. Упэўнены, напрыклад, што гэта канец XIX стагоддзя, а я бачу — пачатак XX стагоддзя і не раней. Цікавасць для нас уяўляюць таксама фотаздымкі, асабліва ў адзенні традыцыйным для таго ці іншага рэгіёна. Напрыклад, у 60-я гады ў Хоцімскім раёне яшчэ насілі адзенне з элементамі народнага касцюма. Вельмі цікавыя для нас упрыгажэнні 50—60-х гадоў, якія выкарыстоўвалі да народных касцюмаў. Гэта пацеркі, каралі, падвескі, галаўныя ўборы.

Фота пэўнага часу таксама даносіць да нас дух атмасферы. Але іх калекцыянерам трэба зноў жа быць уважлівымі, папярэджвае магілёўскі фотамайстар са шматгадовым стажам Ірына Савосіна.

— Складана бывае адрозніць рэпрадукцыю ад сапраўднай фатаграфіі, — кажа яна. — Напрыклад, вам прапануюць фота канца XIX стагоддзя. Зрабіць падробку пры сучасных тэхналогіях проста, як, дарэчы, і ў мастацтве. І тут павінен быць спецыяліст, які па хімічным аналізе вызначыць, да якой эпохі адносілася папера фотаздымка.

Сярод падробак часта можна сустрэць пярсцёнак «Мёртвая галава».

ПАРАДЫ АД СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Перад тым як пачаць калекцыяніраваць, трэба даведацца аб прадмеце свайго інтарэсу як можна болей. У гэтым вам дапамогуць як інтэрнэт, так і знаёмства з музейнымі экспанатамі.

На заметку тым, хто калекцыяніруе карціны. Ёсць толькі тры надзейныя месцы, дзе іх можна набыць: карцінная галерэя, непасрэдна майстэрня мастака, а карціны болей ранняга перыяду знаўцы раяць купляць у аўтарытэтнай антыкварнай краме.

Калекцыяніруйце, на здароўе. Гэта пашырае кругагляд, кола знаёмых, загартоўвае нервы. Галоўнае, каб жаданне завалодаць пэўным прадметам не выходзіла за межы дазволенага. Як і спроба зарабіць на няведанні іншых.

Часам на дакументальным фота, якое рабіліся на бромасярэбранай паперы, нядобрасумленны аўтар мог дабавіць (удрукаваць) яшчэ нейкі іншы прадмет або нават чалавека, іншымі словамі сказіць факт або падзею. Пры блізкім разглядзе здымка пабочны прадмет можна выявіць па святлацені. Але былі і такія падробкі, дзе праўду мог рассакрэціць толькі крыміналіст.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

У фондах Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея захоўваецца больш за 290 тысяч прадметаў. Але музейныя плошчы дазваляюць нам убачыць толькі працэнты чатыры. Пазнаёміцца з музейнымі рэдкасцямі можна на выстаўках аднаго дня або падчас Ночы музеяў. Так што сачыце за афішай.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Слоўніца

А Ў НАС ТАК НЕ ГАВОРАЦЬ!

Нязвыклая форма — заўсёды штуршок для пошуку

Калі вы многа падарожнічаеце па Беларусі, бываеце ў глухіх вёсачках, напэўна, адзначалі, што гаворка людзей розніцца. І калі наша вуха пачуе незвычайную форму слова, адразу пачынаем параўноўваць яе ці з літаратурнай мовай, ці з той, якой карысталіся на сваёй малой радзіме.

І сёння носьбіты традыцыйных гаворак не перастаюць здзіўляць даследчыкаў, якія прыязджаюць да іх у час дыялекталагічных экспедыцый. Часам за адным словам ці нават гукам можа хавацца гісторыя асаблівасцяў развіцця мовы.

— Незвычайная форма — гэта заўсёды штуршок для пошуку, для адказу на пытанне, што сабой уяўляла гаворка, якая яна сёння; у пэўнай ступені можна прадбачыць і яе далейшае развіццё, — заўважае **Вераніка КУРЦОВА, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.** — Паедзьце за Лагойск і крыху далей у паўночна-заходнім кірунку ці на ўсход, і там вы можаце пачуць «бала», «на скрыпацца». Спецыяліст адразу разумее, з чым гэта звязана (з характарам акання). Гэта не парушэнне нормы, а адлюстраванне тыповай маўленчай традыцыі, характэрнай для мясцовых гаворак пэўнага тыпу. Чалавеку, які вельмі далёкі ад народнай культуры, мовы, калі ён чуе падобныя формы, такое гучанне падасца ненармальным, ён дазваляе сабе заявіць: «Як смешна гавораць». Насамрэч такая рэакцыя — гэта проста дэманстрацыя няведання рэгіянальнай моўнай спецыфікі. Між іншым, адметныя моўныя факты могуць расказаць пра многае, у тым ліку і пра гісторыю твайго роду. Калі мы спрабуем разабрацца, чаму так гаворым, можам даведацца, адкуль прыбылі ў гэту мясцовасць нашы продкі. Напрыклад, калі на Віцебшчыне чуеш «на санёх» або «вав'ёрка», ліхаманкава ў сябе пытаешся: «Як аказаліся яны за межамі свайго актыўнага бытавання?». І калі падобную форму пачуеш ад пяці чалавек, разумееш, што на гэта былі прычыны.

Калі наш аддзел у 2011 годзе быў у экспедыцыі ў Полацкім раёне, мы не запісалі там «цокання» (калі ў слове замест «ч» вымаўляецца «ц»), хоць у 40-я гады мінулага стагоддзя ў час збірання матэрыялаў для Дыялекталагічнага атласа гэта з'ява там яшчэ дзе-нідзе фіксавалася. А падчас экспедыцыі ў Верхнядзвінскім раёне (2017 год) я аб'ездзіла многа вёсак і ў некалькіх з іх пачула не толькі словы: «вадзіцка», «сястрыцка», але і «пецка». Вымаўленне «ц», нават калі чалавек ужывае паралельна словы «вадзічка» і «вадзіцка», «пецка» і «печка», невыпадковае. Для даследчыка гэта найперш указанне, што цоканне сапраўды жыло тут некалі, бо ад яго нават да сёння захаваўся след. Ці другі выпадак. У паўднёва-заходняй Беларусі, на тэрыторыі якой распаўсюджаныя гаворкі паўднёва-заходняга дыялекту, можна пачуць словы «балата» (націск на апошні гук), «вокна», «цялята». Не трэба думаць, што гэта перанята з рускай мовы. Насамрэч гэта традыцыйная, раней шырокаўжывальная форма, калі назоўнікі ніякага роду ў назоўным склоне множнага ліку мелі канчатак «а». Але сёння вы тут сустрэнеце хутчэй адзінкавыя словы з такім канчаткам...

— Напэўна, краязнаўцы і наогул неабыякавыя да роднай культуры і гісторыі людзі маглі б таксама збіраць такія моўныя факты?

— Маглі б збіраць, сапраўды, многія. Але трэба заўважыць, што і цяпер сярод нас ёсць неабыякавыя людзі, далёка не толькі краязнаўцы, якія рупяцца пра захаванне моўных скарбаў сваёй мясцовасці. Яны запісваюць тыя матчыны словы, з якімі раслі. Гэтым самым найперш зберагаюць памяць пра сваіх продкаў, пра гісторыю свайго краю. Добра, калі людзі разумеюць каштоўнасць таго, што знікае. А каб сабраная інфармацыя стала агульнанацыянальным набыткам, скарбам для іншых, яе можна дасылаць, напрыклад, у наш аддзел, бо калі падобныя факты не занатаваць, заўтра можа быць позна. Напрыклад, калі я паеду ў тую мясцовасць, дзе запісалі адметныя словы ці нейкія асаблівыя слова-формы, магу ўжо гэтага і не заспець, бо прадстаўнікі старэйшага пакалення сыходзяць у нябыт, а разам з імі адыходзіць і наша мова, магчымасць больш даведацца пра яе гісторыю. І, на жаль, ужо сёння некаторыя адметнасці, рысы, якія вылучалі нас як беларусаў па гаворцы, можна ў вёсцы і не знайсці...

КАЛДОБІНЫ ЦІ ГАЛДОБІНЫ?

— Пра што можа расказаць слова «салёнка» (ачышчаная звараная пасоленая бульба)? — цікаўлюся ў Веранікі Курцовай і працягваю ліст са Смаргоншчыны ад нашай чытачкі Яўгеніі Кулевіч («Слоўніца» працягвае паляванне на моўныя скарбы: словы, запісаныя чытачамі, мы перадаём вучоным).

— Пра адметныя традыцыі харчавання беларусаў. Часта страва атрымлівае сваю назву па пэўнай прыкмеце. Напрыклад, зварылі бульбу, яе не парэзалі, не патаўклі і кажуць: сёння будзем есці «цэлую бульбу». А калі чуеш назву «салёнка», адразу разумееш, якая матывацыйная прыкмета лягла ў яе аснову — страву пасалілі. Але была на Беларусі і іншая традыцыя — есці бульбу без солі, бо апошнюю не заўсёды людзі маглі набыць. А яшчэ ў слове «салёнка» адлюстравана асаблівасць маўлення. У іншых рэгіёнах сустракаецца форма з цвёрдым гукам «л» — «салонікі». Вельмі важна, каб людзі, якія збіраюць словы, пазначалі, у якой мясцовасці яны зафіксаваны. Напрыклад, на тэрыторыі паўночнага захаду Беларусі можна пачуць «галдобіны» (згадаем агульнавядомыя калдобіны). Альбо, акрамя «канюхі», беларусы могуць гаварыць «канюгі». Розныя формы вымаўлення могуць сведчыць пра працэсы, якія адбываюцца ў мове, і даследчык паспрабуе даць адказ, чым было выклікана з'яўленне такіх лексічных варыянтаў.

— У лісце Яўгеніі Барысаўны я знаходжу і інфармацыю пра традыцыйныя рамёствы. Так, яна згадвае слова «клоча». («Калі часалі лён, то вычэсваліся кароценькія валасінкі. Доўгія ішлі на кужаль (тонкае палатно), а кароткія на што-небудзь горшае: посцілкі, ходнікі (палавікі), мяшкі, шарачок. Таксама людзі казалі: «Хоць клоча, хоць воўна, абы кішка поўна» («Не трэба шукаць прысмакаў, а есці, што ёсць».)

— Вымаўленне слова «клочча» ў абліччы «клоча» адлюстроўвае тыповыя фанетычныя рысы мясцовай гаворкі. Наяўнасць аднаго зычнага ў становішчы паміж галоснымі — найвыразнейшая асаблівасць гаворак у гэтым рэгіёне. На Смаргоншчыне вы можаце сустрэць многа слоў, дзе не адбылося падаўжэння зычных: «падарожа», «вяселе (вяселле)», «жыцё». Прычым калі мы запісваем тэксты гаворак, то ўключаем у запіс усё, як расказвае сам апавядальнік. У сучасным маўленні, акрамя традыцыйнага пласта слоў, сустракаецца і шмат новых, галоўным чынам запазычаных з рускай мовы. Але гучаць яны па-мясцоваму. Так, калі людзі згадваюць пра сваё здароўе, кажуць пра ціск «даўлене». Слова «даўлене» па вымаўленні асобных гукаў такое ж, як названыя вышэй «вяселе» ці «жыцё», бо засваенне адбываецца па законах традыцыйнай фанетыкі, шляхам адаптацыі да гукавога ладу мясцовай гаворкі.

У ВАШ СЛОЎНІЧАК:

Лацвей, латвей, латво — добра, лёгка, зручна, выгадна. (Латвей яму рабіць, калі сын дапамагае. Ну, справу залатвіў!) «Падобныя словы — тыповыя для паўночна-заходняй часткі Беларусі. Калі ўзнікаюць такія адзінкі, як «залатвіў справу», што азначае, мабыць, «зрабіў вельмі добра, удала», гэта паказвае, што слова характарызуецца высокай словаўтваральнай прадуктыўнасцю, бо ўжываецца не толькі ў адной форме: яго асноўная частка, корань, выступае і ў іншых абазначальных сродках. Відавочна, яно добра вядома мясцовым насельнікам», — тлумачыць Вераніка Курцова.

Закапёршчык — зачыншчык, ініцыятар якой-небудзь справы. Вучоныя заўважаюць, што гэта слова традыцыйнае для беларускіх гаворак, але абмежаванае рэгіянальна. Часам у такім жа значэнні выкарыстоўваецца і слова «падбухторшчык».

Закалец на палец. Пра дрэнную гаспадыню гаварылі: «Як хлеб спячэ, то закалец на палец». Закалец — гэта аселы на скарынку хлеб, і сама такая скарынка. Вераніка Курцова таксама дадае: «Хлеб з закальцам абазначаецца словам «закалісты». А яшчэ ў такім выразе паказана, наколькі ён няўдалы — па таўшчыні на цэлы палец. Да таго ж, як кажуць у народзе, ацеслевы, глёўкі, глізавы. Каб не было такой неспадзяванкі, хлеба з закальцам, то дзежку, у якой замешвалі хлеб, лячылі: націралі цыбуляй».

Трэба неба, але трэба і хлеба. «Гэта было ў вёсцы Сялец. Адзін чалавек рэгулярна хадзіў да касцёла, амаль кожны дзень. А дома пяцёра дзяцей, жонцы хоць разарвіся, і звярнулася тая да ксяндза, толькі папрасіла, каб мужу не казаў, што яна прыходзіла. Наступны раз ксёндз выклікаў мужыка, пагаварыў і на заканчэнне сказаў: «Трэба неба, але трэба і хлеба», — напісала ў сваім лісце Яўгенія Кулевіч. А як заўважыла Вераніка Курцова, такі выраз даволі вядомы на Беларусі. Што ні кажы, а хлеб для людзей заўсёды быў на першым месцы.

Яйка вып'е, і дзюркі не будзе — казалі пра вельмі хітрага чалавека.

Пазуры (ногці, пазногці). Такое слова ўжываюць галоўным чынам у гродзенска-баранавіцкіх, а таксама заходнепалескіх гаворках. Акрамя яго, беларускім гаворкам для абазначэння ногцяў вядомыя найменні, напрыклад, на паўднёвым усходзе, за выключэннем усходнепалескіх гаворак, — «кіпці; капцюры» — у асобных вёсках на поўдні Беларусі. Праўда, выкарыстоўваюцца капцюры (кіпцюры) звычайна разам са сваім «сваяком» — словам з аднолькавым значэннем — «ногці». Пазногці з'яўляюцца набыткам сярэднебеларускіх гаворак, але галоўным чынам той іх часткі, якія размешчаны ў кірунку на паўночны захад.

З-пад гадзіны яйкі дастане, і тая не ўкусіць — казалі пра чалавека, які нядбайна, але паспяхова выконвае сваю работу.

Шляга — палка з булавой на канцы, зробленая з моцнага, цвёрдага дрэва, якой карысталіся, напрыклад, калі расколвалі на дровы калоду, білі ёю па абуху сякеры. Па-іншаму гэты прадмет называецца шырокавядомым у беларускай мове словам «доўбня». Слова трапіла ў гаворкі з нямецкай мовы.

Кваліць (цваліць) — дражніць, звычайна дзіця. Прыйшло слова ў беларускія гаворкі з польскай мовы. У форме «кваліць» з пачатковым спалучэннем «кв» яно вядома найперш у гаворках заходняй зоны беларускай мовы.

Ясёнка — асенняе жаночае паліто (без механізма каўняра, ваціна ці ваты, толькі верх і падкладка). Слова рэгіянальна абмежаванае. Як і «кваліць», яно вядомае найперш у гаворках заходняй зоны беларускай мовы.

Дубальты — застаўленыя падвойныя вокны на зіму. Слова характэрнае галоўным чынам для заходняй часткі беларускай дыялектнай мовы. Акрамя слова дубальты, больш шырока ў гаворках у значэнні «падвойны» ўжываецца лексема «дубальтовы». Яна, дарэчы, з'яўляецца нарматыўнай у беларускай літаратурнай мове. Форма «дубальтовы» лічыцца запазычаннем з польскай мовы.

Еш хоць распержыся — казалі, калі ў гасцях было багата ўсякай ежы. Калі чалавек наеўся, раменьчык, відаць, ужо перашкаджаў.

Печарыцы — шампіньёны. На Беларусі яшчэ іх называюць печурыцы, пячуркі, пячаркі, пячоркі. Словы з такім абліччам пашыраны ў асноўным у гаворках поўдня Беларусі, радзей яны адзначаюцца на тэрыторыі Гродзеншчыны. Акрамя найменняў накшталт «печурыцы», гаворкам вядомы назвы белякі, бялянкі, пагнойкі, пагнойнікі і інш. формы з базавай часткай -гн- (і яе варыянтамі), садавікі, совы, сарокі, панскія грыбы. Але самымі распаўсюджанымі з'яўляюцца трансфармаваныя да непазнавальнасці формы лексемы «шампіньёны». У гаворках слова выступае як шампіёны, шапіёны, шпіёны, чампіёны. Дадаюцца да пералічаных трансформаў і іншыя іх фанетычныя варыянты.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

■ Векапомнае

КАБ БЫЛО КАМУ РАСКАЗАЦЬ...

45 гадоў таму ў Дальве — сястры Хатыні — адкрыўся мемарыяльны комплекс

Ён быў створаны па ініцыятыве адзінага ўцалелага ў «вогненнай вёсцы» жыхара — Мікалая Пятровіча Гірыловіча. Літаральна за некалькі дзён да вызвалення, 19 чэрвеня 1944 года, нямецка-фашысцкія акупанты знішчылі вёску Дальва Лагойскага раёна. Зажыва спалілі 44 яе жыхароў: 29 дзяцей, 13 жанчын, 2 мужчын. Гэта была апошняя з 628 беларускіх «вогненных вёсак» Вялікай Айчыннай вайны, якія паўтарылі трагічны лёс Хатыні.

Можа, Гасподзь пакінуў яму жыццё, каб было каму расказаць?.. «Дальва — сястра Хатыні» — так называецца кніга Мікалая Гірыловіча, якую ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Ад Хатыні да Дальвы і сапраўды рукой падаць — у Лагойскім (былым Плешчаніцкім) раёне іх аддзяляе ўсяго пара дзясяткаў кіламетраў. Зараз мемарыяльны комплекс «Дальва» — філіял Хатынскага мемарыяла-музея.

Узводзіўся помнік у Дальве... на грамадскіх пачатках: дзяржаўнага фінансавання не было. Ініцыятарам і «рухавіком» справы быў Мікалай Гірыловіч. Калі 30 чэрвеня 1969 года адкрывалі мемарыял «Хатынь», ён прывёз дальвінскую зямлю на Могілкі вёсак. Тады і прыйшла ідэя ўвекавечыць памяць роднай мясціны.

Ён узняў грамадскасць краіны на гэту святую справу, асабліва важкім быў уклад калег з Белтэлерадыёкампаніі, дзе многія гады працаваў заслужаны сувязіст Беларусі Мікалай Пятровіч Гірыловіч. Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія

Велічная постаць жанчыны-маці, да якой даверліва прытуліўся маленькі хлопчык. А за іх спінамі — чорныя, нібы абгарэлыя, бэлькі, што руйнавалі чалавечыя жыцці. Былая вясковая вуліца стала алеяй памяці: 44 бярозкі — як напамін пра загінулых у страшным вогнішчы. На месцы, дзе стаялі хаты, — своеасаблівыя зрубы з цэменту. У Дальве было 12 хат, але сродкаў не хапала — паказана ўсяго пяць...

Вось што расказваў Мікалай Пятровіч пра той самы страшны, апошні дзень Дальвы:

— На досвітку 19 чэрвеня бацька павёў пасвіць каня, кіламетры за два ад вёскі. Маці разбудзіла мяне, каб падмяніў бацьку. Сонца толькі ўзыходзіла, мы з маці басанож ішлі па роснай траве, пакідаючы прыкметныя сляды. Як цяпер памятаю — бацька з маці адыходзілі ў Дальву, таксама пакідаючы сляды на расе... Праз нейкі час пачуў выбух і аўтаматныя чэргі. Узяўся распутваць каня — ён быў спутаны жалезным путам, — але не атрымалася.

Мікалай ГІРЫЛОВІЧ у час адкрыцця ДМК «Хатынь».

На працягу больш як чатырох дзесяцігоддзяў шэфствуе над Дальвай, яе супрацоўнікі прымалі самы актыўны ўдзел ва ўзвядзенні мемарыяла і яго далейшым добраўпарадкаванні.

Дальву будавала моладзь — пры падтрымцы ЦК камсамола Беларусі. Маладыя людзі, якія ўжо не помнілі вайну і якія нарадзіліся пасля Перамогі, збіралі сродкі, стваралі праект мемарыяла і працавалі на яго ўзвядзенні. Школьнікі, студэнты, працоўная моладзь, вайскоўцы... Аўтар мемарыяла ў Дальве — заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, скульптар Уладзімір Церабун — тады быў студэнтам тэатральна-мастацкага інстытута.

Пабег у вёску без каня — гэта мяне і выратавала, інакш бы я апынуўся ў Дальве ў той момант, калі немцы рабілі сваю чорную справу... Я прыбег агародамі, праз жыта — дзверы ў хаце адчынены, лётае пух ад падушак, пабітае шкло. А на стале лыжкі раскладзены... Выбег з хаты — нікога навокал, толькі праз дым убачыў у канцы вёскі дзве крытыя машыны. Мусіць, думаю, забралі людзей. Але не, аднавяскоўцы ўжо дагаралі... У маёй памяці да гэтага часу жах таго страшнага чэрвеньскага дня, чорнага панядзелка, калі Дальва паміралa — паміралa пакутліва, цяжка... Яшчэ і назаўтра, і на дзясяты дзень над папялішчам стаяў густы цяжкі пах. Ветрам яго даносіла да блізкіх і далёкіх вёсак. Не даваў дыхаць гэты пах смерці і гора. Дзесяць дзён і начэй ляжалі пад адкрытым небам спаленыя дальвінцы. Не маглі жывыя адразу выканаць свой хрысціянскі абавязак перад нябожчыкамі: акупанты адступалі на захад, аказваючы жорсткае супраціўленне. Толькі 29 чэрвеня, у другой палове дня, паказаліся нашы танкі. У Дальву прыйшлі партызаны, сабраліся жыхары суседніх вёсак, каб пахаваць людзей...

Мемарыял у Дальве — гэта помнік вёсцы і яе жыхарам. Але гэта помнік і яму, Гірыловічу. Ён здзейсніў вялікі сыноўні і грамадзянскі подзвіг... Мікалаю Пятровічу пашчасціла стварыць добрую сям'ю, моцную і надзейную, якая заўжды падтрымлівала і дапамагала: жонка Рыма Ігараўна, дачка Вольга, унучка Ганна, названая ў памяць аб загінулай у вогнішчы прабабцы; падрастаюць і трое праўнукаў... Для іх Дальва ніколі не стане помнікам — гэта іх Радзіма.

На магіле Мікалая Гірыловіча — сімвалічныя радкі:

З людзьмі спалілі тваю Дальву,
Што паўтарыла лёс Хатыні.
Зрабіў ты ўсё, каб мы ніколі
Пра тое гора не забылі...

Сёння ў мемарыяльным комплексе «Дальва» Лагойскага раёна Мінскай вобласці пройдзе акцыя памяці, прысвечаная 74-й гадавіне трагедыі вёскі Дальва і 45-годдзю адкрыцця мемарыяльнага комплексу «Дальва». Па бласлаўленні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, мітынг-рэквіем пачнецца з жалобнага богаслужэння ў памяць пра загінулых жыхароў вёскі Дальва.

Таццяна ПАДАЛЯК

ДАРЭЧЫ... Пастаянныя чытачы добра ведаюць, што на працягу многіх гадоў Мікалай Пятровіч Гірыловіч быў шчырым сябрам газеты «Звязда», кансультантам па пытаннях гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. А рэдакцыя найстарэйшай беларускай газеты выступала інфармацыйным партнёрам і медыйным апекуном будаўніцтва, добраўпарадкавання, рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Дальва».

■ Вандроўкі з сяброўкай

Начное балота і пячора з соллю

На якія турыстычныя паслугі і ўмовы ў Беларусі разлічваюць падарожнікі

Лета — пара вандраванняў і адпачынку, а яшчэ — клопатаў, куды адправіцца і чаму аддаць перавагу. Наведаць гістарычныя славутасці ці паляжаць на беразе, падмацаваць здароўе ці адарвацца па поўнай, каштуючы незвычайныя напоі ды ежу, трапіць у маляўнічую прыродную цішыню ці кінуцца ў насычаныя святочныя праграмы?.. А можа, нейкім чынам спалучыць прыемнае з карысным? Пра тое, хто і па што прыязджае ў нашу краіну і як у Беларусі можна адпачыць, «Звязда» распытала аднаго з турыстычных аператараў.

Паветраны шар і журавіны з-пад снегу

Выбіраючы месца для адпачынку, падарожнік зыходзіць са сваіх патрэб і, як правіла, выбірае нейкі дакладны кірунак: медыцынскі, пазнавальны, гастранамічны, экалагічны, паляўнічы, прамысловы... Хоць часта турысты сумяшчаюць розныя.

— Калі мэта чалавека — санаторна-аздараўленчы турызм і ён хоча паправіць здароўе, то наўрад ці будзе адначасова заказваць сабе экскурсіі і забавы, — расказала **Марына ГНЕДАЯ, дырэктар прадпрыемства «Аўтаматычныя тэхналогіі турызму».** — Калі ж падарожнік едзе паглядзець краіну, можна спалучыць некалькі кірункаў. Прапанаваць яму пазнаёміцца з нашымі сядзібамі і даведацца пра этнічныя традыцыі, пакаштаваць нашу кухню, наведаць беларускія славутасці.

Найбольш неверагодныя прапановы аператара можна сустрэць у індывідуальных і карпаратыўных турах. Усе пажаданні людзей стараюцца выканаць. Паляцець на паветраным шары ці пакатацца на цеплаходзе — калі ласка. Паход у закуліссе цырка ці на піўны завод — без праблем. Убачыць, як збіраюць БелАЗы ці ткуць слуцкія паясы, — няма пытанняў.

Вось, напрыклад, адзін з дзівосных і крыху экстрэмальных вясновых тураў — экалагічны тур па назіранні за цецеруковым такаваннем у Бярэзінскім біясферным запаведніку. Гэта двух- або трохдзённыя падарожжы, калі турысты ідуць ноччу праз балота з правадніком і пасля чакаюць у засідцы, пакуль прыляцяць птушкі. Раней сюды маглі трапіць толькі арнітолагі. Зараз — усе ахвотныя. Дадаткова можна пакаштаваць журавіны, якія перазімавалі пад снегам.

Даследаваць свае дзівосы

Трэць турыстаў, якія падарожнічаюць па Беларусі, — мясцовыя жыхары, каля 5 % — вандроўнікі з Польшчы, Прыбалтыкі, Украіны, астатнія — амаль усе чыста расіяне, прыводзіць статыстыку тураператар.

Такую колькасць турыстаў-расіян можна растлумачыць цэлым шэрагам прычын. Гэта адсутнасць візавага бар'ера і неабходнасці рабіць дадатковыя дакументы, наяўнасць той жа мовы, якой яны карыстаюцца на радзіме, прывабны кошт паслуг. Акрамя таго, яны проста сапраўды ўспрымаюць беларусаў як сваіх братоў і любяць наведваць краіну, дзе ім усё знаёма, лічыць Марына Гнедая.

Колькасць айчынных турыстаў значна павялічылася пасля 2014 года, калі беларусам стала складаней выехаць на адпачынак у звыклы Крым.

— Людзі засталіся ў краіне, звярнулі ўвагу на нашы санаторыі, і многія нечакана ўразіліся, што такія ўстановы — не толькі месцы для старых, а і паўнавартасныя сучасныя комплексы, — адзначыла спецыяліст. — Высветлілася, што беларусам падабаецца вывучаць сваю радзіму, падарожнічаць па ёй і сутыкацца з дзівосамі, якія, як ім здавалася, можна было пабачыць толькі за межамі краіны, а яны аказаліся тут, пад бокам.

Варта толькі пачаць вандраваць па радзіме, і ўжо цяжка будзе спыніць сваё даследаванне. Напрыклад, адчуванні ад неверагоднага падарожжа на 600 метраў углыб зямлі, каб падыхаць гаючым паветрам ва ўнікальнай спелеалячэбніцы ў Салігорску, думаецца, будуць помніцца доўга. Трапіць у падобную пячору з соллю, якая засталася пасля распрацоўкі шахты, турысты не могуць бадай нідзе ў свеце.

Беларусь за пяць дзён і «Мінск вячэрні»

Замежныя турысты, якія прыязджаюць у Беларусь, арыентуюцца перш за ўсё на славутасці, што ўнесены ў спіс ЮНЕСКА: Мірскі і Нясвіжскі замкі, Белавежская пушча. Абавязкова адпраўляюцца ў аглядныя экскурсіі па сталіцы.

— «Мінск аглядны» і «Мінск вячэрні» — папулярныя экскурсіі не толькі ў іншаземцаў, але і ў нашых людзей, — заўважыла Марына Гнедая. — Некаторыя хоць і жывуць у Мінску, не ведаюць многіх момантаў і адкрываюць для сябе шмат новага.

Падчас такіх падарожжаў, дарэчы, выкарыстоўваюць радыёгіды — спецыяльныя прылады, якія выдаюць кожнаму турысту. Дзякуючы прыбору можна не напружваць слых і не імкнуцца стаяць бліжэй да экскурсавода ў шумных месцах, а крыху адысціся ўбок, не губляючы сувязі. Да таго ж гэта вельмі зручна, калі ў адным аўтобусе едуць разам англа- і рускамоўныя турысты.

Спецыяльна для падарожнікаў з Еўрапейскага саюза аператар распрацоўвае новыя туры. Цікавая прапанова — уся Беларусь за пяць дзён. Гэтая паездка створана для грамадзян, якія прылятаюць у аэрапорт па бязвізавым рэжыме. Іх сустракаюць, што называецца, адразу ад самалёта і на працягу пяці дзён арганізуюць экскурсію нон-стоп па найбольш цікавых славутасцях краіны.

— Летась мы распрацавалі туры спецыяльна для тых, хто наведвае зоны вакол Брэста і Гродна. Тут падарожнікі без візы могуць знаходзіцца, не выязджаючы за пэўныя межы, да дзесяці дзён. Да экскурсій могуць далучыцца тыя, хто адпачывае ў мясцовых санаторыях. Мы арганізуем для іх двухдзённыя туры, каб паказаць Брэст і Брэсцкую крэпасць, Белавежскую пушчу, Аўгустоўскі канал, — дадала дырэктар.

Што выдатнага і цікавага можна сустрэць у паездках па абсягах Беларусі, чым здзіўляюць турыстаў у айчынных санаторыях, прыватных сядзібах і прыродных запаведніках? Каб зразумець гэта і праўдзіва расказаць чытачам, трэба пабачыць усё на ўласныя вочы і адчуць на ўласнай скуры. З такімі спадзяваннямі мы распачалі на старонках «Звязды» новую рубрыку «Вандроўкі з сяброўкай», дзе будзем расказваць пра маляўнічыя куточкі нашай краіны і арыгінальныя турыстычныя паслугі, каб ваша падарожжа не проста сталася ўдалым і незабыўным, а напоўнілася прыемнымі сюрпрызамі і жаданнем даследаваць сваю краіну.

Ірына СІДАРОК.

Беларускі тураператар «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму»
ЭКСКУРСІІ ПА БЕЛАРУСІ
Ekskursii.by
Санаторыі • Базы адпачынку • Турыстычныя комплексы • Гасцініцы • Трансфер
г. Мінск, вул. Суражская, 10, оф. 21, УНП: 190855081 +375 17 394 49 11 +375 29 768 30 00

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: г. Жодзіна

ГОРАД, ПРА ЯКІ МОЖНА МАРЫЦЬ

Сёлета, 3 ліпеня, Жодзіна адзначыць 55-гадовы юбілей. Да яго рыхтаваліся задоўга і карпатліва. Горад значна папрыгажэў, стаў утульным і камфортным. Што плануецца зрабіць да свята, што новага з'явіцца ў перспектыве — пра гэта і іншае расказаў «Звяздзе» старшыня гарвыканкама Юрый ШАРЫЙ:

— У Жодзіне распрацавана канцэпцыя развіцця горада на найбліжэйшую і больш аддаленую перспектывы. Яна маштабная і ахоплівае практычна ўсе аспекты інфраструктуры, пачынаючы з расшырэння меж горада і заканчваючы светлавым і кветкавым афармленнем вуліц і будынкаў.

Распараджэннем кіраўніка дзяржавы 30 гектараў зямель сельскагаспадарчага прызначэння са Смалявіцкага раёна перададуцца гораду для будаўніцтва жылля. Гэта вельмі актуальна, паколькі ў чарзе стаіць 5755 гараджан, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні ўмоў пражывання, у тым ліку 265 шматдзетных сем'яў. У выніку ўзвядзення 14 шматпавярховых дамоў у мікрараёне № 9 жыллёвае пытанне змогуць вырашыць амаль паўтары тысячы чалавек.

Актуальным застаецца і будаўніцтва дзіцячай паліклінікі. У адпаведнасці з канцэпцыяй для гэтага выдзелена пляцоўка на перасячэнні праспектаў Скарыны і Леніна. Але ўстанова аховы здароўя з'явіцца ў больш аддаленай перспектыве.

— Юрый Аляксандравіч, таксама шмат зроблена да юбілею горада. Якія змены адбыліся, якія работы выкананы?

— Мы, як ніколі раней, удзялілі ўвагу менавіта добраўпарадкаванню. Правялі рэканструкцыю праспекта Міру, завяршаецца капітальны рамонт дваровых тэрыторый на вуліцах Ракасоўскага, 50 гадоў Кастрычніка, праспекце Леніна. Пачаліся работы ў дварах на праспекце Міру, ідзе рамонт жылфонду. Дзякуючы падтрымцы такіх прадпрыемстваў, як БелАЗ, Кавальскі завод цяжкіх

штамповак, «Світанак», «Белаўтазапчастка», цеплаэлектрастанцыя, і іншых удалося выканаць вялікі аб'ём работ па добраўпарадкаванні.

Акрамя таго, заменена агароджа паўз аўтадарогу рэспубліканскага прызначэння Р53, якая часткова праходзіць цераз горад, а таксама ў стылі нацыянальнага арнаменту аздоблены тарцы жылых дамоў, што размешчаны на ўездзе. Завершана таксама колеравае афармленне фасадаў усіх шматпавярховых дамоў на праспектах Леніна, Міру, Скарыны, вуліцах 50 гадоў Кастрычніка, імя Ракасоўскага.

— Наколькі ведаю, вялікія пераўтварэнні адбываюцца ў гарадскім парку культуры і адпачынку...

— Сапраўды, адной з глабальных задач, якая ўжо блізкая да рэалізацыі, з'яўляецца рэканструкцыя парку культуры і адпачынку. У абноўленым выглядзе ён павінен паўстаць ужо да юбілею. Тут заканчваецца ўладкаванне спартыўнай, дзіцячай, экалагічнай пляцовак. У зоне з'явяцца трэнажоры, пляцоўкі для заняткаў стрытболам, пляжным валейболам, гольфам, вяровачны гарадок, скаладром, скейтпарк. У экалагічнай зоне запланаваны штучны вадаём плошчай 1600 квадратных метраў, які ўпрыгожаць фантан і мост. Вакол будзе пракладзена дарожка для пешаходаў, устаноўлены лаўкі і альтанка. На месцы старой танцпляцоўкі ідзе будаўніцтва амфітэатра са сцэнай на 300 месцаў, дзе можна будзе праводзіць розныя мерапрыемствы. Гэтыя работы ўзялі на сябе гарадскі бюджэт і буйныя прадпрыемствы горада.

А вось з ініцыятывай уладкавання гульнявой зоны пад назвай «Акваторыя» ў марскім стылі выступіў гарадскі савет прадпрымальнікаў, які ўзначальвае Аляксандр Будзько. Плануецца, што тут будуць устаноўлены два караблі. Меншы прызначаецца для дзяцей да 10 гадоў, другі — з агляднай пляцоўкай — для правядзення разнастайных мерапрыемстваў для дзяцей старэйшага ўзросту.

— Юрый Аляксандравіч, горад мяняецца на вачах дзякуючы ўдзелу кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, прыватнага бізнесу, грамадскасці. Ці не так?

— Мабыць, гэта тая справа, якую трэба рабіць разам, талакой! Таму грошы на яе ажыццяўленне мы збіраем сумесна. Ідэяй прасякнуліся многія. І вялікі дзякуй тым, хто разумее, што толькі агульнымі намаганнямі, працуючы ў адным кірунку, можна зрабіць Жодзіна ўладкаваным, камфортным для жыцця. І тады мы ўсе будзем жыць у горадзе, аб якім марым.

Мяне вельмі радуе, што мы знайшлі разуменне ў прадпрымальніцкім асяроддзі: у рэалізацыі сацыяльна важных праектаў нашы ідэі знаходзяць тут водгук і падтрымку. Больш таго, прыватны бізнес ужо сам выходзіць з цікавымі прапановамі. Нагадаю, зноў жа пры падтрымцы прадпрымальнікаў удалося ўладкаваць некалькі зон адпачынку на няцотным баку праспекта Міру. За кошт прыватных прадпрыемстваў таксама добраўпарадкаваны некаторыя дваровыя тэрыторыі і зроблена некалькі пешаходных развязак.

У працяг леташняй ідэі па стварэнні алеі ліхтароў, на якой кожнае прадпрыемства ўстанавіла сваю тэматычную свяцільню, а сама алея ўжо стала сапраўднай візітнай карткай, сёлета мы хочам рэалізаваць не менш цікавую задумку: з дапамогай усіх прадпрыемстваў і арганізацый горада на праспекце Леніна ўладкаваць алею крэатыўных лавак.

Нельга не сказаць аб жывым упрыгажэнні горада: у гэтым годзе яго вуліцы аздобіць рэкордная колькасць кветак — больш за 50 тысяч! Упершыню парадуюць вока гараджан каля 18 тысяч ружавых кустоў, падараных Навукова-практычным цэнтрам па земляробстве Нацыянальнай акадэміі навук, якім кіруе Фёдар Прывалаў. Яны высаджаны на цэнтральных вуліцах горада, перакрыжаваннях і ў скверах.

Мы разумеем, што за прыгожымі фасадамі, роўнымі дарогамі, новымі дамамі нельга забываць і аб духоўным. На ўездзе ў горад з боку Мінска будзе ўстаноўлена скульптурная кампазіцыя Божай Маці, а прылеглую да яе тэрыторыю добраўпарадкуюць. Гэтая скульптура павінна стаць своеасаблівым сімвалам Жодзіна, а галоўнае — духоўным абярэгам для яго жыхароў.

— Юрый Аляксандравіч, а якімі мерапрыемствамі парадуюць жыхароў Жодзіна?

— Іх будзе шмат, і ўсе яны будуць розныя. Гэта спартыўныя спаборніцтвы, конкурс прыгажосці «Міс Жодзіна», урачыстае адкрыццё новай капліцы на месцы разбуранага храма. Каля будынка гарвыканкама будзе працаваць пляцоўка гарадоў-пабрацімаў. Адкрыецца парк культуры і адпачынку пасля рэканструкцыі. У горадзе ў гэтыя дні пройдзе фестываль вулічных тэатраў і кулінарна-кандытарскі фэст. Трэцяга ліпеня адбудзецца маштабнае па відовішчнасці і колькасці ўдзельнікаў тэатралізаванае шэсце арганізацый горада «Табе, любімы горад, прысвячаецца!». Падчас урачыстага сходу ўшануем найлепшых з найлепшых. У вялікім канцэрце прымуць удзел зоркі беларускай і расійскай эстрады. Завяршыцца святкаванне рэспубліканскай акцыяй «Спяём гімн разам» і салютам. Запрашаем усіх жыхароў Жодзіна і навакольных гарадоў на гэтыя маляўнічыя мерапрыемствы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

■ Масток праз стагоддзі

Ад Багуслаў Поля да сучаснасці

Жодзінскі краязнаўчы музей размешчаны ў старой частцы горада ў будынку, які быў пабудаваны для Савета дэпутатаў у 50-х гадах мінулага стагоддзя. Музей, мабыць, самы малады на Міншчыне. Афіцыйна ён адкрыты ў 2008 годзе. Аднак яго гісторыя пачалася значна раней, калі жодзінскія гісторыкі Алесь Каралёў і Галіна Аніскевіч прыадчынілі заслону таямніцы над гістарычным мінулым роднага горада. Тады атрымалася, што яго гісторыя пачынаецца значна раней 1963 года, калі Жодзіна атрымала статус горада абласнога падпарадкавання. Мала таго, Жодзіна — адзін з нямногіх гарадоў Беларусі, якія могуць ганарыцца тым, што іх заснавальнікамі быў магутны род князёў Радзівілаў. Нездарма на цяперашнім гербе горада намаляваны сімвал Радзівілаў — тры паляўнічыя ражкі.

У зале музея.

Пачалася гісторыя Жодзіна ў 1643 годзе, калі князем Багуславам Радзівілам быў пабудаваны горад паміж Смалявічамі і Барысавам, у месцы ўпадзення рэчкі Жодзінкі ў раку Плісу, на бойкім гандлёвым шляху, які злучаў Расію з Еўропай. І новы населены пункт атрымаў назву Багуслаў Поле — ад імя свайго заснавальніка.

Ён стваraўся як Miasto — горад рамеснікаў, якія былі вызвалены ад падаткаў на 25 гадоў. Ужо ў 1669 годзе тут было 97 двароў і 92 гандлёвыя лаўкі, што сведчыла аб яго росквіце. Аднак Паўночная вайна са шведамі прывяла да заняпаду. Вайна 1812 года з Напалеонам таксама закранула населены пункт. Стала забывацца нават назва Багуслаў Поле, і з 1781 года новая назва Жодзіна (ад ракі Жодзінкі) афіцыйна і назаўжды замацоўваецца за ім. Аб гэтым можна даведацца ў раздзеле адпаведнай экспазіцыі, якая распавядае пра рамесную дзейнасць, заснаванне і развіццё горада ў XVII—XVIII стагоддзях.

Падарожжа па музеі пачынаецца з глыбокай даўніны, ад засялення гэтай мясцовасці першабытным чалавекам. Экспазіцыя прадстаўлена археалагічнымі знаходкамі на тэрыторыі сучаснага Жодзіна і суседніх мясцін.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

■ З вопыту работы

«Гаючае чытанне» як сродак ад стрэсаў

У галоўнай зале гарадской бібліятэкі.

Цэнтральная гарадская бібліятэка горада Жодзіна сёлета святкуе 50-гадовы юбілей. Установа прыняла першых чытачоў у 1968-м, а ў 1983-м пераехала ў новае памяшканне на праспекце Міру. У цэнтральнай бібліятэцы налічваецца больш за 160 тыс. экзэмпляраў кніг, можна пачытаць артыкулы ў больш як 100 часопісах і 40 газетах. Бібліятэка цалкам аўтаматызаваная, мае 40 камп'ютараў. Інфармацыю можна атрымаць на электронных носьбітах, дысках, флэшках, аўдыякасетах.

Сёння бібліятэка — гэта асноўны інфармацыйны цэнтр адукацыйнай, асветніцкай дзейнасці, месца правядзення вольнага часу, дзе ўкараняюцца бібліяграфічныя распрацоўкі і інавацыйныя формы работы з насельніцтвам. Ва ўстанове пастаянна прыдумваюць нешта новае, літаральна фантануюць ідэямі. Вечары паэзіі, сустрэчы з пісьменнікамі, кніжныя кастынгі, краязнаўчыя віктарыны, літаратурныя квэсты, конкурсы бук-трэйлераў, летнія пляцоўкі, майстар-класы — пастаянныя формы работы з чытачамі. Актуальная для бібліятэкі і праектная дзейнасць. Цяпер ажыццяўляецца праект па прапагандзе творчасці беларускіх пісьменнікаў «Ведай нашых, чытай нашых!». У яго фармаце арганізавана некалькі выставак. «Лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі», дзе прадстаўлены творы, за якія аўтары яе атрымалі. «Мая беларуская кніжка», дзе канцэнтруецца ўвага чытача на жанравым шматгранні сучаснай беларускай літаратуры: раманы, аповесці, апавяданні, п'есы і вершы. На выстаўку «Залатое зерне творчай спадчыны» запрашаюць творы беларускіх класікаў-юбіляраў. Акрамя таго, арганізуюцца сустрэчы як са знакамітымі пісьменнікамі і паэтамі, так і з мясцовымі творчымі людзьмі.

У праекце «Гаючае чытанне» класіка паказана як універсальны сродак ад стрэсаў, неўрозаў, дэтэктывы і прыгодніцкая літаратура — ад псіхозаў, філасофская і духоўная літаратура — ад хранічных дэпрэсій. Казкі дапамагаюць пры гіперактыўнасці ў дзяцей, а гумар павышае настрой у рэабілітацыйны перыяд.

Даспадобы чытачам і праект «Чытаем каля каміна». Каля самаробнага каміна са звычайнага стэлажа стварылі ўтульны куточак з мяккім крэслам і падборкай літаратуры для чытання ў розныя поры года. Цяпер прапаноўваецца «Летняе чытанне», дзе шмат кніг пра шчаслівае каханне. Бо якое ж лета без кахання! Акрамя таго, прадстаўленая тут літаратура дазваляе павысіць інтэлектуальны ўзровень, выбраць шляхі далейшай адукацыі.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

— Мы прапануем нашым наведвальнікам шырокі выбар піцы, — зазначыла афіцыянт Марыя КОРШУНАВА.

■ Смачна есці!

КАФЭ ДОБРАГА НАСТРОЮ

28 верасня 2016 года, напярэдадні Дня машынабудаўніка, у Жодзіне адкрылася кафэ-піцэрыя «Pizza Smile». Для жыхароў горада гэта стала значнай і сімвалічнай падзеяй.

— Перш чым адкрыць піцэрыю, мы доўга аналізавалі, што трэба нашым будучым гасцям, улічвалі менталітэт жыхароў. І, зыходзячы з гэтага, выкрышталізавалі сукупнасць фактараў, якія павінны адыграць станоўчую ролю ў справе. Вызначылі, што ў новай установе харчавання павінны быць прадстаўлены ў комплексе інтэр'ер, сэрвіс і кухня. Літаральна праз паўгода мы атрымалі чаканы эфект. Але разам з тым убачылі і тое, над чым яшчэ трэба працаваць, што ўдасканальваць, — кажа **дырэктар кафэ-піцэрыі «Pizza Smile» Павел ТУЖЫЛКІН.**

Тым не менш на сённяшні дзень наведвальнікі задаволеныя тым, як падыходзіць да абслугоўвання персанал. А тут абслугоўваць імкнуцца так, як і неабходна ўстанове падобнага ўзроўню.

— Нам важныя не толькі станоўчыя водгукі гасцей, але і адмоўныя. Ёсць такія, што падмацаваныя аргументамі, але сустракаюцца і неабгрунтаваныя. Мы аналізуем усе заўвагі і імкнёмся зрабіць так, каб наведвальнік атрымаў максімум сэрвісу, увагі, станоўчых эмоцый, — кажа Павел Анатолевіч. — Для нас важны стан і настрой людзей, якія наведваюць кафэ-піцэрыю. Жодзіна — горад адносна невялікі. І мы разумеем, што гэта — нашы патэнцыйныя госці. Калі чалавек прыйшоў другі раз, значыць, яму спадабалася. У гэтым выпадку наша задача — зрабіць так, каб ён завітаў яшчэ раз і стаў у нас частым госцем.

Смачную прыгожую піцу гатуе Аксана КУЗНЯЦОВА.

Для гэтага рэгулярна абнаўляецца меню, з'яўляюцца кулінарныя навінкі. Толькі піц тут прапаноўваюць 26 найменняў. Госць можа пакаштаваць найсмачнейшыя стравы ад шэф-повара: салаты, гарачыя і халодныя закускі, сушы, шашлык, стравы японскай кухні, пасту, дранікі, блінцы з рознымі начынкамі. Летам вельмі добра асвяжаюць халодная кава, гарбата, прахаладжальныя напоі, а зімой саграваюць гарачыя напоі на травах, з дабаўленнем розных ягад і пладоў. Можна пакаштаваць таксама лекавыя настоі і гарбату.

Спажыўцы могуць заказаць столік загадзя, каб пасядзець сям'ёй, кампаніяй. На стравы, якія госці бяруць з сабой, дзейнічае зніжка 20 %. У кафэ-піцэрыі перыядычна ладзяцца акцыі.

— Хочацца, каб кожны госць разумеў, што мы на ім не імкнёмся зарабіць, а праяўляем лаяльнасць, стараемся, каб і людзі з невялікім дастаткам мелі магчымасць пакаштаваць і ацаніць меню, — кажа суразмоўнік.

У кафэ ніколі не выкарыстоўвалі паўфабрыкатаў, замарожанай прадукцыі. Гэта прынцыповая пазіцыя ўстановы, якой будуць прытрымлівацца і надалей. Усё, што прадстаўлена ў меню, робіцца пад заказ. У сувязі з чым павялічваецца час прыгатавання страў і іх выдачы. Не ўсе гэта разумеюць, многім хочацца атрымаць заказ як найхутчэй. А непаўторны смак піцы надае тое, што яна гатуецца ў печы на подавых камянях.

Інтэр'ер афармлены ў бэзавых тонах, што стварае спакойную атмасферу, падштурхоўвае да шчырай сяброўскай размовы. Настрою дадаюць жывыя кветкі, музыка. Да паслуг гасцей зручныя канапы, зона з крэсламі і барныя крэслы, тры тэлеэкраны.

Дзеці дашкольнага і школьнага ўзросту, падлеткі прыходзяць з бацькамі, дзядулямі і бабулямі. Так што кафэ набывае статус сямейнага.

У піцэрыі працуюць прафесійныя піцары, кухары, афіцыянты і бармены, якія прайшлі адпаведную падрыхтоўку. Цяпер яны і самі могуць навучаць тых, каго бяруць на работу.

— Пры падборы кадраў мы заўсёды робім стаўку не толькі на прафесіяналізм, але і на жаданне працаваць, — выказвае пазіцыю Павел Тужылкін. — Таму што ў грамадскім харчаванні такія спецыфіка і атмасфера, якія патрабуюць ад кожнага ўстойлівасці супраць стрэсаў. Наведвальнікі прыходзяць з розным настроем, здараецца, што і з негатыўным. Але работнік павінен праявіць разуменне і вытрымку, абслужыць чалавека найлепшым чынам. З улікам гэтых характарыстык і падбіраем кадры. Калектыў у асноўным малады. На сённяшні дзень ён стаў сапраўднай дружнай камандай.

Працуе кафэ-піцэрыя «Pizza Smile» штодня з 11.00 да 23.00 па адрасе: г. Жодзіна, вул. 50 гадоў Кастрычніка,18, гіпермаркет «Еўраопт». Смачна есці!

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У зале піцэрыі.

УНП 691717277

■ Класная гадзіна

ШКОЛА, ЯКАЯ СТАЛА ГІСТОРЫЯЙ,

або Пераемнасць пакаленняў, асаблівасці навучання і выхавання

Сярод найлепшых сёлетніх выпускнікоў — адзінаццацікласнікі Паліна ГЕРАСІМАВА і Аляксандр БАЧЫШЧА.

Кажуць, у гісторыю можна трапіць, у гісторыю можна ўліпнуць, а можна стаць гісторыяй. Сапраўды, гісторыя дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячы сад — сярэдняя школа № 1 імя П. І. Купрыянава» арганічна пераплялася з гісторыяй горада Жодзіна. Ёй 87 гадоў. За час свайго існавання яна зазнала шмат змен і пераўтварэнняў: школа-сямігодка, няпоўная сярэдняя школа, поўная сярэдняя школа, школа з класамі завочнага навучання. А з 2003-га стала комплекснай установай адукацыі.

— Больш як пяць тысяч юнакоў і дзяўчат яе выпускнікі. Больш за 130 вучняў закончылі школу з залатымі і сярэбранымі медалямі. Многія выхаванцы сталі паспяховымі людзьмі. У іх ліку Герой Савецкага Саюза Пётр Купрыянаў, доктар сельскагаспадарчых навук Уладзімір Іофэ, прафесар, кандыдат эканамічных навук Эдуард Пятровіч, акадэмік фізіка-матэматычных навук, вучоны ў галіне галаграфіі і біямедыцынскай оптыкі, акадэмік Міжнароднай інжынернай акадэміі Леанід Танін, доктар геаграфічных навук, дацэнт БДУ Барыс Уласаў, актрыса рускага драматычнага тэатра, кінаактрыса Вераніка Пляшкевіч і шмат іншых, — з гордасцю за сваіх землякоў паведаміла **дырэктар навучальнай установы Святлана ШАРАЯ.**

Установа адукацыі мае не толькі даўнішнія традыцыі, пераемнасць і повязь пакаленняў. З цягам часу з'яўляюцца новыя асаблівасці ў навучальным і выхаваўчым працэсах. Тут вучні атрымліваюць не толькі агульную сярэднюю адукацыю. Ёсць дзве групы дашкольнікаў. Заканамерна, што дзеці больш падрыхтаваныя да школы. Яны менш балюча ўспрымаюць перамены, больш лёгка ўліваюцца ў навучальны працэс у новых для іх умовах у адрозненне ад тых, хто прыходзіць з дзіцячых садкоў.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ПРЫЕМНА НЕ ТОЛЬКІ ПРАЦАВАЦЬ, АЛЕ І БЫЦЬ ПЕНСІЯНЕРАМ

Умовам працы, быту, адпачынку на Жодзінскай цеплаэлектрацэнтралі можна толькі пазайздросціць

Дырэктар ЦЭЦ Аляксандр МЫЦЬКО.

Філіял Жодзінскай цеплаэлектрацэнтралі сярод аналагічных прадпрыемстваў Мінскай вобласці ў сістэме рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі «Мінскэнерга» па выніках спаборніцтва штогод становіцца лідарам. Сёлета за першы квартал таксама не ўступілі першынства, атрымалі прэмію. «Але для калектыву важны не толькі матэрыяльны бок пытання, але і маральны аспект, — лічыць **дырэктар Аляксандр МЫЦЬКО.** — Прадпрыемства нармальна функцыянуе, людзі нядрэнна зарабляюць — сярэдняя зарплата большая за тысячу рублёў. У прынцыпе няма цякучасці кадраў, работнікі трымаюцца свайго месца.

ЦЭЦ калісьці будавалася для патрэб БелАЗа, швейнатрыкатажнай фабрыкі «Світанак», якія не толькі спажывалі электраэнергію, але і цяпло ў выглядзе пары і гарачай вады. На сённяшні дзень тэхналогіі змяніліся. Таму электрастанцыя мае запасныя цеплавыя магутнасці для горада.

— У нас распрацавана праграма па выкарыстанні мясцовых відаў паліва, устаноўлены кацёл па замяшчэнні газа іншымі рэсурсамі: драўнянымі шчэпкамі, здробненым торфабрыкетам, якія пастаўляюць лясгас, прадпрыемствы дрэваапрацоўкі. Гэта атрымліваецца нашмат танней. Напрыклад, за 2017 год за кошт замяшчэння газу сэканомілі 4882,3 тысячы рублёў. У сістэме Міністэрства энергетыкі доля нашага прадпрыемства па выкарыстанні мясцовых відаў паліва на ўзроўні 20—23 %. У Барысаве пабудавалі новую сучасную электрастанцыю, якая адпавядае еўрапейскім узорам. У планах інвестыцыйны праект — рэканструкцыя падстанцыі на 110 кВ, — дзеліцца планамі дырэктар.

На пульце кіравання ЦЭЦ.

Намеснік дырэктара ЦЭЦ Юрый РУДКОЎ.

Сэрца цеплаэлектрацэнтралі — цэнтральны шчыт кіравання. На маніторы камп'ютараў паступае ўся інфармацыя па рабоце цепласетак горада, у тым ліку і з Барысава. Пасля чаго даныя аналізуюцца і перадаюцца ў цэнтральную дыспетчарскую службу ў Мінск.

— Нашым кіраўніцтвам і гарвыканкамам зацверджаныя графікі рэжыму работы цепласетак. У ацяпляльны перыяд (у залежнасці ад тэмпературы вонкавага паветра) мы грэем ваду ў адпаведнасці з гэтым графікам, кантралюем, якой павінна быць тэмпература вады на выхадзе, колькі яе павінна вярнуцца назад і на якую колькасць трэба падсілкаваць сістэму. Калі расход вады павялічваецца, то шукаем прычыну. Магчыма, дзесьці адбыўся разрыў трубаправода, і тады на месца выязджае аварыйная брыгада, каб ліквідаваць непаладку. Пры неабходнасці, калі на вуліцы цёпла, нейкае абсталяванне адключаем наогул, іншае працуе не на поўную магутнасць, — расказаў **начальнік змены электрастанцыі Дзяніс НОВІКАЎ.**

Вахта на цэнтральным шчыце кіравання працягваецца 12 гадзін. Галоўны тут — начальнік змены электрастанцыі, як яго жартам называюць, начны дырэктар. Ноччу на прадпрыемстве нясуць вахту 25 чалавек: машыністы катлоў і турбін, электрыкі, хімікі, прыборысты, інжынеры па аўтаматызаваных сістэмах кіравання тэхналагічнымі працэсамі.

Ірына КРАСОЎСКАЯ, начальнік хімічнага цэха: «Гэта самастойнае структурнае падраздзяленне Жодзінскай ЦЭЦ. Асноўная наша задача — папаўненне пары і кандэнсату ў тракце і апрацоўка вады для падсілкоўкі цепласетак і катлоў. Вада, што цыркулюе ў сетцы для ацяплення, павінна быць адпаведнай якасці. У адваротным выпадку абсталяванне, што ўдзельнічае ў працэсе, дачасна прыйдзе ў непрыдатнасць».

Падсілкоўка — гэта не проста вада. Яе спецыяльна рыхтуюць, апрацоўваюць хімічнымі саставамі, каб трубы не ржавелі і не было адкладанняў.

У 2017 годзе на абслугоўванне Жодзінскай ЦЭЦ з сістэмы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі перададзены ўсе цеплавыя сеткі горада. Каб прывесці іх у належны стан, неабходныя вялікія ўкладанні. Сёння ўжо рыхтуюцца праекты. Нешта прадпрыемства робіць сваімі сіламі, прыцягвае таксама падрадныя арганізацыі. «Мы павінны не толькі выпрацаваць цяпло, але і падвесці яго да кожнага дома», — кажа кіраўнік.

Ладзяцца на прадпрыемстве не толькі вытворчыя справы, але і спартыўныя.

— Наша каманда пастаянна ўдзельнічае ў гарадской спартакіядзе, сёлета занялі першае месца ў групе В да 500 чалавек. Мы пастаянныя ўдзельнікі рэспубліканскай спартакіяды кіраўнічых работнікаў энергетыкі ў складзе каманды «Мінскэнерга», у 2015 годзе сталі першымі ў трохбор'і і плаванні, — дзеліцца **намеснік дырэктара філіяла Юрый РУДКОЎ.**

Ды і сам Юрый Ігаравіч добры спартсмен, у спаборніцтвах розных узроўняў паказвае выдатныя вынікі. Загартаваны фізічна і маральна.

На прадпрыемстве разумеюць, што для работнікаў неабходна ствараць добрыя ўмовы працы, быту, адпачынку. Толькі ў гэтым выпадку можна патрабаваць аддачу. На вытворчасці ўладкавалі душавыя, пакоі прыёму ежы, раздзявалкі. Шмат увагі тут удзяляюць сацыяльнай сферы.

У інтэрнаце калідорнага тыпу 1951 года пабудовы зрабілі выдатны рамонт. Акрамя таго, другі сучасны будынак інтэрната перапланавалі пад дом кватэрнага тыпу. Усе, хто мае патрэбу ў жыллі, забяспечваюцца жылой плошчай, у крайнім выпадку месцам.



Начальнік змены Дзяніс НОВІКАЎ і дзяжурны электраманцёр Раман ХАМЯНОК.

У медыцынскім пункце работнікі могуць атрымаць меддапамогу, неабходнае лячэнне, зрабіць прышчэпку. Гэта вельмі зручна, паколькі не трэба звяртацца ў гарадскую паліклініку па кожнай драбязе. **Фельчар Таццяна ТРЫПУЦЕНЬ** сцвярджае, што пункт забяспечаны ў дастатковай колькасці медыкаментамі. Ды і ў саміх цэхах шмат аптэчак, танометраў. Акрамя таго, Таццяна Іванаўна штодзень праводзіць медагляд 30 кіроўцаў перад выездам у рэйс, займаецца падрыхтоўкай санітарнай дружыны.

Таццяна АМЯЛЬЧУК — стаматолаг. Для лячэння зубоў у медпункце абсталяваны спецыяльны кабінет. Лячэнне платнае, прэйскурант цэн распрацоўвае «Мінскэнерга». Яны адзіныя як для работнікаў ЦЭЦ, так і для гараджан. Цэны цалкам даступныя, меншыя, чым у іншых месцах. Дарэчы, медустанова самаакупная.

На прадпрыемстве прыемна не толькі працаваць, але і быць пенсіянерам. Тут адной з першых у горадзе зарэгістравалі ветэранскую арганізацыю, дзе налічваецца 180 чалавек. Для пенсіянераў ладзяць разнастайныя экскурсіі, паездкі. Напрыклад, паказалі новую вытворчасць — Барысаўскую ЦЭЦ, звазілі ў музей Вялікай Айчыннай вайны.

Тыя ветэраны-пенсіянеры, што нідзе не працуюць, атрымліваюць штомесячную выплату. Фінансавую дапамогу да свят даюць тым, хто адпрацаваў на прадпрыемстве 10 і больш гадоў і пайшоў адсюль на заслужаны адпачынак. Даплаты прадугледжаны за дзяржаўныя ўзнагароды, падзякі і граматы Міністэрства энергетыкі.

Значную культурна-масавую работу вядзе прафсаюзная арганізацыя. Ганарацца на ЦЭЦ і пярвічнай арганізацыяй Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Клопатам, уплывам ахоплены ўсе ўзроставыя катэгорыі, у тым ліку і дзеці. За пуцёўкі ў летні аздараўленчы лагер бацькам, якія маюць адно дзіця, даплачваюць 15 % ад іх кошту. Бацькі, якія выхоўваюць дваіх дзяцей, атрымліваюць кампенсацыю на аднаго 15 %, другому пуцёўка выдзяляецца бясплатна. Дзецям з няпоўных, шматдзетных сем'яў кошт пуцёўкі цалкам кампенсуецца.

Прыемна, што на прадпрыемстве захавалі сталовую. **Загадчыца Ганна МАРЧАНКА** рада кожнаму наведвальніку.

— Зала разлічана на 44 пасадачныя месцы, харчуецца тут штодзень 100—120 чалавек, — расказвае Ганна Васілеўна. — Кошт абедаў ад 3 да 4 рублёў у залежнасці ад таго, што чалавек заказвае. У меню 8-9 найменняў салатаў, другіх страў, нават прысутнічаюць дыетычныя. Разлічваем кліентаў па наяўным, безнаяўным разліках, па ведамасці ў кошт зарплаты.

Дадам, што тэрыторыя ЦЭЦ добраўпарадкаваная, разбітыя кветнікі з рознымі кампазіцыямі. Нядаўна тут аб'явілі конкурс на самае лепшае афармленне клумбы сярод цэхаў. Ну і, вядома, кожны імкнуўся перамагчы, для чаго прыклаў шмат фантазіі і выдумкі.

Асабліва даспадобы работнікам месца каля фантана з зонай адпачынку. Тут устаноўлены лаўкі, выраблены ў сваёй сталярні, высаджаны дэкаратыўныя кусты, дрэвы, кветкі.

«І фарбуем аб'екты, і падмятаем, і ўпрыгожваем тэрыторыю сваімі рукамі. Усё гэта робіцца не дзеля птушачкі, а для нас саміх. І людзі з разуменнем ставяцца да гэтага. Няма такога, каб хтосьці выказаў незадаволенасць, што ўладкоўваўся не для таго, каб займацца іншай справай, — сцвярджае дырэктар.

Начальнік хімічнага цэха Ірына КРАСОЎСКАЯ і яе намеснік Юлія КАРАВАЙ.

УНП 100071593

■ Праблемы і рашэнні

АПЕРАТЫЎНА РЭАГАВАЦЬ НА НАДЗВЫЧАЙНЫЯ ЗДАРЭННІ,

або Якія новыя формы работы за апошні год ўкараніла «ЖодзінаЖылЦеплаСэрвіс»

Дэмантаж старых балконаў і пабудова новых — справа, якая патрабуе высокай кваліфікацыі работнікаў.

Восенню мінулага года ў горадзе Жодзіне рэфармавалі жыллёва-камунальную гаспадарку. Гарадское ўнітарнае прадпрыемства ЖКГ перадало функцыі тэхнічнага абслугоўвання гарадскому даччынаму ўнітарнаму прадпрыемству «ЖодзінаЖылЦеплаСэрвіс». З 1 студзеня 2017 года апошняе выконвае падрадныя работы па абслугоўванні гарадскога жыллёвага фонду, бягучы і капітальны рамонт.

— Раней мы галоўным чынам займаліся эксплуатацыяй гарадскіх цепласетак, у тым ліку магістральных і ў прыватным сектары. Цяпер гэтыя камунікацыі перададзены на баланс філіяла Жодзінскай ЦЭЦ, — расказвае **дырэктар прадпрыемства Віктар ЧАЛЕЙ.** — Акрамя таго, мы вялі і капітальны рамонт сетак, пракладвалі новыя ўласнымі сіламі. Шмат зрабілі па мінімізацыі парываў на трубах у прыватным сектары, правялі дэцэнтралізацыю і больш як 30 кіламетраў камунікацый перавялі на газ. Калі мы толькі пачалі займацца гэтай справай, у нас была падсілкоўка сетак вадой на ўзроўні 120—150 тон у гадзіну. А стала 25—27 тон. Значна скараціліся страты цеплавых носьбітаў — з 17 % практычна да 10 %. Іх расход цалкам адпавядаў тым нарматывам, якія нам даводзілі. Прычым апошнія тры гады па горадзе ў нас складваўся станоўчы энергетычны баланс. Калектыў добра працаваў, выраслa заработная плата. Гэта дало магчымасць прыцягнуць кваліфікаваных спецыялістаў, майстроў, зваршчыкаў, інжынерны і тэхнічны персанал.

Ужо другі год, як прадпрыемства займаецца эксплуатацыяй жылога фонду. Вядома, праблем тут хапае. Але, як кажуць, вочы баяцца, а рукі робяць. Да ідэалу ў гэтай сферы, вядома, яшчэ далёка. Ды першыя зрухі ўжо адчуваюцца. Прадпрыемства атрымала сертыфікаты адпаведнасці на ўсе будаўнічыя работы па дахах, будынках, збудаваннях, канструкцыях. Створаны ўчастак па капітальным рамонце будынкаў, цепласантэхнічная, аварыйна-дыспетчарская службы, куды паступаюць усе заяўкі . На кожным пад'ездзе жылога дома змешчаны таблічкі з указаннем нумароў апошняй. У службе працуюць кадры высокай кваліфікацыі, пачынаючы з сантэхнікаў, слесараў і заканчваючы майстрамі, інжынерамі.

Дырэктар Віктар ЧАЛЕЙ.

— Мы памянялі ўсіх ранейшых майстроў на тых, хто больш кампетэнтна займаецца гэтай вытворчасцю, — канстатуе Віктар Уладзіміравіч.

Спецыялісты таксама выязджаюць для ліквідацыі аварый у прыватным, кааператыўным сектарах. Выправілі непаладку, зрабілі калькуляцыю і выставілі спажыўчу рахунак. Вядома, не ўсе людзі задаволеныя такім падыходам, чакаючы, што ім зробяць усё бясплатна. «Але мы тлумачым, што ўсякі выезд цягне за сабой расходы на запраўку транспарту, зарплату работнікам. Расцэнкі за розныя віды работ мы надрукуем у раённай газеце, каб у людзей не ўзнікала пытанняў», — кажа Віктар Чалей.

— Што датычыцца капітальнага рамонту, то кожную вясну мы вывучаем стан жылых дамоў, складаем дэфектныя акты, — працягвае Віктар Уладзіміравіч. — Калі дом ставіцца на капітальны рамонт, мяняем не толькі дах, але і энергасеткі, і разводкі ў падвалах. Тое ж самае датычыцца і стаякоў, электратэхнічнага абсталявання.

На вуліцы Ціміразева, 11 у чатырохпавярховым доме на тры пад'езды цяпер ідзе замена 36 балконаў. «На выніках абследавання яны былі прызнаны аварыйнымі, абвальваліся, што стварала небяспеку для жыхароў, — канстатуе **начальнік участка капітальнага рамонту жылога фонду Анатоль ДАМАШКЕВІЧ.** — Таму праектам прадугледжаны іх дэмантаж без адсялення людзей.

Фасады гэтых будынкаў фарбавалі работнікі прадпрыемства.

Унізе ўладкоўваецца фундамент пад кожны шэраг балконаў. На іх будзе ўсталёўвацца металаканструкцыя ў выглядзе этажэркі з профільных труб 100 на 100 міліметраў, на якія ўмацоўваюцца пліты і балконы. Акрамя таго, будуць адрамантаваны і пафарбаваны фасад дома, уваходная група, памяняецца адмостка. Затым пройдзе добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі.

— Перад пачаткам капрамонту мы ладзім сустрэчы з насельніцтвам, тлумачым парадак яго правядзення, у якія тэрміны ён будзе закончаны, даём кантакты адказнай за яго асобы, — уступае ў размову **начальнік бюро па рабоце з насельніцтвам і ідэалагічнай рабоце Наталля ТОЛМАЧ.** — З жыхарамі гэтага дома не ўзнікла праблем, усе паставіліся да справы з разуменнем і пагадзіліся прыбраць дэкаратыўныя кусты, кветкі, якія перашкаджалі работам.

— Асноўная праблема для нас у тым, што старыя каналізацыйныя сеткі часта выходзяць са строю, — кажа кіраўнік, — затапляюцца кватэры. Гэта нашы прамыя страты. Таму заключылі дагавор з Белдзяржстрахам. У замене зношаных цепласетак нас фінансава падтрымлівае гарвыканкам. За мінулы год праклалі пяць кіламетраў унутраных камунікацый, уключаючы каналізацыю, водаправод, гарачае водазабеспячэнне.

Такога маштабнага рамонту раней яшчэ не было. У выніку падсілкоўка вадой зменшылася з 20 да 12 працэнтаў. «Гэта заслуга ўсяго калектыву, — лічыць Віктар Чалей. — Пастаўлена задача, каб працяканні ва ўсіх падвальных памяшканнях ліквідаваліся на працягу сутак. Там, дзе замянілі стаякі, старыя трубы на новыя, праблема знятая. Але гэта толькі 10 % ад усяго жылога фонду».

Нельга не сказаць і пра тое, што «ЖылЦеплаСэрвіс» зрабіў немалы ўнёсак у падрыхтоўку да 55-гадовага юбілею горада. Канцэпцыя, што была зацверджана, практычна рэалізаваная. Зрабілі цалкам афарбоўку фасадаў дамоў па вуліцах Ракасоўскага, Леніна, на праспектах 40 гадоў Кастрычніка, Міру, памянялі агароджу балконаў, лоджый. Дадаткова на ўездзе ў горад з'явяцца тры вялікія вазы для жывых кветак.

На прадпрыемстве наладзілі вытворчасць металаканструкцый: лавак, малых архітэктурных формаў, фігурак, агароджы. Заказваюць гэтую прадукцыю як арганізацыі, так і прыватныя асобы. Прычым разлічыцца можна не адразу, а ўзяць растэрміноўку плацяжу. На ўчастку мастацкіх вырабаў працуе чацвёра творчых хлопцаў, сапраўдных мастакоў. У кожны выраб яны ўкладваюць фантазію, душу. Напрыклад, на алеі ліхтароў на праспекце Міру «ЖодзінаЖылЦеплаСэрвіс» уладкавала крэсла з прарэзам для манет і надпісам «Кінь манетку — загадай жаданне». На фоне гэтага аб'екта гараджане і госці любяць фатаграфавацца і кідаць капейкі. Усе сабраныя грошы перадаюцца Жодзінскаму тэрытарыяльнаму цэнтру сацыяльнай дапамогі на дабрачыннасць. Цяпер у горадзе ствараецца алея крэатыўных лавак. Ну, і вядома, тут будзе ўладкавана лаўка прадпрыемства, якая, дарэчы, з сюрпрызам: свеціцца ў цемнаце.

— У нас ненармаваны рабочы дзень, аварыйная брыгада пастаянна гатовая выехаць на месца аварыі: і раніцай, і вечарам, і ноччу. Увесь цыкл адпрацаваны. На дапамогу ім прыходзяць і іншыя службы. Такая сістэма апраўдвае сябе, дазваляе аператыўна рэагаваць на надзвычайныя здарэнні, — канстатуе дырэктар.

КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ

На прадпрыемстве наладжана работа па падрыхтоўцы і навучанні кадраў. А лозунг «Кадры вырашаюць усё», як паказвае час, не састарэў. Электратэхнічную службу ўзначальвае Генадзь Маеўскі з вышэйшай адукацыяй. Анастасія Фядотава — інжынер вытворча-тэхнічнага ўчастка. Дзяўчыне прапаноўвалі іншую работу, але яна адмовілася, маўляў, мне тут усё падабаецца, дружны калектыў. Галоўны інжынер Юрый Сталбунік закончыў Горацкую сельгасакадэмію. На прадпрыемстве ў асноўным свае, дамарошчаныя кадры. Таму кіраўніцтва добра ведае здольнасці кожнага і які ўчастак работы каму даручыць.

Мантажнікі Сяргей БЕРАСНЯКОЎ і Мікалай ШЭМЕТАВЕЦ аглядаюць абсталяванне ў жылым доме.

З УВАГАЙ ДА ЗВАРОТАЎ ГРАМАДЗЯН



Наталля ТОЛМАЧ кіруе бюро па рабоце з насельніцтвам.

У выніку перамен да лепшага зменшылася колькасць скаргаў ад грамадзян.

— За першы квартал, напрыклад, паступленне пісьмовых зваротаў менавіта ў адрас прадпрыемства і ў вышэйстаячыя арганізацыі знізілася на 14,5 %. Па кожным звароце мы ўважліва працуем, — расказвае **Наталля ТОЛМАЧ.** — У нас заяўкамі грамадзян, а таксама даручэннямі, што паступаюць з Жодзінскага гарвыканкама, гарсавета, ЖКІ Мінскай вобласці, Мінаблвыканкама, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Адміністрацыі Прэзідэнта займаюцца два інспектары. Надзея Слабуха — маладая, але вельмі прафесійны і адказны спецыяліст, атрымлівае ўдзячнасці ад людзей за ўважлівыя адносіны да іх патрэб, кваліфікаваныя кансультацыі. Пасля таго, як былі ліквідаваны тры ЖЭУ, усе функцыі па рабоце са зваротамі грамадзян перайшлі да нас. У нас цяпер атрымліваецца кантактны цэнтр, паколькі мы яшчэ і кансультуем жыхароў. А працуе тут тры чалавекі замест шасці, як раней. Звароты, якія прыйшлі не па адрасе, у пяцідзённы тэрмін мы накіроўваем у адпаведныя арганізацыі. Калі патрэбна дадатковае вывучэнне пытання, то разам са спецыялістамі выязджаем на месца і на працягу месяца даём адказ. Нам паступаюць таксама пытанні, якія датычацца работы нашай службы, з прамых тэлефонных ліній вышэйстаячых арганізацый. Разглядаем іх, даём адказ заяўнікам, аб выніках разгляду інфармуем гарвыканкам. Добрая падмога ў нашай працы — сістэма міжведамаснага электроннага кантролю, якую нядаўна ўкаранілі.

У майстэрні прадпрыемства мы ўбачылі такую незвычайную лаўку.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 69086450

НАЙЧЫСЦЕЙШАЯ ВАДА З СЭРЦА ЗЯМЛІ

ЧАМУ ЖОДЗІНСКІ ВОДАКАНАЛ ЛІЧЫЦЦА АДНЫМ З НАЙЛЕПШЫХ У РЭГІЁНЕ?

Сімвал КУП «Жодзінскі водаканал» — тры кроплі, замкнёныя ў кола. Сіняя абазначае ваду, чырвоная — каналізацыю, зялёная — сувязь з прыродай, а ўсе разам яны сімвалізуюць кругаварот вады ў прыродзе. Прыгожая эмблема толькі падкрэслівае значнасць задач, якія даводзіцца вырашаць прадпрыемству вось ужо практычна 30 гадоў. Пабываўшы тут, пачынаеш як ніколі востра адчуваць, што вада — гэта жыццё!

САЦЫЯЛЬНЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ: ДЫСТАНЦЫЙНЫЯ ЛІЧЫЛЬНІКІ

Дырэктар КУП «Жодзінскі водаканал» Георгій ЧАРАДНІК некалькі гадоў таму атрымаў званне «Чалавек года Міншчыны».

Юбілей з дня свайго заснавання прадпрыемства адзначыць 1 верасня. Гэтая дата значная і асабіста для **дырэктара КУП «Жодзінскі водаканал» Георгія ЧАРАДНІКА**, бо ён нязменна ўзначальвае яго ўвесь гэты перыяд. Пры непасрэдным удзеле кіраўніка адбылося станаўленне і развіццё водаканала. Спачатку, каб не набіваць уласных шышак, аб'ездзілі ўсю рэспубліку і блізкае замежжа — павучыцца ў больш дасведчаных калег. Цесна супрацоўнічаць з іншымі прадпрыемствамі працягваюць і зараз, але ўсё часцей у ролі экспертаў.

Дарэчы, прадпрыемства было створана не на пустым месцы: яно было выдзелена са структуры БелАЗа, пазней свае ўчасткі перадалі новай структуры і іншыя фабрыкі і заводы маладога горада. Зараз Жодзінскі водаканал абслугоўвае больш за 400 арганізацый, а таксама ўвесь жылы фонд. Горад расце, а значыць, расце і попыт на камунальныя паслугі. Калі ў самым пачатку на прадпрыемстве працавала 107 чалавек, то цяпер іх ужо 215. І, як прызнаецца дырэктар, нягледзячы на ўсе сучасныя тэхналогіі, менавіта вопытныя спецыялісты і згуртаваны калектыў — залог паспяховай работы.

Цяпер у КУП «Жодзінскі водаканал» дзве асноўныя мэты — эканомія энергарэсурсаў і вады. Калі водаправодны ўчастак ужо на 85—90 % мадэрнізавалі, то на каналізацыйным праца толькі пачынаецца — замяняюцца помпы і іншае абсталяванне, каб насычэнне кіслародам сцёкавых вод было менш энергаёмістым. Што датычыцца эканоміі вады, то ўсе сілы кінутыя на тое, каб працягвала зніжацца колькасць працёкаў у трубаправодзе. Але, як запэўнівае дырэктар, у горадзе і зараз добра ведаюць, што супрацоўнікі водаканала да сваіх абавязкаў падыходзяць з максімальнай адказнасцю: ніколі не спыняць работу, пакуль усе непаладкі цалкам не будуць ліквідаваны.

Яшчэ адзін важны напрамак работы прадпрыемства, якому ў апошнія гады аддаецца асаблівая ўвага — установка і паверка лічыльнікаў вады. Зараз імі забяспечаны практычна ўвесь горад. Але планы ў прадпрыемства яшчэ больш амбіцыйныя: у будучыні здымаць паказанні лічыльнікаў дыстанцыйна. Так, у мінулым годзе водаканал забяспечыў такімі прыборамі 36-кватэрны пад'езд. Розніца ў кошце паміж лічыльнікамі нязначная, затое перавагі аўтаматычнага відавочныя: ён больш дакладны, абсалютна ніяк нельга паўплываць на яго паказанні. Акрамя таго, калі ўвесці іх масава, можна істотна сэканоміць працоўныя рэсурсы. Адзінае, што пакуль спыняе шырокамаштабнасць гэтага праекта, — недасканаласць заканадаўчай базы.

Строгі і рэгулярны кантроль за якасцю вады вядзе хіміка-бактэрыялагічная лабараторыя. На фота: інжынер-лабарант Дзяніс ЛАЗЮТА.

«БЕЗ МАДЭРНІЗАЦЫІ ЖЫЦЦЁ СПЫНЯЕЦЦА»

Не менш важнай задачай, чым забяспячэнне ўсяго горада чыстай вадой, з'яўляецца і ачышчэнне гарадскіх сцёкаў. На ачышчальных працуе каля 40 чалавек, прычым, як і на водазаборы, праца тут вядзецца кругласутачна ўвесь тыдзень. Па словах **інжынера-тэхнолага Ліліі ЗЫЛЬ,** спачатку вада каля чатырох гадзін насычаецца кіслародам. Раней выкарыстоўвалася механічная эксперыментальная ачыстка, цяпер — біялагічная, з дапамогай мікраарганізмаў. Дзеля паляпшэння паказчыкаў прымяняюцца новыя віды фільтраў. Жанчына падкрэслівае, што прадпрыемства ва ўсім імкнецца ісці ў нагу з часам, бо без мадэрнізацыі жыццё спыняецца. Кожную гадзіну інжынер-тэхнолаг правярае ваду спецыяльным прыборам — кіслародамерам. Калі яго ўзровень дасягае неабходнай адзнакі, вада трапляе ў буферныя біясажалкі, там праходзіць тры каскады, дзе канчаткова чысціцца. Далей яна паступае ў раку Рову, адкуль ужо ў Бярэзіну.

Электрык Віктар ШЛОМА, брыгадзір слесараў-рамонтнікаў Мікалай ГАПАНОВІЧ, зваршчык Аляксандр МЫСЛЯВЕЦ і інжынер-тэхнолаг Лілія ЗЫЛЬ на ачышчальных збудаваннях.

Спякота — даволі складаны час для такіх работ: кісларод горш растваряецца ў вадзе, але спецыялісты робяць усё магчымае, каб на якасці гэта ніяк не адбівалася. Жодзінскія ачышчальныя збудаванні ў прынцыпе адны з найлепшых у гэтай мясцовасці, параўнацца з імі могуць хіба што Барысаўскія. Штодзень тут апрацоўваецца каля 20 тысяч кубаметраў вады, але магутнасці дазваляюць апрацоўваць і 30 тысяч.

Яшчэ адзін значны аб'ект у структуры КУП «Жодзінскі водаканал» — рамонтна-эксплуатацыйны ўчастак. Менавіта тут часцей за ўсё праходзяць працоўныя планёркі. Калі 30 гадоў таму прадпрыемства пачынала з сямі адзінак тэхнікі, то цяпер іх ужо каля шасці дзясяткаў: ад экскаватараў і самазвалаў да каналапрамывачнай машыны, якая да гэтага часу нават у вобласці сустракаецца досыць рэдка. Акрамя непасрэднага абслугоўвання задач водаканала, спецыяльная тэхніка выкарыстоўваецца і для вырашэння задач насельніцтва па заяўным прынцыпе на камерцыйнай аснове. Так, у прадпрыемства, напрыклад, ёсць чатыры спецыяльныя машыны для вывазу вадкіх сцёкаў.

Як паведаміў **начальнік рамонтна-эксплуатацыйнага ўчастка Генадзь ЗАБАЎСКІ,** на тэрыторыі ўчастка можна адпачыць і заняцца спортам: ёсць выдатная спартыўная зала, свой більярд. Супрацоўнікі нярэдка імі карыстаюцца пасля работы, каб аднавіць сілы. Дарэчы, на будынку рамонтна-эксплуатацыйнага ўчастка некалькі гадоў таму таксама ўсталявалі сонечныя батарэі, энергія якіх ідзе на падагрэў вады.

Начальнік рамонтна-эксплуатацыйнага ўчастка Генадзь ЗАБАЎСКІ абмяркоўвае з аўтаслесарам Паўлам БУСЬКО і кіроўцам пагрузчыка Аляксандрам ПАРХОМЕНКАМ бягучы рамонт аўтатранспарту.

Намеснік дырэктара Святаслаў ЛЕМЦЮГОЎ і вядучы эканаміст Наталля ПАШКОВА.

Па выніках працы за мінулы год КУП «Жодзінскі водаканал» прызнана найлепшай арганізацыяй горада ў сферы сувязі, бытавога абслугоўвання, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і транспарту. Гэтая ўзнагарода — не асаблівая веха ў гісторыі прадпрыемства, а, хутчэй, доказ эфектыўнасці яго штодзённай працы. Бо высокую ацэнку яно атрымлівае кожны год.

Па словах **намесніка дырэктара Святаслава ЛЕМЦЮГОВА**, зараз у Жодзіне засталося толькі дзве водаразборныя калонкі, уся астатняя тэрыторыя горада абсталявана цэнтральным водаправодам. Калі некалькі гадоў таму насельніцтва зніжала аб'ёмы спажывання з-за таго, што тарыфы паступова раслі, то цяпер, дзякуючы масаваму ўсталяванню лічыльнікаў уліку вады, удалося дасягнуць аптымальнай канстанты. Тым больш што для забеспячэння добрай якасці вады робіцца ўсё магчымае. Так, напрыклад, два разы на год па ўзгадненні з гарадскімі ўладамі ажыццяўляецца поўнае прамываннe трубаправода, каб праходжанне праз водапровад ніяк не адбівалася на высокім узроўні якасці жодзінскай вады.

ПОЎНЫ КАНТРОЛЬ З АДНАГО ПУНКТА

Падчас экскурсіі па аб'ектах прадпрыемства накіроўваемся ў святая святых — водазабор «Паўночны», які забяспечвае чыстай водаправоднай вадой усё Жодзіна. Ён знаходзіцца на адлегласці ад горада ў лесе, па перыметры якога раскідана 25 свідравін глыбінёй каля 100 метраў. Усе яны герметычна зачыненыя, а сама тэрыторыя старанна ахоўваецца.

Назіраць за тым, што адбываецца на кожнай са свідравін, можна дыстанцыйна. Акрамя таго, аўтаматызацыя дае своечасова кантраляваць уключэнне абсталявання і падачу вады. Вопытныя спецыялісты ўспамінаюць, што раней, каб адключыць свідравіну, дзяжурны садзіўся ў спецыяльную тэхніку пад назвай «мурашка» і спускаўся ўнутр. Цяпер жа гэта можна зрабіць седзячы ва ўтульным кабінеце. Адтуль жа можна назіраць, які ўзровень вады і тэмпература ў кожнай са свідравін, колькі з іх працуе, у якім рэжыме, ці ёсць страты. Акрамя гэтага, можна ўбачыць і што адбываецца на ППС — павышальных помпавых станцыях. Усяго іх у горадзе 22, і патрэбныя яны для таго, каб падымаць ваду ў будынкі вышэй за пяты паверх. На любы збой спецыялісты рэагуюць у лічаныя хвіліны. Па справядлівасці можна сцвярджаць, што сістэма знаходзіцца пад поўным кантролем.

Як расказаў **майстар водазабора «Паўночны» Дзмітрый КРАСНЯКОЎ**, штодня ў горад паступае каля 17 тысяч кубічных метраў вады. Пампуюць яе адначасова ў сярэднім з 8 свідравін, якія пастаянна чаргуюцца. Акрамя таго, на тэрыторыі водазабора знаходзіцца чатыры рэзервуары агульным аб'ёмам 9 тысяч кубоў — менавіта такі запас вады павінны быць, каб не здаралася перабояў у пікавыя гадзіны: раніцай, пасля 5-й вечара, у перадсвяточныя дні. У гэтыя рэзервуары вада спецыяльна запампоўваецца ноччу.

— Гораду Жодзіна вельмі пашанцавала з размяшчэннем. Вада з нетраў паступае ўжо адпаведная ўсім стандартам, яна не патрабуе дадатковай апрацоўкі, як у многіх іншых рэгіёнах. У нас смела можна піць ваду з-пад крана, — адзначае Дзмітрый Краснякоў.

Каб і надалей якасць вады адпавядала яе добрай славе, праводзіцца дасканалы кантроль яе складу. Лабараторыя знаходзіцца на самым водазаборы, акрамя таго, увесь час бяруцца пробы непасрэдна з-пад кранаў.

Ужо восем гадоў Жодзінскі водаканал буцілірує пітную ваду. На лініі разліву працуюць Таццяна, Ганна і Арцём ЛЕАНОВІЧЫ.

— Мы правяраем ваду больш чым па 30 паказчыках. Балазе, сучаснае абсталяванне дазваляе зрабіць гэта дакладна і досыць хутка. Большасць апаратаў злучаныя з камп'ютарам, таму вынік адразу выводзіцца на экран, — расказвае **інжынер-лабарант Дзяніс ЛАЗЮТА**. Маладога чалавека ведаюць на прадпрыемстве не толькі па добрай працы, але і дзякуючы шматлікім перамогам на шашачных і шахматных турнірах, на якіх ён прадстаўляе водаканал.

Тут жа на водазборы знаходзіцца і лінія разліву артэзіянскай вады. Вада, якая разліваецца ў бутэлькі, паступае з асобных свідравін. Да таго ж яе не закранае працягласць водаправода, таму яна захоўвае ўсе самыя лепшыя якасці. Выпускаецца пад дзвюма маркамі: «Жодзінская» — аб'ёмам 5 і 19 літраў — і Crysterna Sport — 0,5 і 0,75 літра. У сярэднім тут разліваюць 3-5 кубічных метраў вады ў суткі. Як расказаў **тэхнолаг водаправоднага ўчастка Віктар ЛІТВІНЕНКА,** асноўны заказчык — буйныя прадпрыемствы і ўстановы, прычым не толькі з Жодзіна, але і з Мінска, Смалявічаў, Барысава і іншых рэгіёнаў. Дарэчы, у прадпрыемства ёсць сертыфікат міжнароднага ўзору: сваю прадукцыю яно мае права прадаваць на тэрыторыі ўсяго Еўразійскага эканамічнага саюза.

На гэтым цікавыя рэчы на водазаборы на заканчваюцца. Клапоцяцца тут і аб экалогіі, і аб эканоміі энергарэсурсаў. Ужо каля 15 гадоў таму на даху аднаго з будынкаў тут усталявалі сонечныя батарэі. І, як прызнаюцца на прадпрыемстве, яны ўжо даўно сябе акупілі.

На дыспетчарскім пункце водазабора «Паўночны» цяпер маніторы паказваюць «самаадчуванне» любога ўчастка і работу яго абсталявання. За пультам — машыніст помпавых установак Генадзь КЛІМОВІЧ.

Дар'я КАСКО,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

УНП 600038947

Школа, якая стала гісторыяй...

Заняткі па англійскай мове ў лінгафонным кабінеце.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Школьнае навучанне ніколі не пачынаецца з пустога месца, а заўсёды абапіраецца на пэўную стадыю развіцця, якую прайшло дзіця. І тут вельмі важна правільна арганізаваць навучанне і выхаванне малых у дашкольнай установе. Ад таго, што будзе адчуваць дзіця, паднімаючыся на першую прыступку лесвіцы пазнання, залежыць яго далейшы шлях да ведаў. Школа не павінна ўносіць рэзкага пералому ў жыццё малых. Няхай, стаўшы вучнем, яны працягваюць рабіць сёння тое, што рабілі ўчора. Няхай новае з'яўляецца ў іх жыцці паступова і не ашаламляе лавінай уражанняў, — лічыць Святлана Яўгенаўна.

У 1957 годзе школе прысвоена імя Героя Савецкага Саюза Пятра Купрыянава, а ў 1977-м тут створаны музей баявой славы, у якім, дарэчы, экскурсіі праводзяць самі вучні. Гэтыя абставіны і вызначылі прыярытэт патрыятычнага выхавання. Дзеці займаюцца пошукавай работай, удзельнічаюць у розных мерапрыемствах: акцыях, вахтах памяці, турыстычных паходах і падарожжах па гістарычных і культурных мясцінах Беларусі. Школьнікі дапамагаюць ветэранам вайны і працы, наведваюць іх дома, віншуюць са святамі, выконваюць гаспадарчыя справы. Усё гэта ў сукупнасці выхоўвае сапраўднае пачуццё патрыятызму на канкрэтных прыкладах, дае станоўчы эфект.

— Наша ўстанова невялікая. Кожнае дзіця навідавоку, кожнаму педагогі могуць удзяліць максімум увагі, знайсці індывідуальны падыход. Па паводзінах, настроі можна ўбачыць, што хвалюе выхаванца, разгаварыць яго, супакоіць. Акрамя таго, калі ў школе менш вучняў, то практычна ўсе яны ахоплены рознымі гурткамі па інтарэсах, секцыямі, развіваюцца і маральна, і фізічна, і эстэтычна. Адносна невялікая колькасць выхаванцаў дазваляе таксама часцей сустракацца з іх бацькамі. З мамамі і татамі наладжана вельмі цесная сувязь, — кажа дырэктар.

Нягледзячы на тое, што ўстанове 87 гадоў, па вонкавым выглядзе не скажаш: выдатны рамонт, у кожным класе лакальная сетка, тэлевізар, камп'ютары, кабінеты ўладкаваны па апошнім слове тэхнікі.

Адзін з філосафаў сказаў: «Пасрэдны настаўнік выкладае. Добры настаўнік тлумачыць. Выдатны настаўнік паказвае. Вялікі настаўнік натхняе». У школе пачыналі педагагічную дзейнасць больш як 130 настаўнікаў. Тут бераражліва захоўваюць іх фотаздымкі, успаміны пра іх. Ва ўстанове цяпер працуюць 29 педагогаў, у тым ліку 24 з вышэйшай адукацыяй. Дастаткова высокі іх кваліфікацыйны ўзровень: 24 % з вышэйшай катэгорыяй, 31 % з першай, 7 % з другой, а ў маладых спецыялістаў усё яшчэ наперадзе.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Побач з будынкам школы — помнік Герою Савецкага Саюза Пятру Купрыянаву.

Ад Багуслаў Поля да сучаснасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У 1871 годзе праз Жодзіна была пракладзена чыгунка, якая дала штуршок для эканамічнага развіцця мястэчка. У экспазіцыі таксама адноўлены сялянскі куток XIX стагоддзя і куток простага жыхара міжваеннага перыяду 1920—1930-х гадоў.

Асноўны музейны фонд налічвае больш за 10 тысяч прадметаў. Па крупінцы ў музеі сабрана гісторыя станаўлення і развіцця горада — ад старажытнейшых часоў да сённяшняга дня. Усе асноўныя вехі і падзеі, якія прайшлі праз Жодзіна. Зацікавіць наведвальнікаў матэрыялы і ўспаміны пра знакамітых землякоў. Надзвычай цікавы «Кабінет вучонага». Экспазіцыя распавядае пра жыццё і дзейнасць доктара ветэрынарных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР Сяргея Пляшчанкі.

— Доўгі час Сяргей Іванавіч працаваў у Жодзінскім навукова-даследчым інстытуце жывёлагадоўлі, быў заснавальнікам такой галіны навукі, як гігіена свойскіх жывёл, — распавядае **галоўны захавальнік фондаў музея Сяргей ВІЗНЕР.** — Пачатак яго работы супаў з пераходам на прамысловую аснову галіны жывёлагадоўлі. Ставілася задача павышаць надоі, павялічваць агульную колькасць сельскагаспадарчай жывёлы. Шматлікія вынаходніцтвы Сяргея Пляшчанкі ў галіне жывёлагадоўлі запатэнтаваны і імі карыстаюцца да гэтага часу. Пасля яго смерці сын Аляксандр Сяргеевіч Пляшчанка перадаў музею асабістыя рэчы бацькі: узнагароды, дыпломы, навуковыя працы, мантыю, працоўны стол, мэблю, партрэты прафесара і яго жонкі Галіны. Гэты шыкоўны падарунак дазволіў стварыць абстаноўку савецкага часу, у якой працаваў вучоны.

Адна з музейных экспазіцый расказвае пра знакамітага і бясстрашнага беларускага альпініста Віктара Кульбачэнку.

— Ён нарадзіўся 27 красавіка 1962 года ў Светлагорску. Затым яго бацькі пераехалі ў Жодзіна. Тут прайшлі яго дзяцінства, школьныя гады, — расказаў Сяргей Аляксеевіч. — Кульбачэнку называлі «снежным барсам», пакорыў ён пакарыў пяць горных сямітысячнікаў: Пік Леніна, Пік Перамогі, Пік Камунізму, Пік Каржанеўскай, Пік Хан-Тэнгры.

Ён быў першым у гісторыі беларусам, які 18 мая 1998 года падняўся на самую высокую гару планеты — Эверэст, за што атрымаў падзяку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У 2006 годзе спартсмен прыняў удзел у падняцці на гару Чагары — другую вяршыню свету. Але яна засталася непакоранай з-за сходу снежнай лавіны, якая пахавала пад сабой чатырох альпіністаў. Віктар Кульбачэнка цудам выжыў. Альпініст трагічна загінуў у 2007 годзе на падводнай рыбалцы ў Падмаскоўі.

Калекцыю старажытных самавараў прадстаўляе дырэктар музея Алена НАЦЯЖКА.

Цэлая зала прысвечана прыродзе Жодзіна і яго ваколіц. У экспазіцыі прадстаўлены больш за сотню таксідэрмічных скульптур работы Генадзя Пузанкевіча — сапраўднага майстра сваёй справы. У межах экскурсіі наведвальнікі могуць даведацца пра малавядомыя факты з жыцця братоў нашых меншых.

Музей мае як гістарычную, так і мастацкую накіраванасць. З верасня 2014 года ён аб'яднаў пад сваім крылом Гарадскую выставачную залу. У Вялікай выставачнай зале дэманструюцца работы прафесійных мастакоў, у Малой — дзіцячыя і аматарскія творы. Штомесяц выстаўкі абнаўляюцца. Яшчэ раней, у 2008 годзе, у склад краязнаўчага музея ўвайшоў Дом-музей Настассі Фамінічны Купрыянавай — адзіны мемарыяльны музей у Беларусі, прысвечаны канкрэтнай маці як асобе. Тут можна даведацца аб трагічным лёсе простай беларускай жанчыны, якая праводзіла на фронт чатырох сыноў. Тры з іх загінулі, чацвёрты памёр ад ран пасля вайны. Самы малодшы з іх, Пётр Купрыянаў, падчас баёў у Латвіі ў 1944 годзе закрыў сваім целам амбразуру нямецкага дзота. За гэта ён пасмяротна ўдастоены найвышэйшай узнагароды СССР — звання Героя Савецкага Саюза. Ён адзіны жодзінец, якому было прысвоена гэта званне.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Гаючае чытанне» як сродак ад стрэсаў

Бібліятэкар першай катэгорыі Ірына ХІЛЮЦІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цікавяць чытачоў кнігі пра выжыванне ў экстрэмальных абставінах, бо менавіта летам часцей за ўсё людзі падчас адпачынку за мяжой, на прыродзе аказваюцца ў няпростых сітуацыях. А кнігі паспяховых айчынных пісьменнікаў даюць магчымасць у любую пару года знаёміцца з літаратурнымі навінкамі.

Апошнія інавацыйныя распрацоўкі бібліятэкараў — гэта тэатр ценяў «Святло і цені» і «Лесвіца ведаў». Абсталяванне для тэатра ценяў зроблена супрацоўнікамі бібліятэкі са старога стэлажа, героі пастановак выразаны з чорнай паперы, замацавана лямпа. Калі ў зале знікае святло, на экране пачынаецца чароўнае дзейства.

Праект «Лесвіца ведаў» атрымаўся дзякуючы крэатыўнаму падыходу з выкарыстаннем вінтавой лесвіцы, што існуе ў бібліятэцы. Штомесяц тут папулярызуецца якаясьці галіна ведаў: псіхалогія, этыка, медыцына, педагогіка, культура ды іншыя.

Летась галоўная артэрыя горада — праспект Міру — стала яшчэ і алеяй ліхтароў, дзе бібліятэкары таксама арганізавалі свае летнія інфармацыйныя пляцоўкі. Тут яны прапануюць гараджанам майстар-класы па вырабе паштовак, вясёлыя загадкі на лагічнае мысленне, краязнаўчыя віктарыны, складанне пазлаў з краявідамі знакамітых жодзінскіх мясцін, аквагрым і шмат чаго іншага.

Бібліятэка нямала ўвагі ўдзяляе выпуску бібліяграфічнай прадукцыі. Толькі за апошні час падрыхтавана і выдадзена пяць бібліяграфічных спісаў: «І застаўся ты ў нашых душах» да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага. «Мастак адкрытага свету» — да 100-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля. «Сын Палесся» — да 95-годдзя з дня нараджэння Івана Мележа. «Пісьменнік-сатырык» — да 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы. «Чарнобыль: не гасне памяці свечка» — да 30-годдзя катастрофы на станцыі.

Бібліяграфічныя спісы дапаўняюць выпускі шматлікіх інфармацыйных буклетаў, лістовак, закладак і іншае.

Нядаўна на базе ўстановы прайшло выязное пасяджэнне V Форуму бібліятэкараў Беларусі. Гэта сведчыць аб тым, што вопыт работы Цэнтральнай гарадской бібліятэкі горада Жодзіна багаты і на сённяшні дзень запатрабаваны ў калег.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

31 декабря 2017 года

Организация	ООО «Страховой брокер Финанс Сервис»
Учетный номер плательщика	806000643
Вид экономической деятельности	66220
Организационно-правовая форма	Общество с ограниченной ответственностью
Орган управления	Директор
Единица измерения	тыс. руб.
Адрес	г. Минск, ул. Кижеватова, д. 7/2, пом. 3

Активы	Код строки	На 31 декабря 2017 года	На 31 декабря 2016 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	-	-
Нематериальные активы	120	-	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	82
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**-**	**82**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	-	1
В том числе:			
материалы	211	-	1
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	-	-
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	60	47
Краткосрочные финансовые вложения	260	17	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	74	52
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**151**	**100**
БАЛАНС	**300**	**151**	**182**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2017 года	На 31 декабря 2016 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	40	40
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	-	-
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	55	39
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**95**	**79**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	56	103
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	54	102
по авансам полученным	632	1	-
по налогам и сборам	633	1	1
по социальному страхованию и обеспечению	634	-	-
по оплате труда	635	-	-
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	-	-
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**56**	**103**
БАЛАНС	**700**	**151**	**182**

ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь—декабрь 2017 года

Наименование показателей	Код строки	За январь—декабрь 2017 года	За январь—декабрь 2016 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	289	267
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	-	-
Валовая прибыль (010 – 020)	030	289	267
Управленческие расходы	040	(276)	(237)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	13	30
Прочие доходы по текущей деятельности	070	-	-
Прочие расходы по текущей деятельности	080	-	-
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	13	30
Доходы по инвестиционной деятельности	100	-	-
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	-	-
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	-
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	11	18
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	11	18
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(4)	(7)
В том числе:			
проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(4)	(7)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-

Наименование показателей	Код строки	За январь—декабрь 2017 года	За январь—декабрь 2016 года
1	2	3	4
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130)	140	7	11
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	20	41
Налог на прибыль	160	(4)	(2)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200)	210	16	39
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	16	39
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

ООО «Аудитфинансервис»
ул. Воронянского, 50, корп. 5, пом. i7ка6.зой, 220007, г. Минск
Тел./факс (017) 298 53 79, 298 53 69 e-mail: auditfin2010@mail.ru
р/счет BY58TECN30121283600010000000 в ОАО «Технобанк», BHKTECNBY22
ул. Кропоткина, 44, г. Минск УНП 191318798 ОКПО 379412985000

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской (финансовой) отчетности ООО «Страховой брокер Финанс Сервис»
за период с 01.01.2017 по 31.12.2017

Руководителю ООО «Страховой брокер Финанс Сервис»
Пастарнак О. В.

Аудиторское мнение

Общество с ограниченной ответственностью «Страховой брокер Финанс Сервис»

Юридический адрес: 220024 г. Минск, ул. Кижеватова, д. 7/2, пом. 3

Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством финансов Республики Беларусь 23.03.2015 г., в ЕГР РБ за № 806000643, свидетельство № 0000047.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ООО «Страховой брокер Финанс Сервис», состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2017 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств, а также примечаний к бухгалтерской (финансовой) отчетности.

По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская (финансовая) отчетность ООО «Страховой брокер Финанс Сервис» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Страховой брокер Финанс Сервис» на 31.12.2017 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ООО «Страховой брокер Финанс Сервис» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Основания для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности, предусмотренные законодательством Республики Беларусь, более подробно рассматриваются в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской (финансовой) отчетности» настоящего заключения.

Мы соблюдали принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства Республики Беларусь и нормы профессиональной этики.

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

Ключевые вопросы аудита

В результате проведенного аудита мы определили, что ключевые вопросы аудита, информацию о которых необходимо сообщить в аудиторском заключении, отсутствуют.

Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке бухгалтерской (финансовой) отчетности

Руководство ООО «Страховой брокер Финанс Сервис» несет ответственность за подготовку и достоверное представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, организацию системы внутреннего контроля, необходимой для подготовки отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий и (или) ошибок, за оценку способности продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности при подготовке бухгалтерской отчетности, а также за надлежащее раскрытие в бухгалтерской отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности.

Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской (финансовой) отчетности

Цель нашего аудита состоит в получении разумной уверенности в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и составлении аудиторского заключения, содержащего мнение.

Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения.

Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей бухгалтерской (финансовой) отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита.

Кроме того, мы выполняем следующее:

выявляем и оцениваем риски существенного искажения отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики, а также обоснованность учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в бухгалтерской отчетности;

оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в бухгалтерской отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, мы должны модифицировать наше мнение. Наши выводы основаны на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

оцениваем общее представление бухгалтерской (финансовой) отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли бухгалтерская отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Также мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и доведена до их сведения информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности. Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении, кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия.

Прочие вопросы

Бухгалтерская (финансовая) отчетность аудируемого лица за период с 1 января по 31 декабря 2016 года включительно была проверена аудиторской организацией ООО «Аудитфинансервис».

Директор
ООО «Аудитфинансервис» **А. К. Сазонов**

Аудитор **Г.И. Калинкина**

Общество с ограниченной ответственностью «Аудитфинансервис»
220007, г. Минск, ул. Воронянского, д. 50, корп. 5, пом. 17, комн. 3016.
Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191318798 решением Минского горисполкома от 07.09.2010

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания многофункционального здания г. Смолевичи, ул. Жодинская, строительства и обслуживания автостоянки и гаража-бокса для хранения автомашин в районе дер. Волма, Драчковский сельсовет, для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома в аг. Слобода Озерицко-Слободского сельсовета ул. Машерова, для строительства и обслуживания торгового павильона дер. Рудомейка Озерицко-Слободского сельсовета

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 24.07.2018 г. в 15.00
3	Продавец и его адрес	г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	Лот № 1 – площадь 0,1867 га, кадастровый номер 624850100001001021 г. Смолевичи, ул. Жодинская Лот №2 — площадь 0,5700 га, кадастровый номер 624883800000300009 в районе дер. Волма, Драчковский сельсовет Лот № 3 – площадь 0,4196 га, кадастровый номер 624883009601000862, аг. Слобода, ул. Машерова, Озерицко-Слободской сельсовет Лот № 4 – площадь 0,0851 га, кадастровый номер 624883008601000100 дер. Рудомейка, Озерицко-Слободской сельсовет
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Лот № 1 – для строительства и обслуживания многофункционального здания (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли) Лот № 2 – для строительства и обслуживания автостоянки и гаража-бокса для хранения автомашин (1 12 02 земельный участок для размещения объектов автомобильного транспорта) Лот № 3 – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома (1 09 01 земельный участок для размещения объектов многоквартирной жилой застройки) Лот № 4 – для строительства и обслуживания торгового павильона (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли)
7	Сроки аренды	Лот № 1 – 99 лет Лот № 2 – 50 лет Лот № 3 – 99 лет Лот № 4 – 99 лет
8	Начальная стартовая цена	Лот № 1 – 65 000 рублей Лот № 2 – 81 000 рублей Лот № 3 – 350 000 рублей Лот № 4 – 15 000 рублей
9	Условия аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица; В) при проектировании и строительстве учесть регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом; Г) получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства, разрешение Смолевичского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта; восстановить границы земельного участка за счет средств победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона; Лот № 3 – безвозмездная передача в собственность Смолевичского райисполкома 7 % общей площади жилых помещений в многоквартирном жилом доме (п. 1.5 решения Миноблисполкома от 14 ноября 2014 г. № 978); Д) без права предоставления рассрочки
10	Наличие инженерной инфраструктуры	Лот № 3 – возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, теплоснабжению, централизованному водоотведению, наличие асфальтированного подъезда
11	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона
12	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной стартовой цены на р/с BY98 AKBB36410000006696200000, БИК AKBBBY21612 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиала 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, пр-т Революции, 47 УНП 600014139, ОКПО 04064735 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
13	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком	Каждый четверг с 9.00-12.00

Расходы по организации и проведению аукциона: (лот № 1 – 1 781 р. 36 к., лот № 2 – 809 р. 10 к., лот № 4 – 2 115 р. 81 к.), затраты на публикацию и размещение в сети Интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 119.

Окончательный срок приема заявлений – 18.07.2018 г. 17.00.

Контактный телефон (8-01776) 2-73-42.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

Лот 1: автомобиль «Ауди А4», 1996 г.в., гос. № 9542 АК-4 (тип кузова – седан, двигатель дизельный 1896 см куб., 81кВт/110 л.с, трансмиссия – автоматическая, № кузова WAUZZ8DZTA317465)

Начальная цена продажи – 5 640 р. (пять тысяч шестьсот сорок рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 564 р. (пятьсот шестьдесят четыре рубля)

Лот 2: автомобиль «Опель Фронтера», 2001 г.в., гос. № 5838 ВЕ-4 (тип кузова – легковой джип, двигатель дизельный 2171 см куб., 85кВт/115 л.с, трансмиссия – механическая, № кузова W0L06BG761V502143)

Начальная цена продажи – 8 880 р. (восемь тысяч восемьсот восемьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 888 р. (восемьсот восемьдесят восемь рублей)

Продавец – ЗАО «Гудевичи», 231626, Мостовский р-н, д. Гудевичи, ул. Мира, 4, тел. 8-01515-38716

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 45-05-38, 41-98-32

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 24 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республ

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 22 (418)

■ Кінакрокі

ВЫХАД У ЛЮДЗІ

Беларускія фільмы ўвайшлі ў конкурсы міжнародных кінафестываляў

Парадак дня іх прынёс нашай кінасферы адразу дзве прыемныя навіны. Ігравыя поўнаметражныя карціны «Хрусталь» Дар'і Жук і «Заўтра» Юліі Шатун павінны паўдзельнічаюць у конкурсах Міжнароднага кінафестывалю ў Карлавых Варах і Міжнароднага кінафестывалю ў Марселі адпаведна. Адметна, што навіны гэтыя носяць для Беларусі крыху экзатычны характар і што абодва фільмы не маюць дачынення да дзяржаўнага фінансавання. Таму іх удзел у фестывальных конкурсах нейкім чынам сігналізуе, за якім кіно — будучыня беларускага кінематографа і што будучыня гэтая шматабяцальная.


«Заўтра» Юліі Шатун.

Фільм Юліі Шатун «Заўтра» на мінулым мінскім кінафестывалі «Лістапад» стаў галоўнай беларускай сенсацыяй. Па-першае, ён быў адабраны ў конкурс «Маладосць на маршы», чаго з айчыннымі фільмамі дагэтуль не здаралася, а па-другое, паказаў сапраўды выдатны прыклад бюджэтнай, але прадуманай, кінематаграфічнай, асэнсаванай карціны. Шмат спрэчак выклікала перамога фільма Юліі Шатун у Нацыянальным конкурсе і хваля пашаны ў яго бок. Пакуль адны бачылі на экране дарэчны мастацкі вобраз рэчаіснасці правінцыйнага беларускага горада, нехта не мог змірыцца з яго тэхнічнай «простасцю» і бюджэтнасцю. Адасобленасць «Заўтра» ад вялікай кінаіндустрыі сапраўды стала для некага каменем спатыкнення, фільм нават удастоіўся намёку ў тым ліку на сябе ў спічы міністра культуры.

Тым не менш карціна Юліі Шатун аказалася ў спісе найлепшага, што наша кінасфера прапанавала за апошнія гады. Яна паказала пралічаны вобраз маленькага беларускага горада, дзе жывуць звычайныя муж з жонкай, сын якіх вучыцца ў Мінску. Былы выкладчык англійскай мовы раскідвае лістоўкі па паштовых скрынях, вячэрае рэдзенькім супам, дорыць жонцы на свята шпалеры, бярэ куртку для сына ў растэрміноўку, падчас візіту ў Мінск эканоміць на метро. Вельмі халодны ў перанасным сэнсе фільм паказвае, як звычайная сям'я інтэлігентаў мусіць канцэнтравацца на бытавых пытаннях, страчвае камунікацыю паміж сабой і па сутнасці, канешне, не жыве, а выжывае.

У Марселі «Заўтра», дарэчы, у пашыранай версіі, паўдзельнічае адразу ў трох конкурсах — Міжнародным, Конкурсе дэбютных фільмаў і Конкурсе асацыяцыі французскіх кінатэатраў GNCR.

Пра «Хрусталь» мы пакуль ведаем мала, бо на вялікім экране ў Беларусі фільм не паказваўся. Затое мы ведаем Дар'ю Жук — беларуску, якая скончыла Гарвардскі і Калумбійскі ўніверсітэты і сёння жыве ў ЗША. Ужо доўгі час яе кароткаметражка «Сапраўдная амерыканка» займае топавае месца сярод беларускага кароткага метра — яна расказвае пра дзяўчыну, што прыехала па абмене ў амерыканскую сям'ю і прынесла ў яе пэўны дух бунтарства.

«Хрусталь» таксама датычыцца гэтага «моста» паміж постсавецкай моладдзю і амерыканскімі магчымасцямі. Карціна расказвае, як маладая дзяўчына робіць памылку ў візе, рызыкуе страціць сваю амерыканскую мару і вымушана затрымацца ў правінцыйным індустрыяльным гарадку. Фільм паказвае «маладзёжныя падпольныя рэйвы, стыхійныя рынкі, мары маладых людзей пра эміграцыю і жыццё правінцыі, што застыла ў часе».

«Хрусталь» здымаўся ў нашай краіне пры ўдзеле кінакампаніі Беларусі, ЗША, Германіі і Расіі. На фестывалі ў Карлавых Варах ён адкрые і паўдзельнічае ў конкурсе «Ад Усходу да Захаду». Дарэчы, апошнім ігравым беларускім фільмам у праграме чэшскага форуму была «Акупацыя. Містэрыі» Андрэя Кудзіненкі 2004 года.

«Хрусталь» Дар'і Жук.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

■ Перспектыва

ЯК МОГ ВЫГЛЯДАЦЬ МІНСК,

ведае беларускі архіў, дзе замежнікі вывучаюць савецкую архітэктуру

Як забудоўваліся Мінск ці Жодзіна, як пуста было ў Мірскім замку, якім быў план латвійскага горада Люцын у 1748 годзе, фотаздымкі Барыса Кіта з Васілём Быкавым, Пятра Машэрава з архітэктарамі, Аляксандра Рубанава з Уладзімірам Кавалёнкам, фізікаў і лірыкаў — амаль дзвесце тысяч адзінак захоўвання знаходзіцца ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі. У маі архіў, які даволі непрыкметна адлюстроўвае ў тым ліку грамадскі, ідэалагічны і культурны кантэксты, адзначыў сваё пяцідзесяцігоддзе. Днямі адкрыўся адноўлены стадыён «Дынама», рэканструкцыя якога не адбылася б без праектнай інфармацыі, што складае аснову фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД) і з'яўляецца асноўным дапаможнікам па гісторыі архітэктуры Беларусі. Мы сустрэліся з загадчыкам аддзела інфармацыі і выкарыстання дакументаў архіва Святаславам КУЛІНКОМ і распыталі, што яшчэ каштоўнага змяшчаюць у сабе фонды.

— Азначэнне «архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі» гучыць крыху пратакольна, так і не скажаш, што ён, як у вас напісана, «адлюстроўвае развіццё навукі, архітэктуры і культуры». Растлумачце, якое дачыненне ваш архіў мае да такіх глабальных паняццяў?

— Стварэнне архіва ў 1968 годзе было вельмі своечасовым, таму што дазволіла паставіць на ўлік, захаваць і ў выніку выкарыстаць агромністы корпус вельмі спецыфічнай, менавіта навукова-тэхнічнай дакументацыі. Гэта праектная дакументацыя, якая адлюстроўвае горадабудаўніцтва, азеляненне, праекты найбольш значных будынкаў не толькі Мінска, але і ўсёй краіны. Дом урада, Тэатр оперы і балета, Акадэмія навук, Нацыянальная бібліятэка, як старая так і новая, помнікі архітэктуры накшталт Мірскага і Нясвіжскага замкаў, культавае дойлідства, прадстаўленае касцёламі і цэрквамі, — дакументы на ўсе гэтыя аб'екты захоўваюцца ў нас і складаюць, напэўна, найбольш важную частку нацыянальнага архіўнага фонду, звязанага з архітэктурай. Апроч гэтага, наш архіў уключае ў сябе навукова-даследчыя распрацоўкі, патэнтную і канструктарскую дакументацыю, прадстаўленую беларускімі брэндамі накшталт МАЗа, БелАЗа, МТЗ. Тут можна знайсці эскізы і чарцяжы нашых першых аўтамабіляў.

— Наколькі я ведаю, не апошняе месца ў архіве займаюць дакументы асабістага паходжання.

— Гэта ўнікальная частка архіўнага фонду рэспублікі ўвогуле — асабістыя дакументы народных архітэктараў СССР Георгія Заборскага, Уладзіміра Караля, Іосіфа Лангбарда і іншых. Яны цікавыя ў тым ліку вялікім пластом нерэалізаваных праектаў, якія ўдзельнічалі ў архітэктурных конкурсах, але па нейкіх прычынах не прайшлі адбор. На іх цікава ўбачыць, якім бы мог быць Мінск.

— Гэтыя асабістыя фонды — што яны з сябе ўвогуле ўяўляюць?

— Сюды могуць уваходзіць пасведчанні аб нараджэнні, дыпломы, граматы, узнагароды, розныя аўтабіяграфічныя даведкі. Калі гаворка пра архітэктараў, — эскізныя праекты, успаміны аб працы, дзённікі, перапіска, фотаздымкі, што апроч работы адлюстроўваюць сямейнае жыццё, вандроўкі, наведванне нейкіх форумаў і мерапрыемстваў. У фондзе Сяргея Філімонава захоўваюцца малюнкі, якія архітэктар рабіў падчас падарожжа ў Кіеў і Львоў у 1950-х гадах. Гэта вельмі цікавіць нашых калег з Украіны, бо на малюнках адлюстраваны пэўныя архітэктурныя формы. Каштоўным для нас з'яўляецца фотаздымак Барыса Кіта з Васілём Быкавым. Калі закрануць сферу навукі, у фондзе вядомага фізіка Аляксандра Рубанава, які стаяў каля вытокаў сусветнай галаграфіі, ёсць фотаздымак з касманаўтам Уладзімірам Кавалёнкам. Ёсць агульны фотаздымак Пятра Машэрава з беларускімі архітэктарамі, якія з поля бою падчас Вялікай Айчыннай вайны былі выкліканы ў Цэнтральны штаб партызанскага руху ў Маскву. Альбо фота, на якім самыя выдатныя беларускія архітэктары ў 1946 годзе дакладваюць пра генеральны план аднаўлення і развіцця Мінска Панцеляймону Панамарэнку, рашэнне якога дазволіла гораду ў прынцыпе быць.

— Зразумела, што архіў — гэта не рэч у сабе. Для чаго ў асноўным выкарыстоўваюцца дакументы з вашых фондаў?

— Відавочна, захоўванне дзеля самога захоўвання бессэнсоўнае, дакументы павінны жыць, а жывуць яны толькі тады, калі некім выкарыстоўваюцца альбо публікуюцца. Па-першае, спецыфіка нашага фонду ў яго ўжытковым характары. Сёння ні адно даследаванне, рэканструкцыя альбо рамонт найбольш важных аб'ектаў не адбываецца без звароту ў наш архіў.

— Рэстаўрацыя, напрыклад, Мірскага замка таксама базавалася на вашых дакументах?

— Так, супрацоўнікі замкавага комплексу прыехалі да нас і адабралі вельмі шмат дакументацыі, там былі і цікавыя фотаздымкі, дзе замак у стане запусцення... Толькі што завершанае аднаўленне стадыёна «Дынама» таксама адбылося дзякуючы захаваным у нашым архіве дакументам. Мы і самі працуем над выхадам нашых фондаў у свет, праводзім выстаўкі, удзельнічаем у канферэнцыях: напрыклад, да 950-годдзя Мінска мы паказалі той самы генеральны план аднаўлення і развіцця горада 1946 года. Пасля вайны Мінск быў разбураны настолькі, што стаяла пытанне, адбудоўваць яго альбо ствараць новы горад побач. Шмат у чым гэты генеральны план вызначыў, што, па-першае, Мінску — быць, а па-другое, якім яму быць. Сталіца, якой мы бачым яе сёння, — прыгожая, прасторная, зялёная, — шмат у чым была закладзена ў генеральным плане. Апроч таго, што належыць гісторыі Беларусі, у нашым архіве захоўваецца шмат дакументаў па гісторыі навукі, архітэктуры і тэхнікі больш чым дваццаці краін, у тым ліку такіх экзатычных, як Манголія.

Беларускія архітэктары на чале з Уладзімірам Каралём прадстаўляюць генеральны план узнаўлення і развіцця Мінска.

— Як яны трапілі ў вашы фонды?

— У савецкі час тут існавала шмат навукова-даследчых і праектных інстытутаў, якія працавалі не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і па ўсім Савецкім Саюзе, а таксама ў дружалюбных Савецкаму Саюзу краінах. У выніку засталося шмат дакументаў, найбольшая колькасць датычыцца, канешне, Расіі і Украіны. Значная частка засталася ў асабістых фондах, таму што нашы архітэктары ўдзельнічалі ва ўсесаюзных конкурсах, якія праводзіліся для праектаў збудаванняў у іншых дзяржавах. Напрыклад, у фондзе Іосіфа Лангбарда захоўваецца вялікі аб'ём яго конкурсных праектаў Санкт-Пецярбургскіх пабудоў. Ён жа ўдзельнічаў у конкурсе на стварэнне помніка Хрыстафору Калумбу ў Дамініканскай Рэспубліцы. Тут можна знайсці і дакументы па перспектыве цэнтральнай забудовы Кіева 1930—1940-х гадоў: частка з праектаў была ўхвалена, то-бок бачанне архітэктара Лангбарда знайшло рэальнае адлюстраванне на вуліцах украінскай сталіцы.


Эскізы 1970-х гадоў комплексу жылых дамоў і гандлёвага цэнтра на вуліцы Няміга.

— Вы казалі, што разам з генеральным планам аднаўлення і развіцця Мінска існавалі праекты, што прадстаўлялі іншыя варыянты аблічча горада.

— Генеральны план быў адзіным, для дапамогі беларускім калегам тады прыехала вялікая група найзнакаміцейшых савецкіх архітэктараў — Аляксей Шчусеў, Мікалай Колі, Уладзімір Сямёнаў. Але існавала шмат варыянтаў забудовы Цэнтральнай плошчы і Савецкай вуліцы. У нас захоўваецца каля дваццаці конкурсных праектаў розных аўтараў, і эскізы паказваюць, як усё гэта магло б выглядаць.


Варыянт забудовы цэнтральнай часткі Мінска.

— У вас пазначана, што 2835 дакументаў з вашага архіва — асабліва каштоўныя. Што гэта за дакументы?

— Яны раскіданы па розных фондах, у тым ліку па асабістых, — гэта перапіска, фотаздымкі і найбольш каштоўныя праекты, напрыклад Галоўпаштамта альбо палаца Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі. Гадоў пяць таму, што цікава, мы атрымалі на захоўванне праект будынка Нацыянальнай бібліятэкі, хоць звычайна такія рэчы перадаюцца праз дваццаць пяць гадоў з моманту пабудовы. Увогуле статус дакументаў, наколькі яны могуць лічыцца асабліва каштоўнымі, вызначае спецыяльная экспертна-метадычная камісія.

— Атрымліваецца, ні адно сур'ёзнае даследаванне па архітэктуры краіны не можа абысціся без вашага архіва. Наколькі часта ім карыстаюцца з даследчыцкімі мэтамі?

— Пастаянна, прычым ідзе тэндэнцыя на павелічэнне. Апошнія пяць-шэсць гадоў вельмі актыўна сталі працаваць карыстальнікі з замежжа. На Захадзе зараз модна вывучаць усё, што датычыцца савецкага перыяду, у тым ліку архітэктуру. Да нас прыязджае шмат даследчыкаў з Францыі, Германіі, Вялікабрытаніі, Чэхіі. Адзін, памятаю, займаўся вывучэннем дамоў урада ў розных постсавецкіх рэспубліках. Нехта цікавіўся тыпавым будаўніцтвам і яго асаблівасцямі.

— Ваш архіў уключае ў сябе дакументы з 1748 года...

— Самыя раннія дакументы — план горада Люцына на сённяшняй тэрыторыі Латвіі, план горада Веліжа і план Дынабургскага фарштата. Гэтыя дакументы датычацца небеларускіх тэрыторый, але яны адзінкавыя, унікальныя. З цікавага яшчэ планы губернскага горада Мінска пачатку XX стагоддзя, гэта калі казаць ужо пра перыяд Расійскай Імперыі. Тут асаблівую цікавасць уяўляюць назвы вуліц горада. На жаль, асноўная маса дакументаў адносіцца да паслявоеннага часу, але ўсё яшчэ найбольш цікавыя з іх захоўваюцца ў асабістых фондах, напрыклад, у фондзе Барыса Кіта — тут і яго маладосць у Беларусі, і перыяд эміграцыі.

— А за кошт чаго архіў сёння папаўняецца?

— Ёсць спіс арганізацый, якія з'яўляюцца крыніцай камплектавання, — гэта праектныя і навукова-даследчыя інстытуты, канструктарскія арганізацыі, прамысловыя прадпрыемствы. Кожны год яны здаюць нам пэўную колькасць дакументацыі. Асобную групу складае кіраўніцкая дакументацыя, якая адлюстроўвае працэс жыццядзейнасці арганізацыі.

— Вельмі актыўна архіў сёння ўключыўся ў падрыхтоўку да 2020 года, калі будзе адзначацца 75-годдзе Перамогі. Што рыхтуецца?

Аналагічная гісторыя здарылася і з перагаворамі аб уступленні Македоніі ў Еўрасаюз. Эканамічнае становішча самой Грэцыі не ідэальнае, і прадстаўнікі міжнародных структур не раз намякалі Афінам на тое, што трэба быць больш падатлівымі. Пад ціскам эмісараў ЕС і НАТА грэкі пагадзіліся пайсці на некаторыя саступкі, але ад галоўнага не адмовіліся — назву «Рэспубліка Македонія» неабходна скарэктаваць.

Цяпер самай папулярнай партыяй краіны застаецца «Унутраная македонская рэвалюцыйная арганізацыя — Дэмакратычная партыя за македонскае нацыянальнае адзінства» (УМРА-ДПМНА)». Менавіта ў яе ўваходзіць прэзідэнт Георге Іваноў. Пазіцыя партыі — ніякіх саступак у назве краіны, паколькі яны падрываюць яе дзяржаўнасць.

«Рэвалюцыянеры» мяркуюць, што пад брэндам «дзяржавы Аляксандра Македонскага» прасцей аб'ядноўваць прадстаўнікоў розных народаў і змагацца з сепаратызмам.

Македонія не па чутках ведае, што такое сепаратызм. Эканамічная бязладзіца ў гэтай рэспубліцы прывяла да росту міжэтнічнай напружанасці. Каля 25 працэнтаў насельніцтва Македоніі — албанцы. Албанская абшчына з кожным годам усё гучней патрабуе незалежнасці, адмаўляючыся падпарадкоўвацца цэнтральнаму ўраду і абвінавачваючы Скоп'е ў славянскім нацыяналізме. У пачатку 2000-х у краіне ледзь не быў рэалізаваны «косаўскі сцэнарый». Узброеныя албанскія радыкалы пачалі баявыя дзеянні супраць урадавых сіл, і ў нейкі момант падавалася, што распаду краіны пазбегнуць не ўдасца.

Дзень Ілі

Аднак у канцы мінулага года Скоп'е і Афіны раптам надумалі вырашыць праблему. Да таго ж чым хутчэй — тым лепш. Па выніках снежаньскай сустрэчы прадстаўнікоў дзвюх краін у Бруселі спецпасланнік генеральнага сакратара ААН Мэцью Німіц заявіў, што вырашыць застарэлую спрэчку можна менш чым за паўгода. Прэм'ер-міністр Македоніі Зоран Заеў паабяцаў правесці рэферэндум, на якім будзе прынятая новая назва краіны. Македонскія СМІ тады прыводзілі мноства магчымых варыянтаў: Рэспубліка Новая Македонія, Рэспубліка Паўночная Македонія, Рэспубліка Верхняя Македонія і Вардарская Рэспубліка Македонія.

А сёлета ў канцы мая македонскі ўрад заявіў: Скоп'е і Афіны ўшчыльную падышлі да вырашэння спрэчкі. Рэспубліка Іліндэнская Македонія — «назва з часавым вызначальнікам, якая спасылаецца на канкрэтныя даты з мінулага і задавальняе македонскі і грэчаскі бакі», гаварылася ў паведамленні Кабміна. Па словах Заева, рэспубліка спадзявалася вырашыць спрэчку з Грэцыяй да чэрвеньскага саміту ЕС. «Для Македоніі членства ў еўрапейскай сям'і азначае эканамічны рост, спалучанасць і роўныя магчымасці для маладых людзей у Македоніі і іх аднагодкаў у ЕС», — сказаў прэм'ер-міністр краіны — кандыдата на ўступленне ў Еўрапейскі саюз.

Але адкуль пайшла назва? Справа ў тым, што адно з самых галоўных дзяржаўных свят Македоніі — Дзень Рэспублікі, або Іліндэн («Дзень Ілі»), — адзначаецца 2 жніўня. У гэты дзень македонцы згадваюць дзве гістарычныя падзеі. Па-першае, пачатак Іліндэнскага паўстання. Яно пачалося ў горадзе Крушава ў ноч на 2 жніўня 1903 года — больш за 800 вайскоўцаў вызвалілі горад ад турэцкага прыгнёту, а Нікола Караў абвясціў незалежнасць Крушаўскай Рэспублікі і стаў яе старшынёй. Праз дзесяць дзён незалежнасці 18-тысячнае войска Асманскай Імперыі зноў заняло горад, а да верасня ўсё паўстанне было жорстка задушана. Таксама Іліндэн атаясамляецца з правядзеннем у 1944 годзе антыфашысцкага сходу па народным вызваленні Македоніі.

Хто на кані?

Аднак ужо ў чэрвені стала вядома, што Афіны і Скоп'е выключылі ўсе ранейшыя варыянты і спыніліся на новай назве — Рэспубліка Паўночная Македонія. І падзеі пачалі раскручвацца вельмі хутка. Парламент Македоніі за некалькі дзён адобрыў і ратыфікаваў дагавор аб змене назвы дзяржавы. Са свайго боку Георге Іваноў заявіў, што рашэнне заключыць з Грэцыяй дагавор аб назве краіны з'яўляецца асабістым рашэннем прэм'ера Зорана Заева і міністра замежных спраў Ніколы Дзімітрава. Таму ён лічыць дагавор недасканалым, што ён парушае Канстытуцыю.

Навошта Македонія змяняе назву?

Прэм'ер-міністр дэмарш прэзідэнта без увагі не пакінуў, заявіўшы, што Іваноў становіцца на шляху «еўрапейскіх перспектыў» Македоніі. Урад гатовы ісці на саступкі не толькі ў назве краіны, але і ў перайменаванні практычна ўсіх аб'ектаў, якія маюць умоўную прывязку да антычнай гісторыі. Самы яскравы прыклад у гэтым плане — перайменаванне статуі Аляксандра Македонскага, якая стаіць у цэнтры Скоп'я, у абстрактнага «Чалавека на кані». Відавочна, што ў Македоніі — маштабны палітычны крызіс. Прэзідэнт і прэм'ер-міністр вінавацяць адзін аднаго ў здрадзе нацыянальным інтарэсам краіны, ні адзін з бакоў канфлікту не жадае ісці на кампраміс, апелюючы да народа. Падобны сцэнарый добра вядомы: ён увесь час разыгрываецца то ў адной, то ў другой краіне свету.

Хто ж разыграе «македонскую карту»? Адназначнага адказу эксперты не даюць, аднак агучваюць варыянты. Перайменаванне Македоніі неабходнае перш за ўсё НАТА, таму што ўступіць у альянс можа толькі краіна, у якой няма ніякіх ворагаў, тэрытарыяльных прэтэнзій або канфліктаў. А ў дадзеным выпадку была істотная праблема ў адносінах з Грэцыяй. Такім чынам, перайменаванне — гэта выкананне патрабаванняў Паўночнаатлантычнага блока, растлумачыў РІА «Навіны» генеральны дырэктар Інстытута рэгіянальных праблем Дзмітрый Жураўлёў. «Грэчаская апазіцыя лічыць, што ўступленне Македоніі ў НАТА ўзмоцніць супярэчнасці паміж краінамі. Але, думаю, такая пазіцыя звязана не столькі з Македоніяй, колькі з імкненнем атакаваць палітычных праціўнікаў. Увогуле кажучы, міравое пагадненне ў сітуацыі шматвяковага «разводу» Грэцыі, Македоніі і Югаславіі малаімавернае, гэтая частка Балкан вылучаецца пастаяннымі канфліктамі», — лічыць вучоны.

У супярэчнасцяў паміж дзвюма краінамі даўняя гісторыя, і яны нашмат глыбейшыя і складанейшыя, чым проста назвы, якія супадаюць, заўважыў РІА «Навіны» прэзідэнт Цэнтра стратэгічных камунікацый Дзмітрый Абзалаў. «НАТА, чые апетыты ў апошні час прыкметна зрушыліся на ўсход Еўропы, вельмі зацікаўлена ў краінах былой Югаславіі. Іх уступленне ў альянс Брусель праціскае вельмі жорстка і паспешліва, не звяртаючы ніякай увагі на настрой і меркаванне насельніцтва», — кажа Дзмітрый Абзалаў.

Тое ж датычыцца і суседніх краін. «Большасць грамадзян Чарнагорыі не ў захапленні ад такога выхаду, у Македоніі зноў пачынаецца разлад, незразумела, чым усё павернецца ў Сербіі, у Босніі і Герцагавіне можа зноў успыхнуць пажар», — лічыць колішні дзяржаскратар па справах Косава і Метохіі Душан Праракавіч.

Кропку ў гэтым пытанні павінны паставіць самі македонцы на рэферэндуме, які мяркуецца правесці ўвосень. Між тым, як стала вядома, Бі-бі-сі ўжо апублікавала карту, дзе нанесена Паўночная Македонія. Не зарана?

Захар БУРАК

■

Логойский сельский исполнительный комитет проводит 24 июля 2018 года открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб.	Задаток (рублей)
1	д. Замосточье, ул. Центральная, 2Б, 623284602301000030	0,1276	электроснабжение	2 000.00	1529,53 + реклама	200.00
2	д. Знаменка, У-2, 623284603001000207	0,1063	газо- и водоснабжение	5 000.00	1656,99 + реклама	500.00
3	д. Понизовье, ул. Руднянская, 1, 623284604601000148	0,1400		3 000.00	1424,40 + реклама	300.00
4	д. Понизовье, ул. Руднянская, 3, 623284604601000149	0,1400		3 000.00	1413,95 + реклама	300.00

Земельный участок в д. Понизовье, ул. Руднянская, 1 имеет ограничения в использовании площадью 0,0112 га в связи с расположением в охранных зонах линии электропередачи, площадью 0,1400 га в связи с расположением в охранной зоне реки Гайна; в д. Понизовье, ул. Руднянская, 3 имеет ограничения в использовании площадью 0,0112 га в связи с расположением в охранных зонах линии электропередачи, площадью 0,1400 га в связи с расположением в охранной зоне реки Гайна.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на № BY25AKBB36006191011030000000, БИК AKBB BY 2X, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

Аукцион состоится 24 июля 2018 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. **Последний день приема заявлений 18 июля 2018 года до 17.00**. Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.
Продавец: Открытое акционерное общество «Орша-Сервис», 211391, Витебская обл., г. Орша, ул. Герцена, д. 4-А, (0216) 51-25-15

Лот №1. Капитальное строение с инв.№240/С-19761 площадью 115,2 кв. м, наименование – здание конторы базы, назначение – здание административно-хозяйственное, по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 230П. Капитальное строение с инв.№240/С-29416 площадью 52 кв. м, наименование – здание бытовки, назначение – здание неустановленного назначения по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 230П/1. Имущество расположено на зем. участке №242400000001004361 площадью 0,0814. **Начальная цена:** 11 550 руб. без НДС. **Задаток:** 1 155 руб.

Повторный аукцион состоится 10.07.2018 в 11.00 по адресу: г. Орша, ул. Герцена, д. 4-А, в ОАО «Орша-Сервис». Срок внесения задатков и приема документов: с 25.06.2018 с 8.30 по 09.07.2018 до 17.30

Лот №1. Капитальное строение с инв. №240/С-17088 площадью 902,8 кв. м, наименование – мелкооптовая база, назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание мелкооптовой базы по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. 1 Мая, 109. Капитальное строение с инв.№240/С-28848 площадью 2,5 кв. м, наименование – здание туалета, назначение – здание специализированное иного назначения по адресу: Витебская обл., Оршанский район, г. Орша, ул. 1 Мая, 109. Составные части и принадлежности: одноэтажное здание туалета с асфальтной площадкой, железобетонным ограждением, металлическими воротами. Имущество расположено на зем. участке №242400000001000512 площадью 0,4682. **Начальная цена:** 57 600 руб. без НДС. **Задаток:** 5 760 руб.

Повторный аукцион состоится 24.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Орша, ул. Герцена, д. 4-А, в ОАО «Орша-Сервис». Срок внесения задатков и приема документов: с 25.06.2018 с 8.30 по 23.08.2018 до 17.30

Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа — ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 21.10.2017, 28.11.2017, 04.01.2018, 24.02.2018, 06.04.2018. С полной информацией о порядке проведения торгов, оформления участия и определения победителя аукциона можно ознакомиться на сайте www.marketvit.by. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи»

№ Лота	Описание	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Лот №1	Посудомоечная машина AQUA 50 промышленная, инв. № КТ50000326	1 320,00	260,00
Лот №2	Пресс гидравлический П-63286, инв. № КТ00020257	5 400,00	810,00
Лот №3	Пресс листогибочный гидравлический, инв. № КТ50000224	8 880,00	1 100,00
Лот №4	Пресс листогибочный гидравлический ИП 1424, инв. № КТ50000254	8 880,00	1 100,00
Лот №5	Пресс листогибочный И 1020, инв. № КТ00021090	2 640,00	390,00
Лот №6	Пресс листогибочный И1020А, инв. № КТ50000258	3 840,00	570,00
Лот №7	Пресс листогибочный И1020А, инв. № КТ50000259	3 840,00	570,00
Лот №8	Пресс листогибочный И1330, инв. № КТ00020930	6 000,00	900,00
Лот №9	Пресс листогибочный с матрицей И1020А, инв. № КТ50000235.	3 840,00	570,00
Лот №10	Пресс ножницы НВ 5222Б, инв. № КТ00021067	4 320,00	640,00
Лот №11	Прилавок раздаточный SXEC 926x422x660, инв. № КТ50000330; Прилавок раздаточный SXED 1071x422x660, инв. № КТ50000328; Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850, инв. № КТ50000331; Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850, инв. № КТ50000332; Транспортная дорожка для подносов SXDR 4770x307x30, инв. № КТ50000333; Шпилька КШ-3 (для столовых подносов), инв. № КТ50000334; Шпилька КШ-3 (для столовых подносов), инв. № КТ50000335	2 928,00	430,00
Лот №12	Пылеулавливающий агрегат УВП-2000А, инв. № КТ50000180; Станок вертик-фрезер 65А80МФ4, инв. № КТ00021260	32 688,00	3 200,00
Лот №13	Полуавтомат для дуговой сварки ПДГ-251 У3.1, инв. № КТ50000221; Установка зачистная Rotofera F DIN10 110020, инв. № КТ50000359	1 272,00	250,00
Лот №14	Распред. устройство, инв. № КТ920853	1 320,00	260,00
Лот №15	Станок FINN-POWER, инв. № КТ50000339; Цифровой осциллограф RIGOL DS1052E, инв. № КТ01520102	279 936,00	27 900,00
Лот №16	Станок вертик.-сверлил. 2С132, инв. № КТ00020941	1 680,00	330,00
Лот №17	Станок вертик.-сверлил. 2н135, инв. № КТ00020885	1 320,00	260,00
Лот №18	Станок вертик.-сверлил. 2С132, инв. № КТ00020401	1 680,00	330,00
Лот №19	Станок внутришлифовальный 3к-2281А, инв. № КТ00020133	10 080,00	1 300,00
Лот №20	Станок консольно-фрезерный 6т12-1, инв. № КТ00020541	3 240,00	480,00
Лот №21	Станок консольно-фрезерный 6т82-Г, инв. № КТ00020176	2 880,00	430,00
Лот №22	Станок консольно-фрезерный 6т-12, инв. № КТ00020559	3 240,00	480,00
Лот №23	Станок копировально-фрезерный 6Г463, инв. № КТ00020605	1 680,00	330,00
Лот №24	Станок корд-расточной 2Е-450АФ1, инв. № КТ00020265	10 200,00	1 300,00
Лот №25	Станок лазерной резки LaserCUT-4015-3-1.5-S-RT (в компл), инв. № КТ50000343	229 200,00	22 900,00
Лот №26	Станок ленточнопильный мод. ARG 240 Plus, инв. № КТ49305	2 760,00	410,00
Лот №27	Станок плоскошлифов. ош-424Ф1-1, инв. № КТ00020702	4 800,00	720,00
Лот №28	Станок прод. фрез. 6М612МФ4, инв. № КТ00020826	199 200,00	19 900,00
Лот №29	Станок профильно-шлиф. ОШ224Н2, инв. № КТ00020310	3 720,00	550,00
Лот №30	Станок радиально-сверлильн. 2А554, инв. № КТ00020923; Вентилятор Л дв. 5,5-1,5-1500, инв. № КТ50000178	4 368,00	650,00
Лот №31	Станок расточной модели 2206ВМФ без ЧПУ и электроприводов (мехбаза к станку инв. № 20966)), инв. № КТ1520344; Станок свер-фр-раст с ЧПУ 2206ВМФ4 без мехбазы (м/б №1520344), инв. № КТ00020966	15 120,00	1 500,00
Лот №32	Станок токарно-винторезный мод. 1М63Н3, инв. № КТ5114	13 080,00	1 300,00

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку, должен произвести оплату Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 25.07.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона — 5%.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи», проводимом 25 июля 2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 23.07.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33

Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57,8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

■ Фан-парад

СУСВЕТНАЯ ВЕЧАРЫНКА!

Прайшло амаль паўтара тыдня з пачатку чэмпіянату свету па футболе ў Расіі, і вось ужо атмасфера, якая акружае турнір, распаліла нават самыя чэрствыя і чапурыстыя сэрцы. Свае ўражанні і захапленні ў адрас Расіі выказваюць госці чэмпіянату з усіх канцоў свету, іх сабраў championat.com.

Дзве любові

Карэспандэнт сінгапурскага выдання Дэвід Лі расказаў, што яго падарожжа ў Расію пачалося з наведвання знакамітай Краснай плошчы, дзе ён у першыя гадзіны сустрэў столькі дзіўных людзей, колькі наўрад ці сустрэў за ўсё жыццё. Адным з такіх унікумаў стаў аргенцінскі балельшчык Маці Амая. «Яму 33 гады, але выглядае ён гадоў на 10 старэйшым з яго густой барадой. Ён падарожнічае апошнія шэсць чэмпіянатаў і наведаў 37 краін, пакуль не даехаў да Расіі. І ўсё гэта на веласіпедзе! У яго дзве любові — футбол і веласіпеды. Ён пайшоў з дому 5 красавіка 2012 года і вырашыў згубіцца ў гэтым свеце».

Футбол злучае свет

Выданне Business Insider дзівіцца маштабамі, якія нясе ў сабе чэмпіянат свету па футболе, адзначаючы, што мундзіяль выконвае ролю міратворца, аб'ядноўваючы нацыі. «Кожныя чатыры гады свет злучаецца ў адно цэлае дзеля фестывалю футбола, які прымушае нас на нейкі час забыць пра ўсе праблемы на свеце. Хоць бы на працягу некалькіх тыдняў мы разумеем, што ўсе мы — проста людзі. Чэмпіянат свету ў Расіі — самае лепшае таму пацвярджэнне. Мы бачым гэта ў пабах, на вуліцах, на матчах і на фестывалях балельшчыкаў. Гэта глабальная вечарынка!»

Рускія бегаюць

The Times канцэнтруецца непасрэдна на гульні: «Рускія бегаюць больш і хутчэй». Аўтар дастае статыстычныя выкладкі і рэзюмуе: «Гульцы зборнай Расіі прабягаюць больш за ўсіх на гэтым чэмпіянаце свету — і іх часцей за ўсіх тэсціравалі на допінг, чым каго-небудзь яшчэ на турніры. Таксама яны развіваюць найбольш высокія хуткасці». Выданне паважліва заключае, што дзве перамогі, восем забітых мячоў і ўсяго адзін прапушчаны — гэта самы лепшы старт для краіны — гаспадыні чэмпіянату свету.

Бразільская дружба

Наступную дзіўную гісторыю расказала канадскае выданне Vancouver Courier. «Бразілец Радольфа Мота планаваў паездку ў Расію чатыры гады. Ён і трое яго сяброў наведалі мундзіяль у Бразіліі і дамовіліся паўтарыць гэтую справу праз чатыры гады. Лёс раскідаў хлопцаў па розных краінах. Радольфа жыве ў Ванкуверы, другі сябар у Санкт-Пецярбургу, трэці ў Партугаліі, а чацвёрты застаўся ў Бразіліі. Ва ўсіх свае справы, праца і вучоба. Але яны прыехалі ў Расію ўсе разам, таму што абяцалі адзін аднаму».

Шведы выпілі ўсё піва

Шведам удалося пачаць чэмпіянат свету з перамогі. Для сямі тысяч скандынаваў, якія прыехалі ў Ніжні Ноўгарад на матч, гэта было выдатнай падставай для святкаванняў. Шведскае выданне The Local растлумачыла адзін цікавы нюанс. «Шведскія балельшчыкі проста выпілі ўсё піва ў Ніжнім Ноўгарадзе. Але фішка ў тым, што яны выпілі ўсё піва яшчэ да пачатку гульні. У горадзе ніколі не праводзілі мерапрыемстваў падобнага маштабу, так што шведскія фанаты заспелі мясцовыя пабы знянацку».

Давайце тусавацца!

Reuters расказаў, як чарговы раз былі разбураны стэрэатыпы пра змрочную і недружалюбную Расію, дзе вельмі небяспечна хадзіць па вуліцах. «Давайце тусавацца!» — такімі словамі сустракаюць замежных гасцей мясцовыя жыхары. Не ўсе гарады, якія прымаюць матчы чэмпіянату свету ў Расіі, распешчаны ўвагай турыстаў. Але гэта не перашкаджае ім ствараць неверагодную атмасферу свята. «Мая жонка была супраць паездкі ў Расію, ды і на рабоце мне казалі, што гэта не самая лепшая ідэя. Але ўсё было вельмі і вельмі крута», — прызнаўся балельшчык з Шатландыі, які прыехаў на турнір з 10-гадовым сынам.

ХОЦЬ КАРДОНКАЙ, АЛЕ ПАЕДУ!

Жонка не пусціла мексіканца на чэмпіянат свету, але сябры ўзялі з сабой яго кардонную копію

З Хаўерам з Мексікі здарылася пацешная, але не самая прыемная гісторыя. Ён не даехаў у Расію на галоўны сусветны турнір, бо... не пусціла жонка. Так што пакуль яго сябры на ўсю моц весяляцца ў Расіі, п'юць тэкілу на Манежнай плошчы і разносяць Нікольскую, ён сядзіць дома і глядзіць матчы па тэлевізары.

На чэмпіянаце свету ў 2014 годзе ў Бразіліі Хаўер і яго сябры так добра правялі час, што вырашылі: у Расію паедуць гэтай жа кампаніяй. У той жа год яны пачалі збіраць грошы на білеты і аўтобус, які змог бы задаволіць усе іх патрэбы. Яны збіраліся размаляваць яго ў нацыянальныя колеры і скарыць на ім Еўропу. Усё ішло добра, пакуль Хаўеру не прыйшлося абвясціць сябрам, што ён нікуды не едзе.

Але яго сябры ад паездкі адмаўляцца не збіраліся. Больш за тое, яны ўзялі з сабой і Хаўера. Ну, не тое каб зусім яго — а кардонную копію. Яны фатаграфуюць яго ўсюды, дзе бываюць: у фан-зоне, на матчы, на вуліцах Масквы і нават у бары сярод дзяўчат. На двайніку Хаўера красуецца футболка, якая не можа не выклікаць усмешку: «Мая жонка не пусціла мяне на чэмпіянат свету».

Сябры нават стварылі суполку ў сацсетках, у якой выкладваюць усе фатаграфіі і відэа, а таксама дзеляцца расказамі пра сваё незабыўнае падарожжа па Расіі. А аўтобус з сабой мужчыны ўсё ж узялі. У пачатку красавіка яны размалявалі транспарт, сабралі неабходныя рэчы і рушылі ў дарогу, а 26 мая ўжо прыплылі ў Германію. «Мы хочам зладзіць найлепшую вечарыну!» — абвясшчае адзін са шматлікіх запісаў у іх суполцы ў «Фэйсбуку». У Маскву мексіканцы прыехалі 13 чэрвеня. З таго часу яны ўжо шмат дзе пабывалі, але, варта аддаць ім належнае, ніколі не забывалі пра свайго сябра.

Вось, напрыклад, Хаўер на фестывалі заўзятараў (фота ўверсе). На Нікольскай Хаўер таксама пабываў (фота злева). І нават з рускімі дзяўчатамі паабдымаўся (фота справа).

Бедны Хаўер, як ён там, на канапе?

Не ўсё радасна

Паўабаронца зборнай Калумбіі Карлас Санчэс атрымаў сотні смяротных пагроз у сацыяльных сетках ад балельшчыкаў нацыянальнай каманды пасля матча з камандай Японіі (1:2). Калумбійскія паліцэйскія пачалі расследаванне па факце пагроз на адрас футбаліста, паведамляе The Guardian. Выданне адзначае, што адзін з карыстальнікаў апублікаваў у «Твітэры» фатаграфію Санчэса побач са здымкам былога гульца зборнай Калумбіі Андрэса Эскабара, якога застрэлілі з-за аўтагола ў матчы чэмпіянату свету ў 1994 годзе, са словамі: «Я прапаную памарыць». Іншы карыстальнік напісаў у адказ на

Працоўныя канікулы

Акіму ЛЯЎКОВІЧУ — дзесяць гадоў. Баранавіцкі школьнік, удзельнік алімпіяд, у тым ліку і гарадской па матэматыцы, у наступным навучальным годзе пойдзе ў гімназію. А цяпер Акім праводзіць лета ў вёсцы, дапамагае бацькам на агародзе, пасе коз і авечак, даглядае трусоў і качак. І нават упраўляецца на пчальніку.

У Ляўковічаў трое дзяцей, Акім — малодшы. Сялянскай працы не цураецца, на просьбы старэйшых з задавальненнем адгукаецца.

Чаму я выбраў героем фотаапавядання менавіта Акіма, запытаеце? У выбары персанажа — абсалютная выпадковасць. Чэрвенскім ранкам я спыніўся на ўскрайку вёскі Мелехавічы, каб здымаць панараму Навагрудскага ўзвышша. Перада мною адкрывалася маляўнічая прастора, на першым плане яе пасвіўся невялікі статак. Пастушок з цікавасцю назіраў за маімі дзеяннямі. Неўзабаве хлопчык стаў збіраць сваіх падапечных і гнаць у бок вёскі. На палявой сцежцы мы і пазнаёміліся, разгаварыліся, і я даведаўся пра сялянскую гаспадарку Ляўковічаў.

Пяць гадоў таму былы работнік беларускай чыгункі Юрый Ляўковіч і яго жонка Вікторыя аблюбавалі тутэйшыя мясціны, набылі драўляны дом і афармілі зямлю. Гэта, дарэчы, недалёка ад хутара Завоссе, на якім нарадзіўся класік, наш зямляк Адам Міцкевіч, цяпер там — мемарыяльны музей паэта. Спачатку новыя гаспадары-гараджане паставілі невялікія цяпліцы — пад таматы і агуркі, завялі пчол, потым набылі трактар для апрацоўкі глебы, праз год пасадзілі малады сад. Вясковы падворак год ад году мацнеў, з'явілася трусіная ферма, чароды качак, курэй. Вядома, у вялікай гаспадарцы кожная пара рук будзе дарэчы, таму знаходзілася праца і для малодшага сына.

Цяпер Акім сам шукае працу. Бацька адвёў яму частку вуллёў, дапамог набыць пчалярскае аддзенне, маўляў, вось табе карты ў рукі, спраўляйся. Трэба дапамога на прапольцы альбо сабраць спелыя клубніцы — першы агародны ўраджай, — Акім заўсёды на падхопе, ведае, як трымаць і матыку, і касу... Маці вельмі задаволена.

— Мы не прымушаем, а прывучаем дзяцей, каб выраслі сапраўднымі гаспадарамі, — такая метадалогія выхавання ў старэйшых Ляўковічаў.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Баранавіцкі раён.

■ Брэнд краіны

ДРУКАРСКІ ВАРШТАТ У ВІЛЕЙЦЫ

Па Скарынавых слядах

У творчай майстэрні Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА ў Вілейцы першы паверх будынка (там, дарэчы, калісьці была друкарня) займае выстава друкарскага абсталявання XIX—XX стагоддзяў. Арыгінальныя станкі, што збіраліся па ўсім свеце, сабраны разам і ўяўляюць сабой уражальную калекцыю. Тут жа знаходзіцца і той самы рэканструяваны станок XVI стагоддзя — аналагічны таму, на якім Скарына ў свой час друкаваў кнігі Бібліі.

Ёсць тут зала друкаванай прэсы. Аднак асаблівую цікавасць, безумоўна, выклікае ў экспазіцыі друкарскі варштат.

— Станкі збіраліся па ўсім свеце. Штосьці было ў добрым стане, іншае даводзілася рэстаўраваць, — кажа Уладзімір Ліхадзедаў. — Наш праект называецца «У пошуках страчанага», таму мы сапраўды шукалі ўсё тое, што страчана... Прадстаўлены станок, зроблены на ўзор таго, якім Францыск Скарына друкаваў Біблію ў XVI стагоддзі. Зараз і іншыя спрабуюць зрабіць копіі такога станка — аднак яны не вытрымліваюць рэгулярнага друку, а па многіх дэталях не вельмі падобныя да арыгіналу. У свеце няма ніводнага арыгінальнага драўлянага станка XVI стагоддзя, які б захаваўся.

Стварыць яго ў межах праекта дапамагаў **Генадзь КАТЛІНСКІ**. Па адукацыі ён інжынер-робататэхнік. Аднак цяпер працуе дызайнерам, вырабляе з дрэва прадметы мэблі.

— Дакументаў, з якіх можна было б зразумець, як вырабіць такі станок, амаль не захавалася. Таму давялося рабіць яго па прынцыпе дзеяння, па адчуваннях, — кажа Генадзь Катлінскі. — У некаторых музеях захоўваюцца адноўленыя станкі, на якіх можна друкаваць. Нашай задачай было зрабіць такі ж, але разборны, каб станок можна было перавозіць з месца на месца, — вось разборных, шчыра кажучы, я раней ніколі не бачыў. Да таго ж мы імкнуліся, каб гэта быў сапраўды рабочы станок — не тое, што хтосьці раз на год надрукуе старонку, — а каб на ім можна было друкаваць пастаянна, як і раней. У прынцыпе ў нас гэта атрымалася.

Копія скарынаўскага станка, на якім любы ахвотны можа сваімі рукамі надрукаваць старонку Бібліі, — не адзіная цікавінка экспазіцыі. Пра тое, што яшчэ можна ўбачыць у вілейскай творчай майстэрні, расказвае Уладзімір Ліхадзедаў:

— Усе металічныя станкі, прадстаўленыя ў экспазіцыі, — цалкам арыгінальныя. Ёсць, напрыклад, прэс, які можна выкарыстоўваць для выціскання паперы і для пераплётаў. Ёсць унікальная тыгельная машына XIX стагоддзя. Маецца ленатып, вынайдзены ў канцы XIX стагоддзя. Той, што прадстаўлены на экспазіцыі, выпушчаны ў 1972 годзе, — але з часу ўзнікнення такой машыны ў ім амаль не было змен. У станку маюцца невялічкія свінцовыя нарыхтоўкі, калі яны апускаюцца, свінец пачынае плавіцца, набіраецца тэкст у радок, з дапамогай матрыцы яны адціскаюцца і атрымліваецца радок (такая машына называецца радкаадліўнай). Радкі адсякаюцца так, як трэба, яны складваюцца разам у патрэбнай паслядоўнасці і далей друкуецца газета ці што заўгодна. З ленатыпам, прадстаўленым тут, працавалі яшчэ ў друкарні, якая раней размяшчалася ў гэтым будынку.

Сярод іншых цікавых экспанатаў — італьянская машынка для друку візітовак. Побач — цацачная тыгельная машынка пачатку XX стагоддзя. Аднак нягледзячы на тое, што яна прызначалася для дзяцей, на ёй таксама можна друкаваць візітоўкі.

Спецыяльна з Германіі быў прывезены станок, якому амаль 150 гадоў. Ён у ідэальным стане, нягледзячы на даволі сур'ёзны ўзрост. Таксама можна ўбачыць некалькі афортных станкоў.

На першым паверсе музея прадстаўлены і ўсе тыя кнігі, якія былі выпушчаны Ліхадзедавым у межах праекта «У пошуках страчанага». Сярод іх: выданні пра Тадэвуша Касцюшку, Адама Міцкевіча, узноўленая з дапамогай станка кніга «Быццё». Ліхадзедаў адзначае, што ў яго самая ўнікальная ў свеце калекцыя паштовак, прысвечаная Беларусі. Менавіта паштоўкі, апісанне іх гісторый і выяўленых там сюжэтаў стаялі асновай многіх кніг. Дарэчы, кнігу пра Тадэвуша Касцюшку аўтар у свой час прэзентаваў у бібліятэцы Кангрэса ЗША.

Наведваючы гэту экспазіцыю, можна не толькі вырабіць старонку першай беларускай друкаванай кнігі. Маюцца тут прылады і для друку афорта. Зазвычай з імі працуе і дапамагае наведвальнікам атрымаць уласны маленькі твор мастак Барыс Цітовіч, ён адзначае:

— Афорты выконваюцца ў розных тэхніках. Мы ж цяпер друкуем з дапамогай таго, што зроблены траўленым штрыхом. Малюнак «У пошуках страчанага» выраблены мной пяць гадоў таму. Лічба 10 на ім — столькі ў той час было праекту. Сава — гэта сімвал мудрасці. Сам Ліхадзедаў з Полацка, таму побач выяўлены Сафійскі сабор. Натуральна, арыгінал зроблены ў люстраной выяве, каб адбітак з яе быў правільны. Гэта тэхніка цікавая сваёй рукатворнасцю: спачатку я рабіў эскіз алоўкам. Потым пакрываў спецыяльную пласціну кіслотаўстойлівым лакам. На яго з дапамогай штрыхоў нанёс малюнак. Атрымліваецца, там, дзе лак прадрапаны, бачныя абрысы малюнка, там, дзе ён не кануты, застаецца чыстая колеравая пласціна. Такім чынам, мы пакрываем малюнак фарбай, кладзём яго на паперу, і з дапамогай спецыяльнай машыны робім адбітак.

Мастак адзначае, што рукатворнай працы ў наш час робіцца ўсё меней. Можа, таму і цікавыя такія экспазіцыі. Яны нагадваюць нам, як шмат чалавек можа зрабіць сваімі рукамі. Не выпадкова Скарына ў XVI стагоддзі надрукаваў менавіта Біблію. Гэта тая кніга, якая таксама нагадвае нам, што кожны чалавек — творца. Так часта забываемся мы пра гэта ў тлуме жыцця. Падаецца, самы час успомніць!..

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Вілейскі раён.

Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

1758 год — мястэчка Ушачы атрымала магдэбургскае права і герб.

1908 год — нарадзіўся Іосіф Нядзвецкі (горад Магілёў), Герой Савецкага Саюза. Удзельнічаў у палярных экспедыцыях, служыў машыністам на ледаколах «Ярмак», «Георгій Сядоў». На працягу 812 сутак дрэйфаваў у льдах Паўночнага Ледавітага акіяна. Перанёс разам з іншымі членамі экіпажа ўсе цяжкасці і выпрабаванні, праявіў мужнасць і майстэрства. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. З 1946 года працаваў у Запаляр'і. Быў начальнікам палярнай станцыі на мысе Арктычнае. Загінуў на палярнай станцыі ў 1959 годзе.

1933 год — нарадзіўся Ігар Фралоў (горад Быхаў), заслужаны архітэктар Беларусі. Працаваў у інстытуце «Магілёўгрmaмадзянпраект» (у 1973—1998 гадах — галоўны архітэктар), адначасова ў розныя гады выкладаў у Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце і будаўнічым каледжы. Асноўныя работы ў Магілёве: мікрараёны Магілёў-2, Юбілейны, жылы раён па Мінскай шашы, забудова праспектаў Пушкіна і Міру. Аўтар навучальных дапаможнікаў для праекціроўшчыкаў.

У свеце

1868 год — Крыстафер Лэтэм Шоўлз з Вісконсіна запатэнтаваў пішучую машынку. Яна была памерам з вялікі стол, друкавала толькі вялікімі літарамі, прычым машыністка не бачыла выніку сваёй працы, паколькі папера знаходзілася ўнутры машынкі.

1888 год — лільскі хор рабочых упершыню выканаў міжнародны пралетарскі гімн «Інтэрнацыянал» (музыка П'ера Дэгейтэра на словы Эжэна Пацье).

1903 год — нарадзіўся дацкі пісьменнік, драматург, перакладчык Ханс Крысціян Бранер. Аўтар раманаў «Ніхто не ведае ночы», «Цацкі», «Наезнік», п'ес «Браты і сёстры», «Фермапілы».

1928 год — шведскі пілот Эйнар Лундборг вывез з крыгі італьянскага генерала Умберта Нобіле, кіраўніка экспедыцыі да Паўночнага полюса Зямлі на дырыжаблі «Італія». Паспяхова дасягнуўшы мэты падарожжа, на зваротным шляху дырыжабль пацярпеў крушэнне. Пілот мог забраць толькі аднаго чалавека і не пагадзіўся ўзяць на борт нікога, акрамя Нобіле, прыхапіўшы з сабой сабаку. Астатнія члены экспедыцыі, якія выжылі, былі выратаваны савецкім ледаколам «Красін». Учынак Нобіле, які пакінуў каманду, выклікаў неадназначную рэакцыю грамадскасці.

1983 год — каля берагоў Камчаткі затанула атамная падводная лодка К-429. Загінулі 16 чалавек. Астатнія члены экіпажа на працягу трох сутак выйшлі на паверхню праз тарпедныя апараты.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.38	21.46	17.08
Віцебск	4.19	21.44	17.25
Магілёў	4.28	21.36	17.08
Гомель	4.34	21.23	16.49
Гродна	4.55	21.59	17.04
Брэст	5.05	21.50	16.45

Месяц

Першая квадра 20 чэрвеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Антаніны, Аляксандра, Васіля, Івана, Мікалая, Паўла, Феафана, Цімафея.*
К. *Агрыпіны, Ванды, Альбіны, Базыля, Зянона, Пятра, Юзафа.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Усведамленне таго, што не дарма вучыўся ў аўташколе, прыходзіць тады, калі ў краме ты саступаеш дарогу калясцы, якая коціцца справа.

— Мадэмуазэль, можна вашу ручку? Якая вытанчаная... Дастанеш дзядзьку агурочак?

Мужчыны хочуць сексу кожны дзень.

Пакуль не сустрэнуць жанчыну, якая хоча сексу кожны дзень.

— Якая ў вас дзіўная карціна. Называецца — «Кот у ботах». Боты бачу, а дзе ж кот?

— У ботах!

carlcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэсрублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2253.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 чэрвеня 2018 года.